# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ



10

ЧАСТКА І

## Станаўленне Рымскай імперыі (да пачатку II ст. н. э.)



# Усходняя і Цэнтральная Еўропа ва ўмовах міграцый і нашэсцяў I—VII стст.



# Еўропа ў пачатку XIII ст.



# Беларускія землі ў першай палове XIII ст.



# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## ў кантэксце сусветнай гісторыі

Вучэбны дапаможнік для **10** класа
ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай мовай навучання і выхавання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук
прафесара А. Г. Каханоўскага

У дзвюх частках
Частка 1

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2024

Правообладатель Издательский центр БГУ

УДК 94(476)(075.3)
ББК 63.3(4Беи)я72-1
К30

Аўтары:

*А. Г. Каханоўскі, У. С. Кошалеў, С. М. Цемушаў, С. А. Чарапко, В. А. Белазаровіч, М. І. Мацюшэўская, Я. Р. Рыер, С. М. Ходзін*

Аўтары метадычнага забеспячэння:

*І. П. Бернат, Д. А. Субоціна, Т. М. Сурконт*

Навуковы кансультант:

доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі *І. А. Марзалюк*

Пераклад на беларускую мову *В. М. Іванова*

Рэцэнзенты:

Вучоны савет дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»; настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 3 г. Брэста імя В. М. Верамяюк» *В. В. Куц*; намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, доктар гістарычных навук, дацэнт *В. В. Даніловіч*; настаўнік гісторыі кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Ленінская сярэдняя школа Бабруйскага раёна» *С. М. Герасімовіч*

**Каханоўскі, А. Г.**

К30 Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. — 223 с. : іл.

**ISBN 978-985-553-812-8.**

**УДК 94(476)(075.3)**
**ББК 63.3(4Беи)я72-1**

**ISBN 978-985-553-812-8 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-553-813-5**

© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2024

# Змест

Як працаваць з вучэбным дапаможнікам . . . . . 4
Уводзіны . . . . . 6

Раздзел I. **СТАНАЎЛЕННЕ СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. БЕЛАРУСЬ У ДАДЗЯРЖАЎНЫ ПЕРЫЯД** . . . . . 18

§ 1. Паходжанне чалавека. Прырода і людзі . . . . . 18
§ 2–3. Эвалюцыя грамадства і эканомікі ў старажытнасці . . . . . 27
§ 4. Найстаражытнейшыя вераванні і мастацтва . . . . . 41
§ 5–6. Асаблівасці найстаражытнейшых цывілізацый . . . . . 51
Практыкум па раздзеле «Станаўленне найстаражытнейшых цывілізацый. Беларусь у дадзяржаўны перыяд» . . . . . 66
Абагульненне па раздзеле «Станаўленне найстаражытнейшых цывілізацый. Беларусь у дадзяржаўны перыяд» . . . . . 72
Наш край у старажытнасці . . . . . 78

Раздзел II. **СВЕТ У ЭПОХУ РАННЯГА І ВЫСОКАГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА. ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ** . . . . . 82

§ 7. Дзяржавы Ранняга і Высокага сярэднявечча на Захадзе . . . . . 82
§ 8. Еўрапейскае грамадства ў Раннім і Высокім сярэднявеччы . . . . . 92
§ 9. Палітычнае і сацыяльнае развіццё дзяржаў Азіі ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча . . . . . 103
§ 10. Рэлігіі ў жыцці сярэдневяковых грамадстваў . . . . . 114
§ 11. Развіццё культуры ў Раннім і Высокім сярэднявеччы . . . . . 123
§ 12. Вялікая славянская міграцыя і Беларусь . . . . . 134
§ 13. Старажытная Русь — дзяржава ўсходніх славян . . . . . 143
§ 14–15. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі . . . . . 154
§ 16. Барацьба супраць знешніх заваёўнікаў . . . . . 167
§ 17. Грамадства і эканоміка беларускіх земель у IX–XIII стст. . . . . . 177
§ 18. Пашырэнне хрысціянства на тэрыторыі Беларусі . . . . . 186
§ 19. Культура Беларусі ў IX–XIII стст. . . . . . 197
Практыкум па раздзеле «Свет у эпоху Ранняга і Высокага сярэднявечча. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі» . . . . . 206
Абагульненне па раздзеле «Свет у эпоху Ранняга і Высокага сярэднявечча. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі» . . . . . 213
Наш край у Раннім і Высокім сярэднявеччы . . . . . 218

**Паказальнік тэрмінаў і паняццяў** . . . . . 219
**Храналагічная табліца па гісторыі Беларусі** . . . . . 220
**Памяткі** . . . . . 222

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Як працаваць з вучэбным дапаможнікам

Шаноўныя дзесяцікласнікі! Вы пачынаеце вывучэнне новага вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі». Вам належыць, абапіраючыся на веды і ўменні, засвоеныя на ўроках гісторыі ў 5–9 класах, вывучыць асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа, выявіць асаблівасці развіцця грамадства і дзяржавы на тэрыторыі Беларусі ў параўнанні з сусветным гістарычным працэсам. У 10-м класе аб'ектам вывучэння стане гісторыя Беларусі з найстаражытнейшых часоў да канца XVIII ст.

Вучэбны дапаможнік складаецца з дзвюх частак і прызначаны для вывучэння вучэбнага прадмета на базавым узроўні. Матэрыялы для вывучэння вучэбнага прадмета на павышаным узроўні змешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (http://www.profil.adu.by).

У вучэбным дапаможніку прадстаўлены не толькі тэксты параграфаў, але і фрагменты гістарычных дакументаў, картасхемы, табліцы, інфаграфіка, ілюстрацыі. Каляровыя выдзяленні раздзелаў дапамогуць арыентавацца ў гістарычным матэрыяле, які вы вывучаеце. Кожны раздзел пачынаецца са стужкі часу, на якой у храналагічнай паслядоўнасці адзначаны даты найважнейшых падзей з гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі, паказаны асноўныя працэсы, характэрныя для пэўнага гістарычнага перыяду. Работа са стужкай часу дапаможа вам успомніць і сістэматызаваць вучэбны матэрыял, вывучаны ў 5–7 класах.

«Воблака слоў», з якога пачынаецца кожны параграф, — гэта тыя паняцці, імёны гістарычных асоб, якія вывучаліся вамі ў 5–7 класах і павінны стаць асновай для далейшага прасоўвання ў пазнанні гісторыі.

Абавязковыя для запамінання даты, гістарычныя паняцці вылучаны ў тэксце **тлустым шрыфтам**. Падчас вывучэння новага матэрыялу варта звяртаць увагу на інфармацыю, вылучаную *курсівам*. Яна важная для разумення працэсаў, якія вывучаюцца.

Тэзісы, вынесеныя на палі вучэбнага дапаможніка, дапамогуць вам разабрацца ў ключавых ідэях тэксту, палегчаць пошук неабходнай інфармацыі ў параграфе.

Да тэкстаў параграфаў, табліц, схем, ілюстрацый, картасхем прапанаваныя пытанні і заданні. Яны накіраваныя на аналіз інфармацыі, якая вывучаецца, устанаўленне сувязей з раней вывучаным матэрыялам, у тым ліку на ўроках па іншых вучэбных прадметах. Адказы на гэтыя пытанні і заданні дазволяць вам сфарміраваць цэласную карціну гістарычнага мінулага.

Заданні з рубрык «Працуем з гістарычнай крыніцай», «Праводзім міні-даследаванне», «Гісторыя і сучаснасць» дазволяць пранікнуць углыб асобных

гістарычных падзей, з'яў і працэсаў, разабрацца ў дэталях гістарычнай карціны свету, убачыць сувязь гістарычных падзей, якія вывучаюцца, з сучаснай рэчаіснасцю. Выконваць заданні з гэтых рубрык можна як індывідуальна, так і ў групах, з выкарыстаннем дадатковых крыніц інфармацыі.

Ключавыя ідэі кожнага параграфа сфармуляваны ў вывадзе да яго. Для замацавання засвоеных ведаў і ўменняў раім канкрэтызаваць гэтыя ідэі вывучанымі гістарычнымі фактамі.

Для самакантролю і замацавання зместу вучэбнага матэрыялу ў канцы кожнага параграфа прапанаваны рознаўзроўневыя пытанні і заданні.

Сінхранізаваць падзеі сусветнай і айчыннай гісторыі дапаможа табліца «Калі ў свеце... На тэрыторыі Беларусі...». На яе падставе можна рабіць высновы аб асаблівасцях развіцця беларускіх зямель.

У канцы кожнага раздзела змешчаны практыкумы. Выконваючы прапанаваныя ў іх заданні, вы будзеце вучыцца: выяўляць заканамернасці і выпадковасці, адрозніваць факт ад меркавання, ажыццяўляць пошук інфармацыі, аддзяляць галоўнае ад другаснага, вызначаць ролю асобы ў гісторыі.

Заданні з рубрыкі «Абагульненне па раздзеле» дазволяць вам паўтарыць вывучаны матэрыял, абагульніць яго, сістэматызаваць, падрыхтавацца да кантролю ведаў і ўменняў па вывучанай тэме. Заданні з гэтай рубрыкі, абавязковыя для выканання, вызначае настаўнік.

На ўроках па тэме «Наш край» вы зможаце пашырыць і паглыбіць веды пра родны край, зразумець, як гісторыя вашага рэгіёна была звязана з падзеямі, з'явамі і працэсамі айчыннай і сусветнай гісторыі. Раім выкарыстоўваць на гэтых уроках гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць», матэрыялы краязнаўчых і школьных музеяў, публікацыі ў мясцовым перыядычным друку.

У канцы вучэбнага дапаможніка прыведзены: храналагічная табліца, паказальнік тэрмінаў і паняццяў, памяткі па рабоце з гістарычнай інфармацыяй.

Спадзяёмся, што вучэбны дапаможнік зробіць вывучэнне новага вучэбнага прадмета цікавым і творчым. Няхай знаёмства з айчыннай гісторыяй стане для вас крыніцай маральнай сілы, стойкасці і вернасці тым ідэалам, якія былі створаны нашымі продкамі і прайшлі выпрабаванне часам.

*Аўтары*

Правообладатель Издательский центр БГУ

# Уводзіны

СУЧАСНАСЦЬ
НОВЫ ЧАС МІНУЛАЕ
СТАРАЖЫТНЫ СВЕТ
НАЙНОЎШЫ ЧАС БУДУЧЫНЯ
ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА
СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Навука аб жыцці людзей у мінулым

**1. Гісторыя як навука.** Гісторыя — гэта паслядоўнае развіццё і змяненне чалавечага грамадства, а таксама веды пра гэтае развіццё; навука аб жыцці людзей у мінулым.

Разуменне мінулага вырашальным чынам уплывае на сучаснасць. Абвастрэнне тых ці іншых праблем вымушае чалавецтва зноў і зноў звяртацца да пройдзенага шляху, выяўляючы непарыўнае адзінства мінулага і сучаснасці.

У XX ст. людзі сутыкнуліся з глабальнымі праблемамі, ад вырашэння якіх залежыць лёс усяго чалавецтва. Упершыню за многія тысячагоддзі паўстала пагроза самазнішчэння. Як грамадства апынулася ў такім стане? Як чалавеку выжыць і захаваць жыццё на зямлі? Сутыкаючыся з падобнай праблемай, людзі адчуваюць вострую патрэбу разабрацца ў сваім мінулым. У гэтым ім дапамагае перш за ўсё гістарычная навука.

Узрост гістарычнай навукі

Вылучэнне гісторыі ў асобную галіну ведаў адбылося ў Старажытнай Грэцыі ў VI–V стст. да н. э., калі ўпершыню быў ужыты і сам тэрмін «гісторыя». Аўтарам першага вялікага твора па гісторыі ў еўрапейскай літаратуры з’яўляецца старажытнагрэчаскі гісторык Герадот. Паводле трапнага выразу Цыцэрона, ён вядомы як «айцец гісторыі». Першую «Усеагульную

## КЛІА — СТАРАЖЫТНАГРЭЧАСКАЯ МУЗА ГІСТОРЫІ



Вергілій, які піша «Энеіду», натхнёны музамі Кліа і Мельпаменай. Туніс. III ст.

*Муза Кліа. Імператарская віла пад Рымам. II ст.*





*Праўда, час і гісторыя. Мастак Ф. Гоя. XVIII ст.*



*Кліа. Мастак П. Міньяр. XVII ст.*

*Кліа на помніку расійскаму гісторыку М. М. Карамзіну. Расія. XIX ст.*



Чароўная Кліа лічылася адной з дзевяці муз Старажытнай Грэцыі. Гэты міфалагічны вобраз захоўваецца ў мастацтве на працягу ўсёй гісторыі. Пералічыце прадстаўленыя віды мастацтва. Што сімвалізуюць труба і скрутак (кніга) у руках Кліа, з якімі яе звычайна малююць? Якое значэнне гісторыі ў жыцці грамадства?

гісторыю» напісаў старажытны грэк Палібій, які бачыў галоўную задачу гісторыка не ў простым апісанні, а ў тлумачэнні падзей, раскрыцці прычынна-выніковых сувязей паміж імі. Менавіта ў часы Антычнасці быў закладзены падмурак гісторыі як навукі.

**Функцыі гісторыі**

**2. Для чаго неабходная гісторыя?** Сучасная гістарычная навука выконвае шэраг важных функцый у грамадстве. Адной з функцый гісторыі як навукі з'яўляецца *пазнавальная*. Вывучэнне гісторыі дазваляе чалавеку даведацца, як жылі нашы продкі, зразумець, чаму іх жыццё змянялася менавіта ў тым кірунку, які прывёў да сучаснага стану грамадства. Вывучаючы гісторыю, чалавек пазнае сябе.

*Выхаваўчая функцыя* заключаецца ў фарміраванні грамадзянскай пазіцыі і выпрацоўцы такіх якасцей, як патрыятызм, адказнасць і сумленнасць.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Гістарычная памяць** — здольнасць суб'ектаў захоўваць і перадаваць з пакалення ў пакаленне веды пра гістарычныя падзеі, якія адбыліся, пра этапы, якія прайшоў той ці іншы народ у сваім развіцці.

Як у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаванае палажэнне аб захаванні гістарычнай памяці?

«Гісторыя — настаўніца жыцця»

Як бы вы адказалі на пытанне: «Чаму вучыць гісторыя?».

Сярэдневяковая канцэпцыя

Гісторыя таксама выконвае *светапоглядную функцыю*, робячы свой унёсак у фарміраванне цэласнай сістэмы поглядаў на свет, грамадства, месца чалавека ў ім.

Асаблівае месца займае *функцыя сацыяльнай* або **гістарычнай памяці**. Гісторыя з'яўляецца спосабам калектыўнай самаідэнтыфікацыі і дазваляе ўсвядоміць сваю прыналежнасць да пэўнага народа, дзяржавы. Грамадства, пазбаўленае гістарычнай памяці, робіцца лёгкім аб'ектам любых маніпуляцый. Нездарма кажуць, што той, хто не памятае мінулага, не мае будучыні.

*Прагнастычная функцыя* гісторыі дазваляе прагназаваць будучыню на падставе аналізу падзей мінулага і сучаснасці. Чалавецтва праз зварот да гісторыі імкнецца набыць упэўненасць у сваім будучым.

**3. Сэнс гісторыі.** Мысляры заўсёды імкнуліся растлумачыць сэнс гісторыі і яе рухаючыя сілы, зразумець, чаму яна ідзе менавіта такім, а не іншым шляхам. Яшчэ ў антычную эпоху ўзнікла ідэя, што гісторыю твораць не багі, а людзі. Прычыны гістарычных падзей тлумачыліся жаданнямі людзей, уласцівасцямі і характарам іх чалавечай прыроды. Антычныя аўтары бачылі задачу гісторыі ў тым, каб настаўляць палітычных дзеячаў, вучыць і пераконваць дапытлівых людзей. Сутнасць гісторыі тлумачылася крылатаю фразай «Historia est magistra vitae» («Гісторыя — настаўніца жыцця»).

У сярэднявечнай Еўропе пытанне пра сэнс гісторыі разглядалася праз прызму рэлігіі. Лічылася, што воля Бога кіруе ўсім ходам гістарычнага развіцця паводле толькі яму вядомых і зразумелых законаў. Заснавальнікам такога погляду на гісторыю быў рэлігійны філосаф Аўгусцін Блажэнны. На яго думку, людзі — усяго толькі простыя выка-

наўцы боскай задумы (плана), іх розум і воля не здольныя змяніць ход гісторыі.

Гісторыя на карысць чалавека

У барацьбе супраць рэлігійных уяўленняў пра гісторыю ў Новы час складваліся вучэнні, якія ацэньвалі гістарычныя падзеі па тым, наколькі яны адпавядалі інтарэсам людзей. У XIX–XX стст. большасць вучоных, незалежна ад іх ідэалагічнай і палітычнай арыентацыі, лічылі, што людзі самі твораць гісторыю, падпарадкоўваючыся пэўным умовам і законам.

Як чалавек XXI ст., прапануйце свой адказ на пытанне: «У чым сэнс гісторыі?».

Бег часу

**4. Заканамернасці гістарычнага развіцця.** *Гістарычная заканамернасць* — гэта адносна ўстойлівая і рэгулярная ўзаемасувязь паміж з'явамі.

Адна з заканамернасцей гістарычнага развіцця заключаецца ў тым, што на кожную наступную стадыю развіцця чалавецтва выпадае менш часу, чым на папярэднюю, г. зн. адбываецца *паскарэнне развіцця грамадства*. Каменны век, напрыклад, нашмат даўжэйшы за век металаў, які ўключае бронзавы і жалезны вякі. Палеаліт (старажытны каменны век) працягваўся больш за 2,5 млн гадоў, а на ўсю наступную гісторыю чалавецтва прыпадае ўсяго 10 тысяч гадоў (каля 0,5 % усёй гісторыі).

Суб'ектыўны фактар развіцця

Існуе таксама *нераўнамернасць гістарычнага развіцця*. Кожны народ развіваецца ў сваім тэмпе, які залежыць ад асаблівасцей умоў існавання народа, ступені геаграфічнай ізаляванасці, складанасці прыродных і палітычных абставін і г. д.

«Нелагічная» гісторыя

Калі гістарычная заканамернасць з'яўляецца вынікам таго, як складаліся абставіны, дык *гістарычная выпадковасць* — супрацьлеглая ёй катэгорыя — гэта тое, што можа разрываць лагічны ланцуг. Таму, аналізуючы мінулае, не варта забывацца пра выпадкі гістарычных «выключэнняў з правіл», якія толькі пацвярджаюць існаванне заканамернасцей.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Мы жывём у час чарговай інфармацыйнай рэвалюцыі, якая мае на ўвазе выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій. Адзін з папярэдніх яе этапаў быў звязаны з дзейнасцю Іагана Гутэнберга, Францыска Скарыны і іх наступнікаў. Дзякуючы іх намаганням мы набылі магчымасць шматкроць хутчэй атрымліваць інфармацыю. Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя аб'ём навуковых даных, неабходных для вырашэння тэхналагічных і сацыяльных праблем, павялічваўся ўдвая кожныя 7–10 гадоў. У XXI ст. плынь інфармацыі падвойваецца менш чым за 1 год. Тая сума ведаў і тая колькасць навін, якія назапашваліся на працягу ўсяго XVI або XVII ст., цяпер пастаўляюцца за адзін тыдзень.

1. *Якая дзейнасць «рухавікоў» гістарычнага прагрэсу Іагана Гутэнберга і Францыска Скарыны маецца на ўвазе?*
2. *Якую ролю ў развіцці чалавецтва адыграла друкаванае, а цяпер ужо электроннае слова?*
3. *Чаму чым далей у часе ад нас гістарычная падзея, тым менш крыніц мы маем для яе вывучэння?*
4. *Ці адбілася перагрузка інфармацыяй на яе ўспрыняцці і запамінанні чалавекам XXI ст.?*
5. *Паразважайце, лёгка ці складана людзям наступных стагоддзяў будзе даць аб'ектыўную ацэнку сучаснаму нам гістарычнаму перыяду з улікам усіх крыніц і артэфактаў, якія будуць знаходзіцца ў іх распараджэнні.*

**5. Гістарычны факт і гістарычная крыніца.** Як правіла, гісторык вывучае разнастайныя **гістарычныя крыніцы**. Аднак, каб «вылузнуць» дакладную інфармацыю, іх трэба прааналізаваць, пільна праверыць, пры магчымасці супаставіць з іншымі. Гэты складаны, але неабходны працэс называецца крытыкай гістарычнай крыніцы. Толькі ў выніку такой нялёгкай і карпатлівай працы здабытая з крыніцы інфармацыя атрымлівае статус **гістарычнага факта** і робіцца часткай сістэмы гістарычных ведаў.

### Давярай, ды правярай

**Гістарычная крыніца** — аб'ект, які змяшчае звесткі пра дзейнасць людзей у мінулым.

Што азначае выраз «дапытаць крыніцу»?



„Без ведання гісторыі мы мусім прызнаць сябе выпадковасцямі, не ведаючы, як і навошта мы жывём, як і да чаго маем імкнуцца“.

Васіль Ключэўскі, расійскі гісторык (XIX — пачатак XX ст.)



„Існуюць законы развіцця грамадства, такія ж пэўныя, як і законы падзення каменя“.

Агюст Конт, французскі філосаф (XIX ст.)



„Гісторыя мае глыбокі сэнс, але ён недасяжны чалавечаму разуменню“.

Карл Ясперс, нямецкі філосаф (XX ст.)



„Паколькі ўсякая гісторыя залежыць ад нашых інтарэсаў, то могуць быць толькі гісторыі, і ніколі — Гісторыя“.

Карл Попер, аўстра-брытанскі філосаф (XX ст.)

Параўнайце розныя погляды на працэс гістарычнага пазнання.

Гістарычны факт трывала звязаны з іншымі фактамі. Вылучыць адзін з іх, выключыўшы з агульнага кантэксту гісторыі, немагчыма, а галоўнае — небяспечна. Таму вольная інтэрпрэтацыя асобных фактаў, як правіла, вядзе да перакручанага разумення гістарычных падзей.

**Гістарычны факт** — падзея мінулага, што аб'ектыўна адбылася, лакалізаваная ў часе і прасторы.

Гістарычныя крыніцы дазваляюць аднавіць больш-менш аб'ектыўную карціну мінулага. Але, фармулюючы вывады і ацэнкі гістарычных падзей, трэба памятаць пра непазбежную суб'ектыўнасць гісторыі як галіны гуманітарных ведаў. Чалавеку, які намагаецца разблытаць яе «клубок» і сфармуляваць сваю пазіцыю, важна быць памяркоўным да іншых пунктаў погляду, патрабаваць ад сябе і іншых належнага ўзроўню навуковай аргументацыі.

Цывілізацыя як ступень развіцця грамадства

**6. Паняцце «цывілізацыя».** Гісторыя як навука мае свае кола паняццяў, з дапамогай якіх апісваецца і тлумачыцца гістарычны працэс. Адно з найважнейшых паняццяў — **цывілізацыя**. Упершыню гэты тэрмін з'явіўся ў XVIII ст. для вызначэння

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Цывілізацыя** — ступень гістарычнага развіцця, наступная пасля першабытнага грамадства, ад якога адрозніваецца ўзнікненнем гарадоў, падзелам людзей на сацыяльныя пласты, стварэннем дзяржаў і вынаходствам пісьмовасці.

грамадства, заснаванага на розуме і справядлівасці. Такое грамадства супрацьпастаўлялася «прыроднаму» (неразвітому) альбо «варварскаму». Паступова тэрмін «цывілізацыя» сталі ўжываць і ў іншых значэннях.

Доўгі час цывілізацыя практычна атаясамлівалася з паняццем «культура». У выніку ўзнікала блытаніна, хоць гэтыя паняцці насамрэч не супадаюць. Культура з'явілася раней за цывілізацыю, на самых ранніх этапах чалавечага існавання, і ўяўляе сабой вынік матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці чалавека. Цывілізацыя паўстала, калі чалавек пачаў пераходзіць ад родаплемянной арганізацыі грамадства да дзяржавы.

### Лакальныя цывілізацыі

У сучаснай гістарычнай літаратуры часцей за ўсё сустракаецца паняцце *«лакальная цывілізацыя»*. Пад ёй разумеюць культурна-гістарычную супольнасць, якая характарызуецца адносным адзінствам духоўнага, грамадска-палітычнага і гаспадарчага жыцця.

Вучоныя вылучаюць больш за дваццаць лакальных цывілізацый. Істотную ролю ў фарміраванні цывілізацый адыграла рэлігія. Немагчыма, напры-



*Помнік «Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці»*

клад, уявіць арабскую цывілізацыю без ісламу, а еўрапейскую — без хрысціянства.

Як правіла, цывілізацыя ахоплівае вялікія рэгіёны з некалькімі і нават многімі дзяржавамі, як, напрыклад, заходнееўрапейская хрысціянская цывілізацыя. Часам цывілізацыя і дзяржава могуць супадаць, як гэта было ў Старажытным Егіпце або Кітаі. На працягу многіх стагоддзяў цывілізацыі існавалі ў адноснай ізаляцыі. Толькі з пачаткам Новага часу значна паскорыўся працэс іх збліжэння і паступовага фарміравання адзінай сусветнай цывілізацыі.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У розныя гістарычныя перыяды паняцце «сусветная гісторыя» інтэрпрэтавалі па-рознаму. Да канца XV ст. можна казаць толькі пра гісторыю асобных народаў, рэгіёнаў і кантынентаў, прадстаўнікі якіх часта нават не падазравалі пра існаванне адно аднаго.

1. *Якія гістарычныя падзеі паклалі пачатак агульнасусветнай гісторыі?*
2. *Якія аргументы могуць прыводзіць людзі, якія лічаць, што сусветная гісторыя пачалася з першага дня існавання чалавецтва?*
3. *Якая з дзвюх пазіцый здаецца вам гістарычна больш абгрунтаванай: сусветная гісторыя пачалася са з'яўленнем чалавека альбо яна пачалася з часу ўсталявання трывалых кантактаў паміж народамі ўсіх кантынентаў?*
4. *Сфармулюйце вызначэнні паняццяў «сусветная гісторыя» і «айчынная гісторыя». Як яны суадносяцца паміж сабой?*

**7. Перыядызацыя гісторыі.** Агульнапрынятым для сусветнай гісторыі з'яўляецца падзел на Старажытны свет, Сярэднія вякі, Новы і Найноўшы час.

У гісторыі Беларусі вылучаюць перыяды ў адпаведнасці з тымі дзяржавамі, якія існавалі на беларускіх землях у пэўны прамежак часу.

У 10-м класе вы будзеце вывучаць гісторыю Беларусі і свету на працягу некалькіх гістарычных эпох — першабытнасці, Старажытнага свету, Сярэдніх вякоў

Правообладатель Издательский центр БГУ

і ранняга Новага часу, ад найстаражытнейшых часоў да канца XVIII ст.

## ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ




Успомніце найбольш яскравую падзею сусветнай і айчыннай гісторыі кожнага гістарычнага перыяду.

Перыяд Старажытнага свету супадае з дадзяржаўнай гісторыяй Беларусі і ўключае ў сябе каменны, бронзавы і жалезны вякі. Старажытны свет — гэта эпоха першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі.

Эпоха Сярэднявечча — з сярэдзіны V ст. да канца XV ст. — падзяляецца на тры перыяды: Ранняе, Высокае і Позняе. Ранняе сярэднявечча (з сярэдзіны V да IX ст.) ахоплівае час ад прыходу славян на тэрыторыю Беларусі да фарміравання славянскіх племянных княстваў. Высокае сярэднявечча (X–XIII стст.) — перыяд існавання першых дзяржаў на беларускіх землях. Позняе сярэднявечча (XIV–XV стст.) ахоплівае час станаўлення і росквіту Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Ранні Новы час (XVI–XVIII стст.) — перыяд ад падрыхтоўкі і заключэння Люблінскай уніі да падзелаў Рэчы Паспалітай.

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Пералічыце і ахарактарызуйце функцыі гісторыі. Прывядзіце канкрэтныя прыклады рэалізацыі кожнай з іх.
2. Як вы разумееце выраз: «Гісторыя не мае ўмоўнага ладу»? Як ён суадносіцца з гістарычнымі заканамернасцямі развіцця?
3. Прывядзіце прыклады розных гістарычных крыніц. Якія з іх можна аднесці да пісьмовых, а якія — да матэрыяльных (артэфактаў)?
4. Дакажыце з дапамогай 3–4 тэзісаў мнагазначнасць паняцця «цывілізацыя».
5. Як суадносяцца агульнасусветная перыядызацыя гісторыі і перыядызацыя гісторыі Беларусі? Назавіце падзеі, якія паклалі пачатак новым перыядам сусветнай і айчыннай гісторыі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# СТАНАЎЛЕННЕ
## БЕЛАРУСЬ






**24-е тыс.**



**12-е тыс.**




Адступленне ледавіка

Рассяленне чалавека

Неалітычная рэвалюцыя

Узнікненн

**4-е тыс.**







## СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ
### У ДАДЗЯРЖАЎНЫ ПЕРЫЯД







3-е тыс.

VII ст.

Рассяленне індаеўрапейцаў

Распаўсюджанне жалеза

З’яўленне металаў



...е першых цывілізацый

да н. э.

н. э.

753 г.

476 г.








Правообладатель Издательский центр БГУ

# Раздзел I. СТАНАЎЛЕННЕ СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. БЕЛАРУСЬ У ДАДЗЯРЖАЎНЫ ПЕРЫЯД

## § 1. Паходжанне чалавека. Прырода і людзі

ПАЛЯВАННЕ ПЛЕМЯ
ЧАЛАВЕК УМЕЛЫ
ПРАВАДЫР ЛЕДАВІК
ЧАЛАВЕК ПРАМАХОДЗЯЧЫ
ЧАЛАВЕКАПАДОБНАЯ МАЛПА
ЧАЛАВЕК РАЗУМНЫ ЗБІРАЛЬНІЦТВА
СТАРЭЙШЫНА

Тэорыя паходжання чалавека

Успомніце, у чым сутнасць эвалюцыйнай тэорыі Ч. Дарвіна.

**1. Праблема паходжання чалавека.** Сучасныя навуковыя ўяўленні пра паходжанне чалавека грунтуюцца на аналізе знаходак касцявых рэштак старажытных відаў продкаў чалавека. Значныя перспектывы адкрыліся ў выніку выкарыстання вывадаў генетычных даследаванняў, якія абапіраюцца на даныя ДНК сучаснага чалавека і даўнейшых яго прадстаўнікоў. Усё больш пацвярджэнняў знаходзіць *эвалюцыйная тэорыя*. Існуюць і альтэрнатыўныя тэорыі: *крэацыянізм* — вучэнне аб паходжанні свету

і чалавека ў выніку звышнатуральнага акта тварэння Бога; тэорыя незямнога паходжання чалавека.

Ці вядомыя вам іншыя тэорыі паходжання чалавека? Якую з іх заведама ў сваім выказванні адмаўляў Ч. Дарвін?

Эвалюцыйны шлях чалавека быў няпросты



„Растлумачыць паходжанне жыцця на зямлі толькі выпадкам — гэта як калі б растлумачылі паходжанне слоўніка выбухам у тыпаграфіі“.

Чарльз Дарвін,
англійскі вучоны, які сфармуляваў тэорыю эвалюцыі ў сваёй кнізе «Паходжанне відаў» (1859 г.)

і ўключаў некалькі стадый.

## СТАРАЖЫТНЫЯ ВІДЫ ЧАЛАВЕКА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
|  |  |  |  |  |
| **Аўстралапітэк** | **Чалавек умелы** | **Чалавек прамаходзячы** | **Неандэрталец** | **Чалавек разумны (краманьёнец)** |
| *Рэканструкцыя знешняга выгляду старажытных тыпаў чалавека выканана Р. Яўсеевым* | | | | |
| ~3,5 млн гадоў таму | ~2 млн гадоў таму | ~1,5–0,8 млн гадоў таму | ~300–26 тыс. гадоў таму | ~280–40 тыс. гадоў таму |

Што ў абліччы старажытных відаў чалавека мянялася найбольш істотна? Як вы лічыце, з чым гэта было звязана?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Чым была выклікана эвалюцыя старажытных прыматаў, якая прывяла ў выніку да фарміравання высокаразвітых істот, здольных мысліць і ствараць новае? Імклівыя змены фізічных характарыстык продкаў чалавека вучоныя тлумачаць мутацыйнай тэорыяй. Так, мутацыі, што прывялі да памяншэння фізічнай моцы, знікнення магутных іклаў і да т. п., запатрабавалі ад далёкіх папярэднікаў чалавека шукаць іншыя шляхі выжывання сярод драпежнікаў у неспрыяльных прыродных умовах. Заменай выступілі выраб і выкарыстанне прылад працы рукамі, якія вызваліліся дзякуючы прамахаджэнню, а таксама развіццё сацыяльных сувязей, актыўная ўзаемадапамога і калектыўная арганізацыя працы.

### Уплыў прыродных фактараў

Эвалюцыя чалавека адбывалася разам са зменамі ў прыродзе: мяняліся кліматычныя ўмовы, разам з імі і ландшафт мясцовасці. Адны ўмовы былі спрыяльныя для жыцця старажытных людзей і не выклікалі патрэбы ў нейкіх зменах. У іншых выпадках суровы клімат і бедны ландшафт не дазвалялі людзям жыць у пэўнай мясцовасці.



*Фаўна тундры ледавіковага перыяду.*
*Мурал Амерыканскага музея прыродазнаўчай гісторыі. Г. Нью-Ёрк*

На нашай планеце перыядычна адбываліся глабальныя пахаладанні *(ледавіковыя перыяды)*, што прыводзілі да разрастання ледавіковага покрыва. Ваганні клімату патрабавалі ад чалавека шукаць новыя шляхі выжывання і ў выніку спрыялі развіццю мыслення і працоўных навыкаў, тэхналогій вырабу прылад працы. Але змены не былі хуткімі і дынамічнымі, сотні тысяч гадоў праходзілі без усялякіх перамен.

**Афрыка — магчымая прарадзіма чалавека**

**2. Рассяленне людзей на кантынентах.** Магчыма, Афрыка стала першым кантынентам, заселеным




*Рассяленне чалавека на кантынентах Зямлі*

Правообладатель Издательский центр БГУ

людзьмі. Зніжэнне ўзроўню Сусветнага акіяна (на 100 м і больш) прывяло да ўзнікнення сухапутных «мастоў» паміж часткамі сушы, раней падзеленымі вадой. Па іх старажытныя людзі рассяляліся па кантынентах. Пазней такім самым шляхам у Еўропу пранiклі неандэртальцы. 100 тыс. гадоў таму яны атабарыліся ва Усходняй Еўропе, што пацвярджаюць сотні стаянак, знойдзеных археолагамі.

50–60 тыс. гадоў таму краманьёнцы перайшлі з Афрыкі на Аравійскі паўвостраў. Пачалося іх «трыумфальнае шэсце» па ўсім свеце. Больш за 40 тыс. гадоў таму краманьёнцы з'явіліся на тэрыторыі Еўропы.

Працягваюцца дыскусіі наконт часу і абставін засялення людзьмі Амерыкі. Цікава, што найстаражытнейшыя рэшткі чалавека сучаснага тыпу на тэрыторыі ЗША і Чылі датуюцца прыблізна адным часам — 15–16 тыс. гадоў таму.

**Прыход неандэртальцаў на тэрыторыю Беларусі**

**3. З'яўленне людзей на тэрыторыі Беларусі.** На беларускіх землях каля 100 тыс. гадоў таму пачалося апошняе абледзяненне. Шыракалістыя лясы змяніліся на хваёва-бярозавыя пушчы, а з надыходам яшчэ большых халадоў пачалі пераважаць бярозавыя рэдкалессі. Здаралася, што пахаладанняў не было некалькі тысячагоддзяў. У перыяд чаргова міжледавікоўя на тэрыторыю Беларусі пранiклі старажытныя людзі. Іх прываблівалі буйны́я жывёлы — маманты і шарсцістыя насарогі, якія жылі на прыледавіковай тэрыторыі.

Якія від палявання выкарыстоўвалі старажытныя людзі ў дадзены гістарычны перыяд? Якія фактары былі залогам яго поспеху?

Хутчэй за ўсё, першымі людзьмі, што прыйшлі на тэрыторыю Беларусі, былі неандэртальцы. Пра гэта сведчаць знойдзеныя каля вёсак Абідавічы (Магілёўская вобласць), Падлужжа і Свяцілавічы (Гомельская вобласць) вельмі старажытныя крамянёвыя прылады працы. Але пакуль не будуць знойдзены стаянкі, можна казаць толькі пра нядоўгае знаходжанне неандэртальцаў на тэрыторыі Беларусі. Магчыма, пасля дэталёвага вывучэння стаянкі

каменнага веку Огава-1 каля аднайменнай вёскі ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці такія доказы з'явяцца.

Першыя стаянкі на тэрыторыі Беларусі

Не выклікае сумненняў пранікненне на тэрыторыю Беларусі краманьёнцаў. Добра вядомыя іх стаянкі каля вёсак *Юравічы* Калінкавіцкага раёна **(24-е тыс. да н. э.)** і *Бердыж* Чачэрскага раёна **(22–21-е тыс. да н. э.)** Гомельскай вобласці. Гэта былі паселішчы паляўнічых на мамантаў і іншых буйны́х прадстаўнікоў фаўны.



*Музей-стаянка першабытнага чалавека. В. Юравічы. Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці*

Уздоўж рэк…

12 тыс. гадоў да н. э. ледавік канчаткова адступіў з тэрыторыі Беларусі. Пасля гэтага пачалося хуткае засяленне тэрыторыі з захаду і паўднёвага ўсходу. Цалкам беларускія землі, хоць і нераўнамерна, былі заселеныя ў перыяд сярэдняга каменнага веку (мезаліту). Вядома больш за 120 старажытных паселішчаў таго часу, у асноўным яны месціліся на берагах найбуйнейшых рэк — Дняпра, Прыпяці, Нёмана і іх прытокаў. Ад таго часу актыўная жыццядзейнасць на нашых землях больш не спынялася.

Як вы лічыце, чаму старажытныя перасяленцы размяшчалі свае стаянкі на берагах рэк?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Ад праабшчыны да радавой абшчыны

**4. Калектывы старажытных людзей.** Абараніцца ад дзікіх звяроў, знайсці харчаванне і выжыць у няпростых кліматычных умовах старажытныя людзі здолелі дзякуючы аб'яднанню сваіх намаганняў. Пачатковую форму арганізацыі грамадства называюць *праабшчынай*. Гэтыя калектывы былі невялікія, асновy іх жыцця складалі збіральніцтва і паляванне. Менавіта супольнае паляванне на буйны́х жывёл спрыяла далейшаму ўмацаванню сацыяльных сувязей.

## ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ ПЕРШАБЫТНАГА ГРАМАДСТВА

**ПРААБШЧЫНА** → **РАДАВАЯ АБШЧЫНА** → **СУСЕДСКАЯ АБШЧЫНА**

**ПРААБШЧЫНА**
- 20–30 чалавек;
- няўстойлівы склад;
- наяўнасць лідара — важака

**РАДАВАЯ АБШЧЫНА**
- аб'яднанне па радавым прынцыпе;
- калектыўная ўласнасць роду на зямлю;
- раўнапраўе ўсіх родзічаў;
- полаўзроставы падзел працы;
- вырашэнне важных пытанняў на агульным сходзе членаў роду;
- на чале старэйшына — найбольш вопытны член роду

**СУСЕДСКАЯ АБШЧЫНА**
- аб'яднанне сем'яў па тэрытарыяльным прынцыпе;
- калектыўная ўласнасць абшчыны на зямлю;
- сямейнае землекарыстанне, сямейная ўласнасць на прылады працы, жывёлу, ураджай

Радавая абшчына → **МАЦЯРЫНСКАЯ РАДАВАЯ АБШЧЫНА**
- сваяцтва па мацярынскай лініі;
- прысвойвальная гаспадарка;
- калектыўная ўласнасць на прылады працы

Радавая абшчына → **БАЦЬКОЎСКАЯ РАДАВАЯ АБШЧЫНА**
- сваяцтва па мужчынскай лініі;
- вытворчая гаспадарка;
- калектыўная і асабістая ўласнасць на прылады працы

Якая вядомая прыказка, што паказвае на неабходнасць людзям дзейнічаць супольна, можа прымяняцца да чалавека на ўсіх этапах яго гісторыі?

З цягам часу адбылося афармленне **радавой абшчыны**, галоўнай прыкметай якой была кроўная сувязь усіх яе членаў. Некалькі родаў, што мелі, як правіла, агульнае паходжанне, складалі *племя*.

Калектывізм першабытных людзей зрабіўся найважнейшым фактарам у натуральным адборы тых груп насельніцтва, у якіх больш трывалымі былі сацыяльныя сувязі і ўзаемадапамога. Дзякуючы гэтаму яны маглі лепш супрацьстаяць дзікім жывёлам, ворагам і стыхійным бедствам.

**Радавая абшчына** — калектыў кроўных родзічаў, якія вялі агульную гаспадарку і супольна валодалі прыладамі працы.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У 1908 г. у Францыі каля пячоры Ле-Мусцье былі знойдзены рэшткі старажытнага чалавека. Спецыялісты высветлілі, што гэты неандэртальскі малады чалавек 16–18-гадовага ўзросту, ростам каля 160 см, быў не проста кінуты суродзічамі, а пахаваны. Для гэтага была спецыяльна выкапаная невялікая яма, у якую яго паклалі на бок; пад галаву загнулі правую руку, левую выцягнулі наперад. У магіле каля галавы ляжалі вялікія кавалкі крэменю, былі раскіданы каменныя прылады і кавалкі прыгатаванага мяса. Пра апошняе сведчылі абпаленыя ў агні косткі жывёл.

*Якія вывады пра неандэртальцаў можна зрабіць на падставе гэтай знаходкі?*



*Пахаванне ў Ле-Мусцье.*
*Мастак З. Бурыян*

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Доўгі шлях эвалюцыі чалавека праходзіў ва ўмовах яго залежнасці ад прыроды. Змены клімату, флоры і фаўны сталі сапраўдным выклікам на шляху станаўлення чалавечай цывілізацыі. Дзякуючы стварэнню прылад працы і развіццю калектыўных формаў жыццядзейнасці людзі здолелі выжыць у цяжкіх умовах ледавіковых перыядаў. Беручы ў прыроды ўсё неабходнае, першабытныя паляўнічыя і збіральнікі паступова рассяляліся па ўсёй тэрыторыі Зямлі. Так пачалася гісторыя чалавецтва, якое сур'ёзна мянялася ў кожную наступную эпоху.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| Больш за 40 тыс. гадоў таму — пачатак рассялення краманьёнцаў на тэрыторыі Еўропы | 24-е тыс. да н. э. — найбольш даўняя стаянка старажытнага чалавека (краманьёнца), знойдзеная археолагамі каля в. Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Раскажыце пра розныя версіі паходжання чалавека.
2. Ахарактарызуйце этапы эвалюцыі чалавека ад вышэйшых прыматаў да чалавека сучаснага тыпу.
3. Прасачыце па картасхеме на с. 21 рассяленне людзей на кантынентах Зямлі. Што, на вашу думку, магло палегчыць або ўскладніць гэты працэс? Чаму поўнач Еўразіі была заселена пазней за іншыя тэрыторыі?
4. На падставе самастойна абраных крытэрыяў ахарактарызуйце эвалюцыю формаў арганізацыі першабытных людзей.
5. Уявіце, што вам неабходна падрыхтаваць прэзентацыю «Этапы засялення тэрыторыі Беларусі першабытнымі людзьмі». Прапануйце загалоўкі слайдаў для гэтай прэзентацыі.
6. Якія фактары аказалі найбольшы ўплыў на эвалюцыю чалавека: змены клімату, флоры і фаўны; праца; вынаходства прылад працы; калектыўныя формы арганізацыі жыцця? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

# § 2–3. Эвалюцыя грамадства і эканомікі ў старажытнасці

ВЫТВОРЧАЯ ГАСПАДАРКА
РАДАВАЯ АБШЧЫНА
ІНДАЕЎРАПЕЙЦЫ КАМЕНЬ
БРОНЗА СУСЕДСКАЯ АБШЧЫНА
НЕАЛІТЫЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
ПРЫСВОЙВАЛЬНАЯ ГАСПАДАРКА
ЖАЛЕЗА

**1. Удасканальванне прылад працы і тэхналогій.** Пачатак выкарыстання прылад працы стаў пачаткам гісторыі чалавецтва. Іх вялізнае значэнне для развіцця чалавека адлюстравана ў назвах перыядаў першабытнай эпохі.

Чаму выкарыстанне прылад працы лічыцца першай старонкай гісторыі чалавецтва?

| | | |
|---|---|---|
| **Каменны век** | *Палеаліт* — старажытны каменны век (ранні, сярэдні, позні) | 100–35 тыс. гадоў таму — 10-е тыс. да н. э. |
| | *Мезаліт* — сярэдні каменны век | 9–5-е тыс. да н. э. |
| | *Неаліт* — новы каменны век | Канец 5-га — канец 3-га тыс. да н. э. |
| **Бронзавы век** | | 2-е тыс. да н. э. — VIII ст. да н. э. |
| **Жалезны век** | | VII ст. да н. э. — канец V ст. н. э. |

*Перыядызацыя старажытнай гісторыі Беларусі*

### Пачатак падпарадкавання прыроды

Прыблізна 2 млн гадоў таму чалавек умелы пачаў апрацоўваць камяні, абабіваючы іх па краях, надаючы тым самым завостраную або вострую форму. Такая форма дазваляла зручней выконваць разнастайныя дзеянні, галоўным з якіх заставалася здабыча ежы. Першапачатковыя каменныя прылады былі зусім простыя, пры гэтым тэхналогія іх вырабу захоўвалася доўгі час.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Прылады працы чалавека прамаходзячага**

Успомніце, якія матэрыялы старажытны чалавек выкарыстоўваў для стварэння прылад працы.

Са з'яўленнем чалавека прамаходзячага звязаны далейшы прагрэс у вытворчасці прылад працы: яны сталі больш разнастайныя, ускладнілася тэхніка іх вырабу. З'явілася ўніверсальная прылада працы — ручное біла, яно было апрацаванае з двух бакоў і прыдатнае як для рубкі, так і для рэзання. Каля 1 млн гадоў таму чалавек пачаў выкарыстоўваць каменныя сякеры. Апроч каменю для вырабу прылад працы ўжываліся і іншыя матэрыялы.

Найважнейшым дасягненнем чалавека прамаходзячага стала штучная здабыча агню трэннем або пры дапамозе крэсіва (у адрозненне ад аўстралапітэкаў, што карысталіся агнём выпадковых пажараў).

**Удасканаленне прылад працы неандэртальцамі**

Якія перавагі ў паляванні давала кідальная зброя?

У часы неандэртальцаў каменныя прылады працы ўдасканаліліся. Старажытныя майстры папярэдне нарыхтоўвалі кавалкі крэменю правільнай формы, з якіх сколвалі вострыя адшчэпы. Адначасова з гэтым з'явілася кідальная зброя, з дапамогай якой можна было больш эфектыўна паляваць на буйны́х жывёл, напрыклад мамантаў. Тыповай прыладай працы стала шматфункцыянальнае скрэбла, з яго дапамогай людзі апрацоўвалі дрэва і шкуры, габлявалі і рэзалі.

**Рэвалюцыйныя вынаходствы краманьёнца**



*Загатоўка. Крэмень. 9–8-е тыс. да н. э. Гродненская вобласць*

Краманьёнцы доўгі час карысталіся такімі самымі прыладамі працы, як і іншыя прадстаўнікі роду Homo. Але ў познім палеаліце адбыліся настолькі значныя зрухі ў выкарыстанні прылад працы, што прынята казаць пра іх рэвалюцыйны характар. Сярод найбольш істотных новаўвядзенняў гэтага часу трэба вылучыць лёгкія кідальныя дзіды і гарпуны (у тым ліку з косці), рыбалоўныя кручкі, іголкі з вушкам, дзідакідалкі (механічнае прыстасаванне для кідання дроцікаў). Асабліва варта адзначыць вынаходства *лука са стрэламі.*

Далейшае развіццё мысленне чалавека разам з яго схільнасцю да вынаходніцтва атрымала ў мезаліце. У гэты час шырока распаўсюдзіліся мікраліты — невялікага памеру вырабы з каменю, якія выкарыстоў-

валі ў якасці ўкладышаў у драўляную або касцяную аснову (для стварэння састаўных прылад працы або зброі).

Лук — кідальная зброя — суправаджаў чалавека на працягу эпох першабытнасці, Старажытнага свету і Сярэднявечча. Магчыма, упершыню яго пачалі выкарыстоўваць яшчэ 64 тыс. гадоў таму: нядаўна на поўдні Афрыкі былі знойдзены старажытныя каменныя наканечнікі стрэл таго часу. Вялікае распаўсюджанне лук атрымаў ужо ў мезаліце.



*Крэмневыя наканечнікі стрэл. Позні неаліт. Паселішча Млыны. Камянецкі раён Брэсцкай вобласці*

Карыстаючыся дадатковымі крыніцамі інфармацыі, высветліце, як старажытныя людзі першапачаткова выкарыстоўвалі лук.

**Пераход да аселасці**

Такі прагрэс у развіцці стаў адказам на чарговы выклік прыроды — пачаўся новы ледавіковы перыяд. Ва ўмовах рэзкага пахаладання чалавек пачаў будаваць больш трывалае жытло і засноўваць сталыя паселішчы (у іх археолагі часта знаходзяць ямы для захоўвання прадуктаў). У перыяд сярэдняга каменнага веку прысвойвальная гаспадарка дасягнула найвышэйшага, але адначасова і гранічнага ўзроўню развіцця.

**Крызіс у грамадстве паляўнічых і збіральнікаў**

**2. Неалітычная рэвалюцыя — найважнейшая падзея ў гісторыі чалавецтва.** Да 10-га тыс. да н. э. чалавек рассяліўся па ўсіх кантынентах (за выключэннем Антарктыды). Дзякуючы выкарыстанню прылад працы і зброі чалавек умацаваўся як пануючы від.

Змены клімату, змяншэнне колькасці асобных відаў жывёл прывялі да новага крызісу ў развіцці чалавецтва. Спрабуючы выжыць, старажытныя людзі знайшлі два шляхі яго пераадолення.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Шляхі пераадолення крызісу

Некаторыя групы насельніцтва, што жылі ў суровых умовах поўначы Еўразіі, пустынь Аўстраліі, джунгляў Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі, замерлі ў сваім развіцці, закансерваваўшы традыцыйны лад жыцця, і не дапускалі ніякіх змен. У такіх чалавечых супольнасцях склалася сістэма *табу* (строгая забарона на здзяйсненне пэўных дзеянняў), якая абмяжоўвала вынішчэнне жывёл і ўжыванне ежы, а таксама ўмешвалася ў сямейна-шлюбныя адносіны. Так удавалася стрымліваць рост колькасці насельніцтва і жыць у гармоніі з прыродай, па-ранейшаму беручы ў яе ўсё неабходнае ў гатовым выглядзе.



*Суадносіны памераў маманта і яго сучаснага нашчадка — слана. Музей маманта імя П. А. Лазарава. Г. Якуцк. Расійская Федэрацыя*

На думку часткі вучоных, не толькі прырода, але і старажытныя людзі нясуць адказнасць за выміранне мамантаў. На ўсіх кантынентах гэта адбылося каля 11 тыс. гадоў таму. Магчыма, асобныя папуляцыі мамантаў яшчэ некалькі тысяч гадоў жылі ізалявана. Гэтую гіпотэзу пацвярджаюць знаходкі на востраве Врангеля, які знаходзіцца ў Паўночным Ледавітым акіяне. Маманты, што жылі там, былі меншыя за сваіх мацерыковых сабратаў і вымерлі каля 3,7 тыс. гадоў таму.

## Першая рэвалюцыя ў гісторыі

**Неалітычная рэвалюцыя** — пераход ад прысвойвальнай гаспадаркі да вытворчай.

У іншых прыродных умовах з больш спрыяльным кліматам (Пярэдняя Азія, Егіпет, Індыя, Паўднёва-Усходняя Еўропа) у развіцці чалавецтва адбыўся прарыў. Людзі пачалі свядома ўздзейнічаць на прыроду, займаючыся земляробствам і жывёлагадоўляй. Змены былі настолькі значныя, што атрымалі назву **неалітычнай рэвалюцыі**.

Гэта не была імгненная падзея, у розных рэгіёнах свету яна расцягнулася з 9-га да 3-га тыс. да н. э. Найбольш старажытным яе ачагом быў Бліжні Усход. На тэрыторыі Беларусі пра зараджэнне земляробства і пачатак гадоўлі свойскай жывёлы можна казаць з сярэдзіны 3-га тыс. да н. э. Пераход да *вытворчай гаспадаркі* не азначаў адмовы ад ранейшых шляхоў атрымання прадуктаў харчавання — палявання, збіральніцтва, рыбалоўства, але паступова яны рабіліся другаснымі, дапаможнымі промысламі.

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Як вядома, праблема ўзаемадзеяння чалавека і прыроды набыла яшчэ большую актуальнасць у нашы дні. Дзіўна, але і сёння, праз больш за 10 тысяч гадоў, чалавецтва мае тыя ж два шляхі яе вырашэння:

— самаабмежаванне патрэб, кантроль нараджальнасці і «масавага спажывання»;

— новыя рэвалюцыйныя адкрыцці, што дазволяць задаволіць патрэбы чалавецтва і мінімізаваць пакуты планеты.

1. *У чым розніца прычын пазначанай праблемы для эпохі неаліту і сучаснасці?*
2. *Якія разнавіднасці і наступствы гэтай праблемы мы назіраем сёння? Чаму яны носяць характар «глабальных праблем чалавецтва»?*
3. *Якія канкрэтныя дзеянні пераадолення гэтай, здавалася б, адносна новай праблемы прапанавалі старажытныя людзі?*
4. *Назавіце сучасныя тэхналогіі «ыратавання» планеты, якія ў першую чаргу ўплываюць не на аб'ёмы патрэб чалавечай цывілізацыі, а прапануюць новыя шляхі іх задаволення.*
5. *Які з двух спосабаў вырашэння няпростых адносін чалавека і прыроды бачыцца вам больш дзейсным? Ці можна рацыянальна спалучыць абодва?*

**Наступствы неалітычнай рэвалюцыі**

**3. Наступствы пераходу да вытворчай гаспадаркі.** Неалітычная рэвалюцыя мела вельмі глыбокія і разнастайныя наступствы. У выніку грандыёзнага гаспадарчага перавароту змяніўся характар узаемаадносін чалавека і прыроды, людзі перайшлі да аселага

Правообладатель Издательский центр БГУ

ладу жыцця, больш складанымі сталі адносіны ўнутры калектыву. Разам з ускладненнем духоўнага свету быў дадзены імпульс развіццю мыслення чалавека, бо патрабаваліся больш глыбокія веды пра навакольны свет.




Выявіце ўзаемасувязі паміж наступствамі неалітычнай рэвалюцыі.

*З'яўленне першых вырабаў з металаў*

**4. Адкрыццё металургіі і яе значэнне.** Наступным важным этапам у гісторыі чалавецтва стала выкарыстанне металічных прылад працы. Першапачаткова гэта былі медныя, бронзавыя (у асноўным са сплаву медзі і волава), а пасля жалезныя вырабы. Чалавек усвядоміў перавагі металу перад каменем. З цягам часу ўсе каменныя прылады былі замененыя на металічныя аналагі. Выкарыстанне металаў павялічыла колькасць і разнастайнасць прадметаў, якія выраблялася.

Першыя металічныя вырабы з’явіліся ў канцы 5–4-га тыс. да н. э. Гэта былі медныя прылады буйны́х памераў, галоўным чынам сякеры, а таксама ўпрыгажэнні з медзі, золата і срэбра. Выкаваныя з самароднай медзі вырабы з’яўляліся і раней, але яны не складалі канкурэнцыі каменным прыладам працы.

## Бронзавы век

Асваенне тэхналогій вытворчасці вырабаў з металаў на тэрыторыях пражывання людзей адбывалася нераўнамерна: спачатку гэта быў Бліжні і Сярэдні Усход (3-е тыс. да н. э.). У гісторыі Беларусі, як і ўсёй Еўропы, бронзавы век датуецца пачаткам 2-га тыс. да н. э. — VIII ст. да н. э. Медзь і вырабы з бронзы траплялі на нашы землі з тэрыторыі Прыкарпацця, Балкан, Каўказа і Урала. Але яшчэ доўга выкарыстоўваліся звыклыя каменныя прылады працы. Найранейшымі металічнымі рэчамі, якія знайшлі археолагі на тэрыторыі Беларусі, з’яўляюцца плоская бронзавая сякера і меднае шыла. Дзякуючы развіццю абмену з суседнімі і аддаленымі абласцямі гэтыя тэрыторыі аказаліся трывала звязаны з агульнаеўрапейскімі працэсамі.



*Бронзавая сякера. 1300–900 гг. да н. э. Г. Пінск. Брэсцкая вобласць*

Выкарыстанне бронзавых прылад працы рэзка павялічыла эканамічныя магчымасці чалавека. З дапамогай бронзавай сякеры лясныя прасторы лягчэй і хутчэй ператвараліся ў расчышчаныя палі. Як вынік — пашыраўся асартымент збожжавых культур. З цягам часу людзі змаглі не толькі забяспечыць сябе прадуктамі харчавання, але і атрымаць іх лішкі. Колькасць насельніцтва імкліва павялічвалася.

**КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗЯМЛІ (млн чал.)**




На колькі мільёнаў чалавек павялічылася насельніцтва планеты ў пачатку бронзавага веку?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Жалезны век

Яшчэ больш глыбокія змены надышлі пасля адкрыцця жалеза, з якога выраблялі прылады працы і зброю. Жалезная металургія з'явілася даволі позна, нягледзячы на тое што радовішчы гэтага прыроднага выкапня сустракаюцца досыць часта (асабліва ў выглядзе балотнай руды). Дадзены факт тлумачыцца складанай тэхналогіяй вытворчасці якаснага металу і яго тугаплаўкасцю. Найбольш раннія вырабы з жалеза былі зроблены старажытнымі кавалямі на мяжы 2–1-га тыс. да н. э. у Пярэдняй Азіі, Індыі і Паўднёвай Еўропе, хоць асобныя прадметы для рытуальных мэт выраблялiся з метэарытнага жалеза — «металу багоў» — значна раней: з 6–5-га тыс. да н. э.

Успомніце, якая прылада выкарыстоўвалася на тэрыторыі Беларусі для плаўкі жалеза пры высокіх тэмпературах.

Насельніцтва тэрыторыі Беларусі авалодала навыкамі жалезаробчай вытворчасці амаль адначасова з іншымі народамі Еўропы — у VII–VI стст. да н. э. Адначасова ў Беларусь прыйшло і кавальства. Выкарыстанне жалезных прылад працы і зброі паўплывала на ўсе бакі жыцця мясцовага насельніцтва.

Сярод вялізнай разнастайнасці наступстваў новага тэхнічнага перавароту, які шмат у чым падрыхтаваў глебу для будучага індустрыяльнага грамадства, былі ўзмацненне ўзаемадзеяння паміж супольнасцямі людзей (войны, абмен прадукцыяй, запазычанне тэхналогій) і павелічэнне іх рухавасці.

Прычыны міграцый

**5. Прычыны і значэнне міграцый насельніцтва.** На працягу ўсёй старажытнай гісторыі адбываліся перасяленні людзей на новыя тэрыторыі, г. зн. *міграцыі*. Першапачаткова яны мелі стыхійны характар. Чалавек шукаў больш спрыяльныя для жыцця месцы з большай колькасцю жывёл для палявання, вадаёмаў для рыбалоўства і г. д. З узнікненнем вытворчай гаспадаркі чалавек пачаў здзяйсняць пераходы ў пошуках пашаў і больш урадлівых зямель. Далейшы рост насельніцтва, складванне буйны́х супольнасцей, а пасля і цывілізацый прыводзілі да з'яўлення новых прычын міграцый.

## ПРЫЧЫНЫ МІГРАЦЫЙ СТАРАЖЫТНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

**УНУТРАНЫЯ**

- рост колькасці насельніцтва;
- вычарпанне рэсурсаў населенай мясцовасці;
- развіццё транспарту (колавы, конны, водны) і дарог;
- пашырэнне ваяўнічай ідэалогіі;
- новыя рэлігійныя ідэі, пошук «зямлі запаветнай», «раю на зямлі»

**ЗНЕШНІЯ**

- змяненне клімату і ландшафту, прыродныя катаклізмы;
- буйны́я ваенна-палітычныя падзеі (падзенне імперый);
- экспансія іншых плямёнаў, паражэнні ў войнах з суседзямі

**Гістарычная роля міграцый**

Вынікам міграцый людзей стала іх рассяленне ва ўсіх спрыяльных для жыцця рэгіёнах нашай планеты. Змешванне мясцовага і чужога насельніцтва стала прычынай фарміравання новых этнічных супольнасцей. Міграцыйныя працэсы спрыялі пашырэнню найважнейшых дасягненняў чалавецтва: земляробства і жывёлагадоўлі, металургіі, пісьменства і г. д. Адбываўся абмен формамі грамадскай арганізацыі, элементамі матэрыяльнай і духоўнай культуры.

**Індаеўрапейскія народы**

**6. Індаеўрапейская экспансія на тэрыторыі Беларусі.** Большасць сучасных еўрапейскіх народаў мае агульнае індаеўрапейскае паходжанне. *Індаеўрапейцы* — гэта старажытная этнамоўная супольнасць, што склалася ў 6—5-м тыс. да н. э. Пра месцазнаходжанне іх прарадзімы гісторыкі дыскутуюць шмат гадоў.

Народы, што размаўлялі на індаеўрапейскіх мовах, рассяліліся на агромністых прасторах ад Еўропы да Індыі. Адсюль і паходзіць іх назва, прапанаваная вучонымі ў XIX ст. Да ліку найстаражытнейшых індаеўрапейцаў адносіліся хеты, персы і інш. На працягу 3-га тыс. да н. э. індаеўрапейцы засялілі ўсю Еўропу і змяшаліся з мясцовым насельніцтвам. У выніку ўтварылася некалькі індаеўрапейскіх груп, якія размаўлялі на ўласных мовах. Пры гэтым выразнага падзелу на асобныя этнасы (народы) у тыя

На падставе наяўнай інфармацыі сфармулюйце азначэнне паняцця «індаеўрапейцы».

Правообладатель Издательский центр БГУ

часы не было. Найважнейшай прыкметай, што адрознівала адну супольнасць ад іншай, была мова, на якой яны размаўлялі.

## ГРУПЫ ІНДАЕЎРАПЕЙСКІХ НАРОДАЎ ЕЎРОПЫ

Успомніце, якія індаеўрапейскія народы рассяліліся ў Беларусі.







*Рассяленне індаеўрапейцаў і гіпотэзы аб іх прарадзіме*

Пакажыце на картасхеме магчымыя прарадзімы індаеўрапейцаў.

**Прычыны міграцыі індаеўрапейцаў**

Масавыя перасяленні індаеўрапейцаў былі звязаныя галоўным чынам са змяненнем клімату: у выніку чарговага пахаладання зімы сталі больш працяглыя і суровыя, а летнія месяцы — больш спякотныя. У сувязі з гэтым панізілася роля земляробства і на першае месца ў эканоміцы індаеўрапейцаў выйшла жывёлагадоўля, якая патрабавала пашырэння пашаў і пошуку новых тэрыторый, дзе маглі б пракарміцца і людзі, і статкі жывёл.

Павелічэнню маштабаў міграцыі індаеўрапейцаў спрыялі вынаходства колавага транспарту і выкарыстанне для верхавой язды коней. Гэтыя фактары павысілі мабільнасць, умацавалі гандлёвыя і культурныя сувязі паміж рознымі супольнасцямі, змянілі спосабы вядзення гаспадаркі і вайсковай справы.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Уважліва разгледзьце вырабы індаеўрапейцаў.

1. *Чаму тэрыторыя іх рассялення ў Еўропе атрымала назву:*
   *а) культуры шнуравой керамікі;*
   *б) культуры баявых сякер?*
2. *Як на падставе дадзеных вырабаў можна ацаніць узровень развіцця тэхналогій у старажытных індаеўрапейцаў?*



*Каменныя сякеры і гліняны гаршчок старажытных індаеўрапейцаў*

**Індаеўрапейцы на тэрыторыі Беларусі**

Прыблізна ў сярэдзіне 3-га тыс. да н. э. індаеўрапейцы з'явіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Мяшаючыся з мясцовым насельніцтвам, яны перадавалі сваю мову, вопыт вядзення сельскай гаспадаркі і навыкі рамяства. У выніку сфарміравалася новая культура, новы ўклад жыцця, у якім асноўную ролю адыгрывалі земляробства і жывёлагадоўля. У 2-м тыс. да н. э. на тэрыторыі Беларусі склалася этнаплемянная супольнасць людзей, якую вучоныя назвалі балтамі.

Правообладатель Издательский центр БГУ




Граніцы Рэспублікі Беларусь
Тэрыторыя, першапачаткова заселеная індаеўрапейцамі з сярэдзіны 3-га тыс. да н. э.
Асноўныя напрамкі міграцыі індаеўрапейцаў (першай і другой хвалі)

*Міграцыя індаеўрапейцаў на тэрыторыю сучаснай Беларусі*

З якіх напрамкаў на беларускія землі ішлі міграцыі першай і другой хвалі індаеўрапейцаў?

З'яўленне земляробства і жывёлагадоўлі на тэрыторыі Беларусі разам з пранікненнем сюды новага насельніцтва стала самай значнай падзеяй першабытнай эпохі.

## ПЕРШАБЫТНЫЯ ШАХЦЁРЫ БЕЛАРУСІ



*Малюнак-рэканструкцыя шахты. 2-е тыс. да н. э. Каля пас. Краснасельскі*

Рассяліўшыся на тэрыторыі Беларусі, індаеўрапейцы вырашылі праблему нястачы сыравіны для вырабу сякер, якія былі жыццёва неабходныя ў лясным краі. Каля сучаснага пасёлка Краснасельскі Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці перасяленцы знайшлі буйное радовішча якаснага крэменю і ўручную стварылі тысячы шахтаў (глыбіня — 6 м, дыяметр — 2 м).

Побач пачалі работу майстэрні, асноўнай прадукцыяй якіх і сталі сякеры. Варта адзначыць высокі ўзровень майстэрства шахцёраў, якія працавалі каля тысячы гадоў, пакуль патрэба ў крэмені не знікла.



*Бюст краснасельскага шахцёра. Антрапалагічная рэканструкцыя*

**7. Ад радавой абшчыны да суседскай.** Міграцыі насельніцтва паступова разбуралі сувязі паміж родзічамі. Падчас перасялення асобныя плямёны і роды, што ў іх уваходзілі, сяліліся ў розных месцах, мяшаліся з іншымі родамі. Апроч гэтага, у выніку шырокага распаўсюджання металічных прылад працы ў радавой абшчыне вырасла роля парнай сям'і. Невялікая (малая) сям'я была здольная самастойна забяспечыць сябе прадуктамі, пабудаваць жытло, абараніцца ад дзікіх звяроў без дапамогі ўсяго радавога калектыву. Усё гэта прывяло да распаду радавой і з'яўлення **суседскай абшчыны**.

**Суседская абшчына** — форма арганізацыі супольнасці людзей, якая складаецца з некалькіх сем'яў, што пражываюць на адной тэрыторыі, але вядуць асобную гаспадарку.

Агульнае і індывідуальнае ў суседскай абшчыне

Адметнай рысай суседскай абшчыны было спалучэнне індывідуальнага (сямейнага) і калектыўнага (абшчыннага) карыстання зямлёй. Сем'і вялі ўласную гаспадарку, апрацоўвалі асобны ўчастак зямлі сваімі прыладамі працы і адпаведна самі распараджаліся выробленымі прадуктамі. Пры гэтым захоўвалася агульнае валоданне зямлёй і пашамі, існавалі абшчынныя органы кіравання. Суседская абшчына сумесна адказвала за злачынствы сваіх членаў, выступала ў адносінах з іншымі супольнасцямі.

Сацыяльныя змены на тэрыторыі Беларусі

Распад радавых абшчын на тэрыторыі Беларусі паскараўся з пераходам да вытворчай гаспадаркі. Індаеўрапейцы, прыйшоўшы, мяшаліся з мясцовымі родамі, стваралі новыя аб'яднанні. Але сапраўдны пераход ад радавой да суседскай абшчыны ў Беларусі адбыўся ўжо ў жалезным веку. Дзякуючы ўдасканаленню прылад працы раслі вытворчыя магчымасці земляробства і жывёлагадоўлі, павялічваўся абмен, у выніку міжплемянных сутыкненняў з'яўлялася ваенная здабыча — усё гэта вяло да ўзрастання ролі асобных (малых) сем'яў. Адначасова вырасла значэнне і родаплемянной знаці, якая пачала перадаваць сваё высокае становішча ў спадчыну. Абазначыўся новы важны этап у гісторыі як усяго чалавецтва, так і Беларусі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Прылады працы вылучылі чалавека з жывёльнага свету, паспрыялі пераадоленню сур'ёзнай пагрозы яго існаванню і стварылі магчымасці для далейшага прагрэсіўнага развіцця. На тэрыторыі Беларусі адбываліся такія самыя працэсы, што і ў іншых рэгіёнах Еўропы і свету. Найважнейшай падзеяй старажытнай гісторыі Беларусі стала рассяленне ў нашым краі індаеўрапейцаў. Такім чынам, ужо з канца новага каменнага веку беларускія землі былі ўключаны ў агульнаеўразійскую культурную прастору. Пераход да вытворчай гаспадаркі, а пасля пачатак выкарыстання вырабаў з металаў адбіліся на ўсіх баках жыцця чалавецтва і прывялі да стварэння першых цывілізацый і дзяржаў.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
| --- | --- |
| 9–3-е тыс. да н. э. — паступовы пераход да вытворчай гаспадаркі (неалітычная рэвалюцыя) ў розных рэгіёнах | Сярэдзіна 3-га тыс. да н. э. — узнікненне жывёлагадоўлі і земляробства |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Як на працягу каменнага веку змяняліся прылады працы і тэхналогіі іх вырабу?
2. Ці маюць рацыю гісторыкі, якія называюць пераход да вытворчай гаспадаркі рэвалюцыяй? Пералічыце наступствы неалітычнай рэвалюцыі. Якое значэнне яна мела для чалавечай цывілізацыі?
3. Складзіце схему «Наступствы адкрыцця металургіі». Выкарыстайце ў схеме наступныя словы: апрацоўка зямлі, рамяство, зброя, гандаль, гарадзішча, марапалаўства, ваенныя канфлікты. Якія з вылучаных наступстваў вы лічыце найбольш значнымі? Сваё меркаванне растлумачце.
4. Якое значэнне мелі міграцыі ў старажытнасці?
5. Складзіце лагічны ланцужок, які адлюстроўвае прычыны і наступствы пераходу ад радавой абшчыны да суседскай.
6. Складзіце храналагічную табліцу найважнейшых дасягненняў чалавека на працягу першабытнай эпохі.
7. Складзіце тэзісы, якія пацвярджаюць вывад: *«На тэрыторыі Беларусі ў старажытнасці адбываліся тыя ж працэсы, што і ў іншых рэгіёнах Еўропы і свету».*

# § 4. Найстаражытнейшыя вераванні і мастацтва

ІДАЛ
РЭЛІГІЯ КУЛЬТУРА
МІФ АМУЛЕТ КУЛЬТ
МАСТАЦТВА ЖРЭЦ
ХРАМ СКУЛЬПТУРА
КУРГАН

**1. Асаблівасці светапогляду старажытных людзей.** Першабытныя людзі ўжо мелі ўяўленні пра свет, які іх атачаў, і пра сілы, якія кіруюць светам і чалавекам. Пра існаванне гэтых уяўленняў сведчаць археалагічныя знаходкі. Пахаванні памерлых, рэшткі ахвярапрынашэнняў, разнастайныя прадметы культавага характару пацвярджаюць, што людзі спакон веку імкнуліся знайсці адказы на пытанні, што такое жыццё, калі яно ўзнікае і чаму заканчваецца.

Уяўленні старажытных людзей пра навакольны свет

Асаблівасцю светапогляду старажытнага чалавека было тое, што ён не бачыў розніцы паміж аб'ектыўным і суб'ектыўным, паміж дзеяннем і сімвалічным рытуалам. Напрыклад, пападанне дзідай у выяву жывёлы ў працэсе рытуалу перад паляваннем успрымалася як прадказанне ўдалага палявання.

З курса грамадазнаўства ўспомніце, што такое светапогляд.

Прымітыўныя ўяўленні першабытных людзей пра свет, прыроду, грамадства, чалавека, законы жыцця знайшлі адлюстраванне ў **міфалогіі**. Старажытныя людзі не падзялялі міф і рэчаіснасць. Для іх міф быў такі ж рэальны, як учарашняе паляванне або заўтрашні дзень.

**Міфалогія** — форма грамадскай свядомасці, спосаб тлумачэння свету, характэрны для ранніх стадый грамадскага развіцця.

Міфалогіі было ўласціва «ачалавечванне» сіл прыроды. На думку першабытнага чалавека, асновай

Правообладатель Издательский центр БГУ

усяго, што адбывалася вакол, у тым ліку і з ім, з'яўляўся вынік дзеяння вышэйшых сіл (багоў, лесуноў, русалак і г. д.).

Асаблівасцю першабытнай культуры з'яўлялася гармонія чалавека і прыроды. Чалавек яшчэ не цалкам аддзяліўся ад жывёльнага свету, адчуваў сябе яго часткай. Гэтая непарыўнасць прыроднага і сацыяльнага адбілася на культуры і светапоглядзе першабытнага чалавека.

**Зараджэнне першабытных вераванняў**

**2. Першабытныя вераванні.** Першыя ўяўленні пра сябе і навакольную прыроду ў чалавека з'явіліся ў эпоху палеаліту. Ад бяссілля перад прыродай узнікалі фантастычныя здагадкі. Пра зараджэнне рэлігійных уяўленняў у людзей сведчаць знойдзеныя пахаванні неандэртальцаў, якія хавалі памерлых у ямах-магілах. Разам з рэшткамі людзей археолагі знаходзяць косткі жывёл і прылады працы. Гэта сведчыць пра тое, што неандэртальцы мелі пэўнае ўяўленне пра замагільнае жыццё і рабілі пахавальныя абрады.

> Назавіце прычыны ўзнікнення першабытных вераванняў.

У першабытных людзей існавала дужа цьмянае ўяўленне пра смерць: першапачаткова яны не аддзялялі рэальны свет ад «тагабочнага». Пастуова складваўся страх перад мерцвякамі, з якога вынікалі абрады ўлагоджвання нябожчыкаў. Так фарміраваўся прымітыўны культ мёртвых. Пасля ўзнікаюць і іншыя культы: маці-зямлі, агню, сонца, племянных правадыроў і інш.

Найважнейшымі вераваннямі першабытных людзей лічацца анімізм, фетышызм, татэмізм, магія.

**Вера ў існаванне душы і духаў**

*Анімізм* (ад лац. душа, дух) — вера ў існаванне душы і духаў, заключаных у прадметах і з'явах, вера ў адушаўлёнасць прыроды. Першабытны чалавек разглядаў прыроду як нешта, што мае волю, жаданні, памкненні і г. д., з чаго вырасла перакананне, што ўсе прадметы і з'явы апроч бачнай маюць і нябачную, духоўную прыроду.

*Фетышызм* (ад фр. талісман, амулет, ідал) — пакланенне неадушаўлёным прадметам, якім прыпісваюць звышнатуральныя ўласцівасці. Гэта адзін з элементаў светаўспрымання чалавека, які з'яўляецца складнікам практычна ўсіх рэлігій, ад найстаражытнейшых і да сучасных развітых сістэм. Фетышы як прадметы і аб'екты рэлігійнага пакланення падзяляюць на два асноўныя віды. Да першага адносяць прыродныя аб'екты: горы, скалы, уцёсы, камяні, пячоры, рэкі, крыніцы, гаі, дрэвы, асобныя часткі цел жывёл. Да другога — разнастайныя вырабы чалавека (зброя, амулеты, прылады працы, талісманы, крыжы), а таксама аб'екты і прадметы, якія належалі людзям, шанаваным як святыя (кій, посуд і інш.).

Пакланенне неадушаўлёным прадметам

*Татэмізм* (на мовах індзейцаў Паўночнай Амерыкі «ататэм» — «яго род») — вера ў звышнатуральную роднасць паміж чалавечымі групамі (род, племя) і жывёлай, часам раслінай, а таксама з'явамі прыроды і неадушаўлёнымі прадметамі. У аснове ляжыць культ так званага татэма. Татэм — жывёла або расліна — успрымаўся як рэальны продак, ад якога залежала жыццё і дабрабыт племені, роду або асобнага чалавека. Лічыцца, што татэмізм цесна звязаны з гаспадарчай дзейнасцю чалавека — паляваннем і збіральніцтвам. Жывёлы і расліны, якія давалі людзям магчымасць існаваць, рабіліся аб'ектамі пакланення.

Вера ў роднасць з жывёльным і раслінным светам

*Магія* (чарадзейства, вядзьмарства, варажэнне і інш.) — гэта сукупнасць дзеянняў і абрадаў, якія робяцца з мэтай паўплываць на з'явы прыроды, жывёл або чалавека. Яна ўключала ў сябе словы (заклёны, замовы, малітвы), прадметы (амулеты, талісманы, абярэгі) і разнастайныя рытуальныя дзеянні. Выканаўцамі магічных абрадаў звычайна выступалі жрацы, знахары, варажбіты, вядзьмаркі і інш.

Вера ў звышнатуральныя здольнасці чалавека

Якія элементы старажытных вераванняў сустракаюцца ў наш час?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Рэлігія** — сістэма поглядаў і ўяўленняў, заснаваная на веры ў звышнатуральныя сілы і іх уплыў на чалавека.

**Язычніцтва** — рэлігійныя вераванні, якім уласцівыя мнагабожжа (політэізм) і адухаўленне прыроды, адлюстраванае ў культах багоў, духаў, продкаў.

**Рэлігія**, што паўстала на пэўнай стадыі развіцця чалавецтва, фарміравалася як сістэма ў язычніцкай форме. **Язычніцтва**, якое ўяўляла сабой сукупнасць ранніх формаў рэлігіі, складвалася разам з фарміраваннем народа, яго культуры (філасофіі, маралі, мастацтва).

**3. Зараджэнне мастацтва.** Тое, што мы называем першабытным мастацтвам, зараджалася як частка жыццядзейнасці чалавека, у якой непарыўна злучаліся праца і зносіны, пазнанне навакольнага свету і самапазнанне, магічныя абрады і мастацкая творчасць. Усе віды духоўнай дзейнасці былі звязаныя з мастацтвам і выражаліся праз яго. Першабытнае мастацтва насіла сінкрэтычны характар — мастацтва, міфалогія, рэлігія і штодзённае жыццё былі непарыўна знітаваныя, не аддзяляліся адно ад другога.

Характэрнай рысай першабытнага мастацтва быў асаблівы інтарэс да звера, што тлумачыцца залежнасцю чалавека ад жывёльнага свету. У дадзены перыяд выяве чалавека надавалі не такое важнае значэнне ў параўнанні з мастацтвам наступных эпох, дзе чалавек будзе адыгрываць цэнтральную ролю, а ўсё астатняе зробіцца толькі фонам, на якім разгортваецца яго дзейнасць.

**Першыя прыклады мастацтва**

Першыя прыклады мастацтва першабытных людзей адносяцца да эпохі палеаліту. Культура гэтага перыяду характарызуецца вялікай разнастайнасцю каменных прылад працы. Менавіта ў гэтай культуры ўпершыню назіраецца выхад за межы выключна функцыянальнага прызначэння прылад працы. На многіх каменных нажах і скрабках ёсць сляды вохры (фарбавальнага рэчыва), а таксама крыжыкі, кропкі і лініі, прамаляваныя ў пэўным парадку, якія нагадваюць нейкі арнамент.

Чаму наскальныя малюнкі палеаліту ствараліся ў цяжкадаступных пячорах?

З цягам часу малюнкі рабіліся ўсё больш дасканалыя, як і тэхналогія іх выканання. Пра гэта сведчаць знойдзеныя ўнікальныя роспісы сцен у пячорах. Так, у пячоры Альтаміра (Іспанія) знойдзены

вялікія па памеры каляровыя выявы жывёл з яўнай дэталізацыяй. Мастакі рупліва прамалёўвалі, напрыклад, вочы звяроў. У цяперашні час толькі ў Францыі знойдзена каля ста такіх пячор. Найбольш вядомая сярод іх — Ласко. На тэрыторыі Расіі асабліва знакамітая Капава пячора на Паўднёвым Урале, дзе было знойдзена больш за тры дзясяткі малюнкаў жывёл, выкананых чырвонай фарбай.

«Зала быкоў» у пячоры Ласко мае працягласць 17 м, шырыню 6 м, вышыню да 7 м. Тут знаходзяцца выявы чатырох велізарных чорных быкоў, адзін з іх памерам больш за 5 м.



*Наскальны жывапіс. Палеаліт. Пячора Ласко. Францыя*

Як вы лічыце, чаму пячору Ласко часта называюць «Сіксцінскай капэлай першабытнага жывапісу»?

### У пошуках прыгажосці

Большасць палеалітычных выяў была прызначана для магічных мэт, аднак гэта не значыць, што яны не з'яўляюцца сапраўднымі творамі мастацтва. Майстэрства выканання, пластыка вобраза, здольнасць адбіраць і абагульняць характэрныя прыкметы звера, перадаваць яго рух — усё гэта дазваляе казаць пра мастацкую творчасць першабытных людзей. Чалавек ужо ў той далёкі час імкнуўся ўнесці ў сваё штодзённае жыццё прыгажосць. Прылады працы, зброю, разнастайныя прадметы побыту ўпрыгожвалі ўсялякімі выявамі і арнаментамі. Напрыклад, дзідакідалкі звычайна заканчваліся фігуркай або галавой жывёлы. У выглядзе жывёл пачалі ўвасабляць стыхіі прыроды, неба і зямлю. Сонца і неба найчасцей сімвалізавалі птушкі, ваду і падземны свет звязвалі са змеямі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

На стаянках Усходняй Еўропы археолагі знайшлі статуэткі жанчын, якія называюць «палеалітычнымі Венерамі». Адна з іх, выробленая з біўня маманта, была знойдзена на стаянцы Елісеевічы ў Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Асаблівую вядомасць набыла «Венера ў футравым камбінезоне», знойдзеная на беразе ракі Ангары (Расійская Федэрацыя).

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Венера Елісеевіцкая*



*Венера ў футравым камбінезоне*

Ёсць некалькі версій наконт прызначэння «палеалітычных Венер». Адна з іх — гэта характэрная для часу мацярынскай радавой абшчыны выява мацярынскіх продкаў, сімвал кроўнай сувязі членаў роду, увасабленне плоднасці.

1. *Даведайцеся, якія яшчэ існуюць версіі. Якая версія здаецца вам найбольш праўдападобнай? Выкажыце сваю здагадку пра прызначэнне «палеалітычных Венер».*
2. *Чаму «палеалітычныя Венеры» атрымалі такую назву?*

Важнае месца ў жыцці першабытных людзей займалі ўпрыгажэнні: галаўныя абручы, каралі, багата арнаментаваныя бранзалеты, пацеркі, разнастайныя падвескі. Упрыгажэнні выраблялі ў асноўным з костак і зубоў жывёл, бліскучых марскіх ракавін.

### Асаблівасці развіцця грамадства ў эпоху палеаліту

У перыяд сярэдняга каменнага веку ў людзей склалася членараздзельнае маўленне, што палегчыла абмен інфармацыяй і ўзбагаціла іх духоўнае жыццё. У гэты час жывапіс ужо адрозніваецца мастацкім зместам. Калі ў часы палеаліту мастакі проста малявалі жывёл, дык у часы мезаліту пераважалі ўжо сцэны палявання і спробы перадаць дынаміку падзеі.

Роспісы і петрогліфы (выбітыя або нанесеныя фарбай выявы на каменнай аснове) у той час, як правіла, выконвалі на адкрытых месцах: камянях і скалах. Мезалітычныя выявы ўяўляюць сабой шматфігурныя кампазіцыі: сцэны рытуальных дзеянняў, палявання і ўзброеных сутыкненняў, загону жывёлы, выклікання дажджу, збору мёду і да т. п. Некаторыя кампазіцыі былі значных памераў. Напрыклад, «Вялікі фрыз» у Іспаніі ўключае каля ста малюнкаў людзей і дзясяткі малюнкаў жывёл.

## Мастацтва эпохі неаліту

Пераход да вытворчай гаспадаркі ў перыяд неаліту істотна паўплываў на светапогляд старажытных людзей і мастацтва. У земляробаў вядучую ролю пачалі адыгрываць культы ўрадлівасці і маці-зямлі. Невыпадкова ў земляробчых культурах паўсюль прадстаўлены, асабліва на посудзе, арнаменты ў выглядзе накрыж заштрыхаваных палёў, якія сімвалізуюць засеянае поле; бягучых спіраляў, а таксама крыжоў, колаў, якія абазначаюць сонца і яго нябесны шлях; хвалістых ліній, што ствараюць вобраз вады, і г. д.



*Неалітычны сасуд. Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці*

У неаліце чалавек навучыўся абпальваць гліну, г. зн. упершыню стварыў матэрыял, якога не было ў прыродзе. Вытворчасць керамічных вырабаў у гэты перыяд была вельмі шырока распаўсюджана. Удаскональваліся ткацтва і гарбарства.

Неалітычнае мастацтва — гэта ўжо не хаатычна раскіданыя выявы фігур, а звязныя сцэны, кампазіцыі. Выявы малявалі не толькі на скалах і вялікіх камянях, але і на плітах грабніц.

### МЕСЦЫ НАНЯСЕННЯ ПЕРШАБЫТНЫХ МАЛЮНКАЎ

**палеаліт**
у цяжкадаступных частках пячор



**мезаліт**
на адкрытых месцах: скалах, буйны́х камянях



**неаліт**
на плітах грабніц



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Выява мужчыны з качкай на кераміцы. Неаліт. В. Юравічы. Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці*



*Выява на косці. Возера Вячэра. Любанскі раён Мінскай вобласці*

У Еўропе наскальныя роспісы падчас неаліту практычна зніклі. Тут шырокае развіццё атрымаў выраб і ўпрыгожванне глінянага посуду, а таксама дробная пластыка.

Важнай рысай мастацтва на тэрыторыі Беларусі ў перыяд неаліту стала частае выкарыстанне вобраза чалавека. Чалавечая постаць з'яўляецца на кераміцы («мужчына з качкай» на пасудзіне, знойдзенай каля стаянкі Юравічы Калінкавіцкага раёна), на косці (схематычныя выявы мужчын, адзін з якіх трымае ў руцэ рэч, падобную да сякеры, знаходка з воз. Вячэра ў Любанскім раёне), у выглядзе асобных скульптур (з дрэва і косці, знойдзены каля в. Асавец Бешанковіцкага раёна).

Яшчэ адно важнае новаўвядзенне на тэрыторыі Беларусі звязана са з'яўленнем і шырокім распаўсюджаннем керамікі, на якую наносілі разнастайныя арнаменты. Адбіткі грабянёў, шнура, наколкі, насечкі, ямкі, размешчаныя пэўным чынам, вертыкальныя лініі, касыя і рамбічныя кампазіцыі ўтрымлівалі ў сабе сімвалічны і магічны сэнс.

**Культавая архітэктура**

**4. Мастацтва эпохі металургіі.** У эпоху бронзы ўзнікла новая форма выяўлення ідэй і пачуццяў чалавека — культавая архітэктура. Асноўнай крыніцай культурных і мастацкіх каштоўнасцей сталі курганы, дзе захавалася вялізная колькасць разнастайных рэчаў для замагільнага жыцця.

Да ліку найбольш загадкавых з'яў першабытнага мастацтва належаць мегаліты — збудаванні з каменных, мінімальна апрацаваных камлыг, размешчаных у пэўным парадку. У Еўропе знойдзена каля 35 тысяч мегалітаў. Адным з самых славутых з'яўляецца Стоўнхэндж. Ён быў пабудаваны ў тыя часы, калі яшчэ не былі вынайдзены ні блок, ні кола. Будаўнікі маглі карыстацца толькі самымі прымітыўнымі інструментамі — драўлянымі каткамі і вяроўкамі. Для сваёй эпохі Стоўнхэндж уяўляў сабой неймаверна складанае



*Стоўнхэндж. Бронзавы век. Вялікабрытанія*

тэхнічнае збудаванне, таму што быў складзены з камянёў, якія важылі шмат тон.

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

У эпоху бронзы інтэнсіўна развівалася дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Галоўным матывам пры стварэнні і ўпрыгожванні разнастайных бронзавых вырабаў заставаліся жывёлы.

На тэрыторыі Беларусі ў бронзавым і асабліва ў жалезным веку з'яўляецца мноства ўпрыгажэнняў з медзі, бронзы і срэбра, а таксама з косці і бурштыну. Апроч магічнага сэнсу яны ўсё больш набывалі эстэтычныя і сацыяльныя функцыі.

## ФУНКЦЫІ ЎПРЫГАЖЭННЯЎ У СТАРАЖЫТНАСЦІ



**ЭСТЭТЫЧНЫЯ**

- рэалізаваць пачуццё прыгожага;
- дэкаратыўна дапоўніць касцюм, асабліва рытуальны або святочны

**САЦЫЯЛЬНЫЯ**

- прадэманстраваць прыналежнасць да пэўнага роду, племені;
- паказаць сацыяльны статус (знаць, атачэнне правадыра і інш.);
- паказаць на ўзрост і сямейнае становішча;
- прыцягнуць да сябе ўвагу навакольных

Ці актуальныя функцыі ўпрыгажэнняў на сучасным этапе?

Разам з развіццём вытворчай гаспадаркі расла патрэба ў розных забавах, спосабах баўлення часу. Ужо ў 2-м тыс. да н. э. на тэрыторыі Беларусі з'явіліся разнастайныя музычныя інструменты — жалейкі і свістулькі з птушыных костак, казіныя ражкі, берасцянкі і інш.

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Першабытнае мастацтва было цесна знітавана з рэлігійнымі ўяўленнямі чалавека і яго штодзённым жыццём. У першабытную эпоху сфарміраваліся ўсе віды выяўленчага мастацтва: графіка, жывапіс, скульптура, дэкаратыўнае мастацтва. Замацоўваючы ў бачных вобразах жыццёвы досвед і светаўспрыманне, старажытны чалавек паглыбляў і пашыраў свае ўяўленні пра рэальнасць, узбагачаў і развіваў свой духоўны свет. У развіцці першабытнага мастацтва на тэрыторыі Беларусі праяўляюцца тыя ж тэндэнцыі, што і ў іншых рэгіёнах Еўропы і свету.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
| --- | --- |
| 40–35 тыс. гадоў таму — 10-е тыс. да н. э. (позні палеаліт) — зараджэнне рэлігійных вераванняў і першабытнага мастацтва | 35 тыс. гадоў таму — 10-е тыс. да н. э. (позні палеаліт) — зараджэнне рэлігійных вераванняў і першабытнага мастацтва |

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Як першабытны чалавек тлумачыў навакольны свет? У чым заключаліся асаблівасці светапогляду старажытных людзей?
2. На падставе якіх гістарычных крыніц вучоныя робяць вывад, што першабытным людзям былі ўласцівыя пэўныя рэлігійныя ўяўленні?
3. У чым вы бачыце прычыну ўзнікнення рэлігійных уяўленняў у старажытных людзей?
4. Якія знаходкі археолагаў сведчаць пра развіццё першабытнага мастацтва на тэрыторыі Беларусі?
5. Растлумачце, як звязаныя першабытныя вераванні і першабытнае мастацтва.
6. Аргументуйце наступныя вывады:
   — у развіцці першабытнага мастацтва на тэрыторыі Беларусі праяўляюцца тыя ж тэндэнцыі, што і ў іншых рэгіёнах Еўропы і свету;
   — развіццё мастацтва ў першабытным грамадстве было звязана з развіццём эканомікі.

# § 5–6. Асаблівасці найстаражытнейшых цывілізацый

СТАРАЖЫТНАЯ ГРЭЦЫЯ ГРАМАДЗЯНІН
АНТЫЧНАСЦЬ СТАРАЖЫТНЫ РЫМ
ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ ХРЫСЦІЯНСТВА
ПОЛІС СТАРАЖЫТНЫ ЎСХОД
ВЯЛІКАЯ ГРЭЧАСКАЯ КАЛАНІЗАЦЫЯ
РЭСПУБЛІКА МАНАРХІЯ

**1. Узнікненне першых лакальных цывілізацый у свеце.** Прымнажэнне вопыту выкарыстання прыродных рэсурсаў, удасканаленне спосабаў вытворчасці, ускладненне адносін паміж людзьмі — усё гэта прывяло да з’яўлення цывілізацый.

Найважнейшай рысай лакальных цывілізацый з’яўлялася ўзнікненне асаблівай формы грамадскага ладу — **дзяржавы.** Цяпер асноўныя задачы захавання і далейшага развіцця грамадства брала на сябе вярхоўная ўлада. Яна, у сваю чаргу, накладала на насельніцтва пэўныя абавязкі ў выглядзе падаткаў, прымусовых работ, законаў, парушэнне якіх цягнула за сабой пакаранне.

З прычыны нераўнамернасці гістарычнага развіцця пераход чалавецтва ад першабытнасці да цывілізацыі

### ПРЫКМЕТЫ ПЕРАХОДУ ДА ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

- будаўніцтва гарадоў;
- падзел людзей на сацыяльныя пласты;
- узнікненне дзяржаў;
- вынаходства пісьменства



**Ад першабытнасці да цывілізацыі**

Успомніце значэнне паняццяў «цывілізацыя», «лакальная цывілізацыя».

**«Рачныя» цывілізацыі**

**Дзяржава** — сістэма ўлады, якая забяспечвае кіраванне грамадствам на пэўнай тэрыторыі, прымае для гэтага законы і фарміруе органы ўлады.

Правообладатель Издательский центр БГУ

не быў адначасовы ва ўсіх рэгіёнах, заселеных чалавекам, а меў ачаговы характар. Першыя цывілізацыі ўзніклі каля буйны́х рэк у рэгіёне Бліжняга Усходу. У 4-м тыс. да н. э. незалежна адна ад адной яны з’явіліся ў Егіпце і Месапатаміі. У сярэдзіне 3-га тыс. да н. э. афармілася старажытнаіндыйская цывілізацыя, а ў сярэдзіне 2-га тыс. да н. э. — старажытнакітайская.

Асновай гаспадаркі старажытнаўсходніх цывілізацый было арашальнае земляробства. Урадлівыя глебы, сонечнае цяпло, арганізацыя сістэмы склада-




*Цывілізацыі 4–1-га тыс. да н. э.*

Ці згодныя вы з тым, што Старажытны Усход можна справядліва назваць калыскай чалавечай цывілізацыі?
У чым падабенства геаграфічнага становішча старажытных цывілізацый?
Ці ўваходзіла тэрыторыя Беларусі ў раён пашырэння цывілізацый 4–1-га тыс. да н. э.?

ных ірыгацыйных работ спрыялі развіццю высокапрадукцыйнага земляробства, якое дазваляла атрымаць значны аб'ём лішкаў прадукту. Яго можна было выкарыстаць для стварэння моцнай арміі, утрымання чыноўнікаў і жрацоў, падтрымання высокага статусу правадыра.

**Цывілізацыі Антычнасці**

З'яўленне ачагоў цывілізацыі ў Еўропе пачалося ў рэгіёне Міжземнамор'я, спачатку ў Старажытнай Грэцыі, пасля ў Старажытным Рыме. Час іх існавання — ад узнікнення грэчаскіх полісаў (VIII ст. да н. э.) да падзення Заходняй Рымскай імперыі (476 г.) — аб'ядноўваецца агульным паняццем **«Антычнасць»** (ад лац. «старажытны»).

**Антычнасць** — гісторыя і культура Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма.

**Крыніцы і формы рабства**

**2. Рабства ў старажытных цывілізацыях.** Ускладненне структуры грамадства, рост значэння вярхоўнай улады, назапашванне багаццяў, міграцыі насельніцтва — усё гэта вяло да ваенных канфліктаў. Адным з наступстваў войнаў быў захоп палонных, якіх ператваралі ў рабоў. Першапачаткова іх размяркоўвалі паміж асобнымі сем'ямі і прымушалі выконваць самую складаную гаспадарчую работу. І хоць рабы не мелі ніякіх правоў, іх разглядалі як малодшых членаў патрыярхальных сем'яў: яны маглі жыць у адным доме з гаспадарамі, мець уласныя сем'і. Такую форму залежнасці называюць *патрыярхальным рабствам*.

**РАБСТВА**

| ПАТРЫЯРХАЛЬНАЕ | КЛАСІЧНАЕ |
| --- | --- |
| Раб — чалавек, абмежаваны ў правах | Раб — прадмет уласнасці, рэч, якая належыць свабоднаму чалавеку |

Назавіце асноўныя адрозненні становішча рабоў пры розных формах рабства.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**КРЫНІЦЫ РАБСТВА**

- ваенны палон;
- пірацтва і разбой;
- даўгавая кабала;
- самапродаж у рабства;
- занявольванне за злачынства;
- нараджэнне ў рабстве

З развіццём грамадства з'яўляліся новыя крыніцы рабства. Значэнне рабскай працы ў некаторых рэгіёнах свету, дзе гэта дазвалялі кліматычныя ўмовы, працягвала ўзрастаць. Там, дзе рабоў не трэба было забяспечваць дарагім адзеннем, трывалым цёплым жытлом, іх праца аказвалася эканамічна апраўданая. Рабоў актыўна выкарыстоўвалі на сельскагаспадарчых работах у дзяржаўных або храмавых гаспадарках, а таксама на маштабных будоўлях старажытнасці. Паступова рабства ператварылася ў адзін з элементаў эканамічнай сістэмы старажытных цывілізацый. Праца рабоў выкарыстоўвалася ў дзяржавах Старажытнай Месапатаміі, Старажытным Егіпце, Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме. У параўнанні з дзяржавамі антычнага свету на Старажытным Усходзе рабы складалі адносна невялікую частку грамадства, і ўдзельная вага іх працы была нязначная.

На думку гісторыкаў, перабольшваць эканамічнае значэнне рабства ў старажытным свеце не варта. Асноўную масу матэрыяльных каштоўнасцей складалі вольныя абшчыннікі, чыя праца была больш эфектыўная і якасная.

**Старажытны Егіпет — адна з найстаражытнейшых цывілізацый**

**3. Асаблівасці арганізацыі ўлады, грамадства і эканомікі Старажытнага Усходу.** Адна з найстаражытнейшых цывілізацый чалавецтва сфарміравалася ў Старажытным Егіпце. Гэтаму спрыялі асаблівыя прыродныя ўмовы — штогадовыя разлівы Ніла, якія аднаўлялі ўрадлівы слой глебы. Але скарыстацца «ласкай багоў» можна было пры ўмове правядзення складаных ірыгацыйных работ, што, у сваю чаргу, павышала ролю жрацоў і чыноўнікаў, якія кіравалі гэтым працэсам. У 4-м тыс. да н. э. вакол храмаў пачалі фарміравацца адміністрацыйныя вобласці — номы. На мяжы 4–3-га тыс. да н. э. адбылося аб'яднанне номаў у Верхнім і Ніжнім Егіпце. Вайна паміж імі скончылася перамогай Менеса (Міны) — валадара Верхняга Егіпта.



*Вялікія піраміды ў Гізе — першы цуд свету*

Назавіце старажытныя збудаванні, якія ўваходзяць у спіс сямі цудаў свету.

Адметнымі асаблівасцямі створанай у выніку адзінай дзяржавы былі развіты бюракратычны апарат і неабмежаваная ўлада яе кіраўніка — фараона. Старажытны Егіпет быў першым у гісторыі прыкладам старажытнаўсходняй **дэспатыі**. Уся выробленая ў краіне прадукцыя лічылася ўласнасцю дзяржавы і правадыра, які яе ўвасабляў. Ад імя фараона яе цэнтралізавана размяркоўвалі паміж насельніцтвам у адпаведнасці з надзвычай строгай сістэмай нормаў. Такім чынам, уласнасць была вельмі цесна звязана з уладай, што ў цэлым было ўласціва дзяржавам Старажытнага Усходу.

Наглядным сведчаннем магутнасці валадароў Старажытнага Егіпта была пабудова грандыёзных пахавальняў — знакамітых пірамід.

### Характэрныя рысы старажытнаўсходняй дэспатыі

**Дэспатыя** — форма дзяржаўнага кіравання, пры якой вярхоўная ўлада засяроджана ў руках абсалютнага валадара, што самавольна кіруе краінай і лёсам сваіх падданых.

**4. Гарады-дзяржавы і старажытныя імперыі.** У далінах рэк Тыгр і Еўфрат знаходзілася яшчэ адна вялікая цывілізацыя Старажытнага свету — Месапатамія (Міжрэчча). Тут у розны час існавалі царствы Шумера, Акада, Вавілоніі і Асірыі.

### Старажытная Месапатамія

#### ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАЙ МЕСАПАТАМІІ

- **Узнікненне гарадоў-дзяржаў у шумераў** (канец 4-га тыс. да н. э.)
- **Акадскае царства; дзяржавы познешумерскага перыяду** (XXIV–XX стст. да н. э.)
- **Стараавілонскае царства** (XIX–XVI стст. да н. э.)
- **Асірыйскае царства** (XVI–VII стст. да н. э.)
- **Навававілонскае царства. Заваяванне Вавілона Персіяй** (VII–VI стст. да н. э.)

У сярэдзіне VI ст. да н. э. тэрыторыі ўсіх блізкаўсходніх цывілізацый падпарадкавала Персідская імперыя. Персам удалося стварыць стройную сістэму кіравання заваяванымі землямі. Упершыню ў гісторыі з'явілася **імперыя**, якая выйшла за межы адной цывілізацыі.

**Імперыя** — буйна́я дзяржава на чале з імператарам, якая абапіраецца ў сваёй знешняй палітыцы на арганізаваную армію і вайсковае саслоўе.

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Персідская дзяржава ў канцы VI — пачатку V ст. да н. э.*

Тэрыторыі якіх старажытных цывілізацый увайшлі ў склад Персідскай імперыі? Карыстаючыся дадатковымі крыніцамі інфармацыі, даведайцеся, дзякуючы чаму персідскім валадарам удавалася на працягу амаль двухсот гадоў утрымліваць кантроль над велізарнай падпарадкаванай тэрыторыяй.

**Ад дэспатыі да поліса**

**5. Арганізацыя старажытнагрэчаскага поліса.** Адна з найважнейшых асаблівасцей старажытнагрэчаскай цывілізацыі заключалася ў стварэнні яе адным народам — грэкамі, або элінамі. Старажытная Грэцыя ніколі не была адзінай дзяржавай. У гісторыі гэтага рэгіёна можна вылучыць некалькі перыядаў, кожны з якіх меў свае асаблівасці. Пер-

шыя дзяржаўныя ўтварэнні ўзніклі на востраве Крыт і на поўдні мацерыковай часткі Грэцыі (пераважна на паўвостраве Пелапанэс). Паводле сваёй палітычнай і сацыяльнай структуры яны былі падобныя да дэспатый усходніх цывілізацый (неабмежаваная ўлада правадыра, разгалінаваны дзяржаўны апарат, існаванне палацавых і храмавых гаспадарак і да т. п.). У канцы XIII — пачатку XII ст. да н. э. крыта-мікенская цывілізацыя была разбурана плямёнамі грэкаў-дарыйцаў, што ўварваліся на Балканскі паўвостраў. Гэта прывяло да запусцення гарадоў, заняпаду рамёстваў, спынення будаўніцтва каменных палацаў і крэпасцей, знікнення пісьменства.

### ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ

- **Крыта-мікенскі перыяд** (мяжа 3–2-га тыс. да н. э. — XII ст. да н. э.)
- **«Цёмныя вякі»** (XI–IX стст. да н. э.)
- **Архаічная Грэцыя** (VIII–VI стст. да н. э.)
- **Класічная Грэцыя** (V–IV стст. да н. э.)
- **Элінізм** (канец IV — I ст. да н. э.)

**Характэрныя рысы полiснага ладу**

Напрыканцы «цёмных вякоў», што насталі пасля крыта-мікенскага перыяду, у Грэцыі зноў узнікаюць дзяржавы. Своеасаблівай формай арганізацыі старажытнагрэчаскага грамадства робіцца поліс, які спалучае ў сабе дзяржаву і абшчыну. *Поліс* уяўляў сабой невялікі горад-дзяржаву з вясковай акругай. Яго грамадзянамі з’яўляліся свабодныя мужчыны з ліку карэнных жыхароў, якія мелі ва ўласнасці зямельны ўчастак. Грамадзянін старажытнагрэчаскага поліса меў права ўдзельнічаць у дзяржаўным кіраванні — абіраць і быць абраным у органы ўлады. У той жа час ён павінен быў няўхільна выконваць і свае абавязкі, звязаныя з кіраваннем і нясеннем ваеннай

Правообладатель Издательский центр БГУ

службы. Такім чынам, правы і абавязкі грамадзяніна былі шчыльна знітаваныя. Страта грамадзянства або выгнанне з поліса былі самым страшным пакараннем для грэка. Апроч грамадзян у полісе жылі вольныя жыхары (перасяленцы з іншых тэрыторый, жанчыны), а таксама рабы. Яны не мелі грамадзянскіх правоў і не дапускаліся да ўдзелу ў кіраванні дзяржавай. Эканамічнай асновай поліса было рабства класічнага тыпу.

### Вялікая грэчаская каланізацыя

Нарастанне патрэбы полісаў у зямлі, сыравіне, рабочай сіле спрыяла *Вялікай грэчаскай каланізацыі* (VIII–VI стст. да н. э.). У яе выніку грэкі заснавалі каля 300 калоній і рассяліліся па ўсім Міжземнамор'і і ўзбярэжжы Чорнага мора.




*Вялікая грэчаская каланізацыя (VIII–VI стст. да н. э.)*

Абапіраючыся на картасхему, выкажыце сваю думку, чаму грэкі ў меншай ступені каланізоўвалі паўднёвае ўзбярэжжа Міжземнага мора.

Афіны і Спарта — два тыпы поліснага ладу

Найбуйнейшымі полісамі былі Афіны, Спарта, Фівы, Карынф, Мілет і інш. Кожны з іх імкнуўся захаваць сваю свабоду, самастойнасць і незалежнасць, таму ў Старажытнай Грэцыі так і не была створана адзіная дзяржава. Полісы не былі аднолькавыя па сваёй будове, характары ўлады і арганізацыі кіравання. Калі ў Афінах усталявалася *дэмакратычная* (ад лац. «народаўладдзе») сістэма з верхавенствам прынцыпаў грамадзянскасці, законнасці і палітычнай свабоды, дык Спарта ўяўляла сабой поліс *алігархічнага* (ад лац. «улада нямногіх») тыпу з моцнай ваеннай арганізацыяй.

Поспехі старажытнарымскай цывілізацыі

**6. Старажытнарымская абшчына і дзяржаўная ўлада.** Старажытнарымская цывілізацыя дасягнула поспехаў у самых розных галінах, вонкавым выражэннем якіх стала стварэнне дасканалай вайсковай арганізацыі, што дазволіла зацвердзіць панаванне Рыма на велізарнай тэрыторыі. У створанай рымлянамі імперыі асаблівае значэнне набылі дзяржаўныя інстытуты і права, дасягнулі дасканаласці вайсковая справа і будаўніцтва, квітнелі многія рамёствы і галіны навукі.

Старажытнарымская грамадзянская абшчына

На працягу ўсёй гісторыі Старажытнага Рыма, ад эпохі цароў да позняй імперыі, захоўвалася рымская грамадзянская абшчына, якая не была закамянелым утварэннем, а змянялася з развіццём дзяржавы. Першапачаткова паўнапраўнымі грамадзянамі была толькі невялікая група мужчын, якія прыйшлі з заснавальнікам Рыма Ромулам на рымскія пагоркі. Ад іх утварыліся патрыцыі (ад лац. «айцы»), якія склалі пануючы слой у рымскай абшчыне і сфарміравалі раду старэйшын — сенат (ад лац. «старац»). Астатнія свабодныя члены абшчыны належалі да плебеяў. Некалькі стагоддзяў працягвалася барацьба плебеяў за атрыманне грамадзянскіх правоў, перш за ўсё за права на ўдзел у кіраванні дзяржавай. Пасля іх перамогі ў III ст. да н. э. адбылася кансалідацыя рымскага народа

Правообладатель Издательский центр БГУ

і канчаткова склалася рымская грамадзянская абшчына.

### ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАГА РЫМУ

**Царскі Рым** (сярэдзіна VIII — канец VI ст. да н. э.) → **Рымская рэспубліка** (VI — канец I ст. да н. э.) → **Рымская імперыя** (I ст. да н. э. — V ст. н. э.)

Які крытэрый пакладзены ў аснову перыядызацыі Старажытнага Рыма? Дайце азначэнне паняццяў «манархія», «рэспубліка».

Рымская імперыя была дастаткова моцнай дзяржавай. Аднак пад уплывам унутраных супярэчнасцей і знешніх нападаў імперыя ў V ст. н. э. пала.

**7. Беларускія землі ў эпоху Антычнасці.** Хранлагічныя рамкі перыяду Антычнасці адпавядалі перыяду жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі.

Звесткі пра беларускія землі толькі зрэдку траплялі на старонкі твораў антычных аўтараў, часта набываючы фантастычныя рысы.

Упершыню пра насельніцтва беларускіх зямель, магчыма, згадаў у сваёй вядомай «Гісторыі» Герадот (V ст. да н. э.). Расказваючы пра народы Паўночнага Прычарнамор'я, якія адрозніваліся звычаямі і ладам жыцця ад скіфаў, старажытнагрэчаскі вучоны называе іх неўрамі. Дыскусіі наконт таго, кім былі тыя народы, не сціхаюць. Пад неўрамі разумеюць і ранніх славян, і балтаў, і кельтаў. Гэта менавіта ў іх Герадот і іншыя антычныя аўтары заўважылі здольнасць кожнага чалавека раз на год ператварацца на некалькі дзён у ваўка.

У перыяд жалезнага веку, нягледзячы на аддаленасць ад асноўных цэнтраў старажытнарымскай цывілізацыі, беларускія землі мелі ўстойлівыя кантакты з Прычарнамор'ем (Скіфіяй), Прыбалтыкай,

Волга-Окскім міжрэччам, кельцкім светам і пазней правінцыйна-рымскімі культурамі Сярэдняй Еўропы.

У першай палове 1-га тыс. н. э. ва ўмовах умацавання і пашырэння межаў Рымскай імперыі яе ўплыў адчулі і беларускія землі, што адбілася, напрыклад, у распаўсюджанні рымскіх манет.

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

На тэрыторыі Беларусі часта знаходзяць рымскія манеты, як адзінкавыя асобнікі, так і цэлыя скарбы. Большасць знаходак выяўлены ў заходніх абласцях рэспублікі — Брэсцкай і Гродзенскай. Адным з найбуйнейшых па колькасці рымскіх манет з'яўляецца Алекшыцкі скарб, знойдзены ў Бераставіцкім раёне Гродзенскай вобласці.

Здзейсніце віртуальны тур у гісторыю грашовага абарачэння «перыяду рымскага дэнарыя», наведаўшы Музей грошай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (https://moneymuseum.by).

1. *Чым можна растлумачыць той факт, што большасць рымскіх скарбаў знойдзены на тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей?*
2. *Калі быў знойдзены скарб у Бераставіцкім раёне Гродзенскай вобласці? Што ён змяшчаў і дзе захоўваецца?*
3. *Ці вядомыя выпадкі знаходжання манет іншых старажытных дзяржаў на тэрыторыі Беларусі?*



*Алекшыцкі манетна-рэчавы скарб*

**8. Асноўныя культурныя дасягненні старажытных цывілізацый.** Цывілізацыі Старажытнага Усходу і Антычнасці пакінулі пасля сябе багатую і разнастайную культурную спадчыну, якая аказала значны ўплыў на станаўленне сучаснай сусветнай цывілізацыі.

Развіццё пісьменства і культуры ў найстаражытнейшых цывілізацыях

Адным з найважнейшых іх дасягненняў стала вынаходства пісьменства. Найбольш старажытнай лічыцца шумерская сістэма пісьма — *клінапіс*, што з'явіўся ў сярэдзіне 4-га тыс. да н. э. Асноўным матэрыялам для пісьма ў Міжрэччы была гліна.

Правообладатель Издательский центр БГУ

На мяжы 4–3-га тыс. да н. э. з'явілася старажытнаегіпецкая *іерагліфічная* пісьменнасць. Егіпцяне высякалі надпісы на камені і пісалі на папірусе.

У Старажытным Кітаі *іерагліфічная* пісьменнасць склалася ў пачатку 2-га тыс. да н. э. Кітайцы першымі пачалі выкарыстоўваць для пісьма паперу. Фінікійцы сталі стваральнікамі першага алфавіта (XI ст. да н. э.), які складаўся з 22 зычных знакаў-літар. Старажытнагрэчаскае пісьмо ўзнікла ў пачатку IX ст. да н. э. на аснове ўдасканаленага фінікійскага алфавіта. На базе грэчаскага пісьма рымляне стварылі свой алфавіт — лацінскі, якім карыстаюцца многія народы і ў наш час.

**ФІНІКІЙСКІ АЛФАВІТ**




**ГРЭЧАСКІ АЛФАВІТ**

Αα Ββ Γγ Δδ
Εε Ζζ Ηη Θθ
Ιι Κκ Λλ Μμ
Νν Ξξ Οο Ππ
Ρρ Σσς Ττ Υυ
Φφ Χχ Ψψ Ωω

Як грэкі ўдасканалілі фінікійскі алфавіт?

З'яўленне пісьменнасці спрыяла развіццю літаратуры. Да сусветных шэдэўраў можна аднесці месапатамскі «Эпас аб Гільгамешы», Біблію, індыйскія «Веды», паэмы «Махабхарата» і «Рамаяна», філасофскую прозу Кітая, старажытнагрэчаскія паэмы Гамера «Іліяда» і «Адысея» і інш.

**Поспехі ў развіцці навукі**

Неабходнасць вырашэння практычных задач спрыяла развіццю навуковых ведаў. Дзякуючы абраду бальзамавання старажытнаегіпецкія медыкі добра ведалі будову цела, што дазваляла ім лячыць

многія хваробы. Жыхары Старажытнай Індыі першыя звярнулі ўвагу на спадчынную прыроду захворванняў, іх залежнасць ад навакольнага асяроддзя. Кітайскія медыкі першымі пачалі выкарыстоўваць іголкаўколванне, ужывалі ў якасці лекаў чай. Рымляне вынайшлі наркоз, рабілі пластычныя аперацыі. «Клятва Гіпакрата», у аснове якой ляжаць погляды старажытнагрэчаскага медыка, з’яўляецца этычнай асновай паводзін сучасных урачоў.

Егіпцяне мелі ўяўленне пра дробы, стварылі геаметрыю. Шумеры ўвялі шасцідзесятковы лік: 360 градусаў у акружнасці, 60 хвілін у гадзіне і 60 секунд у хвіліне. Індыйцы вынайшлі дзесятковую сістэму лічэння і паняцце «нуль». Велізарны ўнёсак у развіццё навуковых ведаў зрабілі грэкі і рымляне.

**Мастацтва і грамадскія відовішчы**

Шырокае развіццё ў старажытнасці атрымалі архітэктура, скульптура і жывапіс. Антычнай цывілізацыі мы ўдзячныя за такія віды грамадскіх відовішчаў, як тэатр, цырк, Алімпійскія гульні і інш.

## АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА СТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ

**Вялікі зікурат Ура**
XXI ст. да н. э.



**Вялікая кітайская сцяна**
III ст. да н. э.



**Храм Амон-Ра ў Луксоры**
XIV ст. да н. э.



**Акрополь у Афінах**
V ст. да н. э.



**Калізей у Рыме**
I ст. н. э.



Знайдзіце па адным цікавым факце пра кожнае збудаванне.

Правообладатель Издательский центр БГУ

### Узнікненне хрысціянства

**Монатэізм** — вера ў існаванне адзінага Бога.

Спадчынай старажытнарымскай цывілізацыі з'яўляецца зараджэнне новай рэлігіі — хрысціянства, якое з цягам часу ператварылася ў адну з самых масавых сусветных рэлігій. Хрысціянства ўзнікла ў пачатку I ст. у аддаленай правінцыі Рымскай імперыі Іудзеі сярод яўрэйскага насельніцтва. Гэта **монатэістычная рэлігія**, у аснове якой ляжыць вера ў аднаго ўсёмагутнага Бога-творцу, які прадстаўлены ў трох Асобах — Айца, Сына і Святога Духа. Бог Сын — Ісус Хрыстос — з'явіўся на свет для ўратавання чалавецтва. Першапачаткова рымскае язычніцкае грамадства рэзка асуджала хрысціянства і на працягу трох стагоддзяў жорстка праследавала яго прыхільнікаў. Толькі ў 313 г. імператар Канстанцін Вялікі выдаў Міланскі эдыкт, які дазваляў хрысціянам свабодна вызнаваць сваю рэлігію.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Шмат якія словы, што мы сёння актыўна выкарыстоўваем у штодзённым жыцці, маюць грэчаскае або лацінскае паходжанне. Яны настолькі звыклыя, што пра іх замежнае паходжанне ніхто не здагадваецца.

1. *Слова «школа» першапачаткова ўзнікла ў Старажытнай Грэцыі і азначала «вольны час, адпачынак». Што мелася на ўвазе пад вольным часам? Ці супадае значэнне слова «школа» ў сучасным яго разуменні са старажытнагрэчаскім тлумачэннем?*
2. *Назвы большасці вучэбных прадметаў, якія вы вывучаеце ў школе, таксама маюць грэчаскае паходжанне. Пра якія вучэбныя прадметы ідзе гаворка?*
3. *Многія імёны, як мужчынскія, так і жаночыя, маюць старажытныя карані. Вызначце, з якой мовы запазычана ваша імя. Што яно першапачаткова значыла? Назавіце самых вядомых у гісторыі асоб з падобным імем.*

Культурныя дасягненні старажытных цывілізацый у тым ці іншым выглядзе захаваліся ў многіх сферах жыцця: ад мастацтва і архітэктуры да філасофіі і навукі — і дагэтуль уражваюць нас сваёй прыгажосцю і глыбінёй.

*Вынікам паступальнага развіцця чалавечага грамадства стала ўзнікненне цывілізацый. Адны з іх узніклі ў далінах рэк (Егіпет, Месапатамія, Кітай, Індыя), іншыя — на марскім узбярэжжы (Грэцыя і Рым). Назапашаны імі вопыт, багатая і разнастайная матэрыяльная і духоўная культура аказалі заўважны ўплыў на станаўленне сучаснай сусветнай цывілізацыі.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| 4–2-е тыс. да н. э. — узнікненне першых цывілізацый | Сярэдзіна 3-га тыс. да н. э. — рассяленне індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Дзе і калі зарадзіліся найстаражытнейшыя цывілізацыі свету? Чаму іх называюць «рачнымі»?
2. Якое значэнне ў старажытным свеце мела рабства? Паразважайце, ці маглі старажытныя цывілізацыі пазбегнуць рабскага падпарадкавання чалавека.
3. Што такое дэспатыя? Пералічыце характэрныя рысы ўсходніх дэспатый.
4. Назавіце падабенствы паміж грэчаскім полісам і рымскай грамадзянскай абшчынай. Ці існавалі адрозненні?
5. Што сведчыць пра сувязь беларускіх зямель з антычнымі цывілізацыямі?
6. Складзіце топ-5 культурных дасягненняў Старажытнага свету, значных для развіцця сучасных цывілізацый. Абгрунтуйце свой выбар.
7. Распрацуйце памятку турысту «Пяць месцаў, якія трэба паглядзець пры наведванні Егіпта» (Італіі, Грэцыі і да т. п.). Прапанаваныя для агляду славутасці павінны адносіцца да гісторыі Старажытнага свету.
8. Складзіце тэзісны план адказу на тэму «Агульныя і адметныя рысы ў развіцці старажытных цывілізацый».

Правообладатель Издательский центр БГУ

# Практыкум па раздзеле «Станаўленне найстаражытнейшых цывілізацый. Беларусь у дадзяржаўны перыяд»

## Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

**1.** Пасля знаёмства з гісторыяй эвалюцыі чалавека можа паўстаць пытанне: «Чаму менавіта краманьёнцу выпаў лёс стаць першапродкам усіх сучасных людзей, хоць былі і іншыя галіны на агульначалавечым дрэве жыцця?». Высокія шанцы на «поспех» у працягу роду мелі неандэртальцы, але яны не вытрымалі першабытнай канкурэнцыі і каля 30 тыс. гадоў таму зніклі.

### МАГЧЫМЫЯ ПРЫЧЫНЫ ГІБЕЛІ НЕАНДЭРТАЛЬЦАЎ

- Змяненне клімату падчас апошняга абледзянення або «вулканічная катастрофа» (моцнае пахаладанне пасля забруджвання атмасферы попелам, масавая гібель жывёл, на якіх яны палявалі, і да т. п.)



- Невялікая колькасць і нізкая нараджальнасць не дазволілі ім замацавацца на планеце
- Уварванне ў Еўропу і на Блізкі Усход краманьёнцаў, якія часткова асімілявалі, а пасля і знішчылі сваіх сапернікаў дзякуючы розуму і адноснай шматлікасці

А. Падзяліцеся на тры каманды, кожная з якіх будзе адстойваць пэўную групу прычын вымірання неандэртальца, і правядзіце дыскусію на тэму «Чаму вымерлі неандэртальцы?». Пры неабходнасці скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі (напрыклад, кнігай расійскага археолага Л. Вішняцкага «Неандертальцы. Хроника несостоявшегося человечества» або публікацыямі на навукова-асветніцкім інтэрнэт-партале *Antropogenez.ru*).

Б. Па выніках дыскусіі зрабіце вывад: ці было знікненне неандэртальца як віду выпадковасцю або заканамернасцю гістарычнага развіцця.

## Адрозненне факта ад меркавання

**2.** Уменне адрозніваць факты ад меркаванняў дапамагае лепш арыентавацца ў сучаснай інфармацыйнай прасторы і прымаць абгрунтаваныя рашэнні ў дачыненні да інфармацыі, якая паступае. Праверце, ці валодаеце вы такімі ўменнямі. Выканайце заданні.

А. Прачытайце тэкст. Пералічыце змены, якія адбыліся ў чалавеку і з чалавекам у выніку пераходу ад збіральніцтва да земляробства.

*Пра з'яўленне вытворчай гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі, у прыватнасці земляробства, сведчыць знойдзены археолагамі пылок акультураных злакаў — пшаніцы і ячменю, а таксама пустазелля. Самае старажытнае яго месцазнаходжанне выяўлена на тэрыторыі Беларускага Палесся, яго ўзрост — 7 тысяч гадоў. Праз некалькі стагоддзяў найбуйнейшае вынаходства чалавецтва дасягнула цэнтральных раёнаў Беларусі: пылок пшаніцы знойдзены каля стаянкі Заценне ў Лагойскім раёне Мінскай вобласці. Напрыканцы неаліту сляды земляробства з'явіліся і на поўначы Беларусі. Сведчаннем яго значнага пашырэння з'яўляюцца таксама знаходкі пэўных прылад працы: сякер, сярпоў, матык, тарак для зерня. Сама ж ідэя земляробства, як ужо было сказана раней, была запазычана старажытным насельніцтвам Беларусі ў індаеўрапейцаў.*

Б. Прачытайце сцвярджэнні. Укажыце пазіцыі, у якіх змяшчаюцца факты, і пазіцыі, у якіх выказана меркаванне. Свой адказ аргументуйце.

1) Земляробства дазволіла людзям лепш харчавацца.

2) Менш разнастайнае харчаванне земляробаў у параўнанні з паляўнічымі прывяло да ўзнікнення новых хвароб.

3) Аселы лад жыцця земляробаў абумовіў з'яўленне прыкмет антысанітарыі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

4) З пераходам да земляробства ў чалавека з'яўляецца паняцце «дом» у сучасным яго разуменні.

| Факт | Меркаванне |
|---|---|
| | |

Прапануйце свае варыянты сцвярджэнняў для дадзенай табліцы.

## Ажыццяўленне пошуку інфармацыі

**3.** Адной з прыкмет неалітычнай рэвалюцыі з'яўляецца пераход да жывёлагадоўлі. Прыручэнне розных відаў жывёл было не аднамомантнай падзеяй, а ўяўляла сабой тысячагадовы працэс.

А. Даведайцеся час прыручэння розных відаў жывёл (не менш за сем).

Б. Прадстаўце знойдзеныя вамі звесткі на стужцы часу.

В. Якая птушка была прыручана першай на еўрапейскім кантыненце?

Г. Выкажыце здагадку аб прычынах ранейшага і пазнейшага прыручэння той ці іншай жывёлы.

Д. Даведайцеся, што такое «прынцып Ганны Карэнінай» і як ён выкарыстоўваецца ў вывучэнні працэсу прыручэння дзікіх звяроў старажытнымі людзьмі.

## Аддзяленне галоўнага ад другаснага

**4.** Эпоха першабытнасці часта ўяўляецца сучаснаму чалавеку як нешта прымітыўнае: людзі жылі ў напаўдзікіх умовах і дбалі толькі пра тое, як знайсці сабе харчаванне. Аднак вы ўжо ведаеце, што свет першабытнага чалавека быў нашмат больш складаны, чым здаецца на першы погляд. У тым ліку яго духоўны свет, які нашы далёкія продкі выяўлялі праз рэлігійныя дзеянні і розныя віды мастацтва.

Вылучыце ў прапанаваным ніжэй тэксце галоўную і другасную інфармацыю, якая выкарыстоўваецца для характарыстыкі вераванняў нашых продкаў.

У каменным веку паляўнічыя-збіральнікі ўжо ўмелі выразаць фігуркі людзей і жывёл з дрэва, каменю, косці.



Статуэткі людзей. Неаліт. В. Асавец-2. Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці

Драўляная статуэтка даволі дакладна перадае вобраз мужчыны канца каменнага веку. Выразаная з рогу выява ўяўляе сабой мужчыну з выцягнутым тварам, высокім ілбом і вострым падбародкам.



Касцяная фігурка аленя. Неаліт. В. Асавец-2. Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці

Статуэтка аленя перадае пластыку жывёлы. Таксама захаваліся касцяныя статуэткі ў выглядзе лася, качкі, чаплі, змяі. Усе гэтыя жывёлы маглі выступаць у якасці татэмаў радавога калектыву.

Вялікая роля палявання ў жыцці старажытнага насельніцтва знайшла адлюстраванне ў разнастайных амулетах з зубоў ваўка, лісы, пясца і іншых жывёл. Лічыцца, што яшчэ з часоў палеаліту на беларускіх землях існаваў культ ваўка, сведчаннем чаго выступаюць рытуальныя пахаванні гэтага звера. Прысвойвальныя формы гаспадаркі захоўвалі сваю пануючую ролю і ў неаліце, нягледзячы на з'яўленне земляробства і жывёлагадоўлі. Таму жыхары беларускіх зямель па-ранейшаму карысталіся амулетамі з прасвідраваных зубоў мядзведзя і дзіка.



Фрагмент амулета з косці ў выглядзе галавы вужа. Неаліт. В. Асавец-2. Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці

Звярніце ўвагу: амулет мае скразную адтуліну — відаць, яго насілі як цэнтральную частку караляў або нашывалі на вопратку. Паламаўся ён не выпадкова — яго спярша надрэзалі, а пасля адламалі вужу галаву. Ёсць меркаванне, што гэтыя дзеянні насілі магічны характар: або нехта спрабаваў нашкодзіць уладальніку касцянога вужа, або ў важны момант амулет не спрацаваў і сам уладальнік «пакараў» яго такім чынам.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

**5.** Як вядома, гісторыю ствараюць людзі. Эпоха першабытнасці характарызуецца панаваннем калектывізму ва ўсіх галінах жыцця грамадства. Вылучыць вынікі дзейнасці канкрэтнага чалавека не ўяўляецца магчымым. Аднак з узнікненнем у Старажытным свеце лакальных цывілізацый у гісторыі ўпершыню з’яўляюцца імёны выбітных людзей, чыя дзейнасць паўплывала на далейшы ход гістарычнага развіцця мясцовасці, дзяржавы, рэгіёна або ўсяго чалавецтва. Такіх людзей называюць гістарычнымі асобамі.

Паразважайце пра ролю асобы ў гісторыі. Выканайце заданні.

А. Запоўніце табліцу «Гістарычныя асобы Старажытнага свету». Суаднясіце імя гістарычнага дзеяча з яго выявай (запішыце літару ў адпаведным слупку табліцы).

А



Б



В



Г



Д



Е



Б. Прапануйце свой варыянт гістарычнай асобы, якая, на ваш погляд, з'яўляецца знакавай фігурай у гісторыі Старажытнага свету. Звесткі пра яе запішыце ў адпаведным радку табліцы.

В. Зрабіце вывад пра ролю асобы ў гісторыі.

| **Гістарычная асоба** | **Выява** | **Дзяржава** | **Дзейнасць** | **Роля ў гісторыі** |
|---|---|---|---|---|
| Хамурапі | | | | |
| Саламон | | | | |
| Клеапатра | | | | |
| Герадот | | | | |
| Аляксандр Македонскі | | | | |
| Юлій Цэзар | | | | |
| Асоба на выбар | | | | |
| **Вывад** | | | | |

Правообладатель Издательский центр БГУ

# Абагульненне па раздзеле «Станаўленне найстаражытнейшых цывілізацый. Беларусь у дадзяржаўны перыяд»

## Працуем з паняццямі

**1.** Прачытайце пералік паняццяў, з якімі вы сустракаліся, калі вывучалі раздзел.

*Антычнасць, краманьёнец, цывілізацыя, імперыя, стаянка, бронзавы век, іерогліф, рэлігія, фараон, суседская абшчына, індаеўрапейцы, усходняя дэспатыя, наскальны жывапіс, неалітычная рэвалюцыя, дзяржава, арашальнае земляробства, мегаліт, патрыярхальнае рабства, поліс.*

Выканайце заданні.

А. Падзяліце паняцці на дзве групы і змясціце іх у адпаведныя слупкі табліцы.

| Першабытнае грамадства | Старажытныя цывілізацыі |
|---|---|
| | |

Б. Выберыце паняцці, прыдатныя для апісання Беларусі ў старажытнасці. Растлумачце іх значэнне, канкрэтызуйце прыкладамі вывучаных гістарычных падзей, з'яў і працэсаў.

**2.** Паняцце «грамадзянін» мае глыбокія гістарычныя карані. Паразважайце пра яго значэнне, выконваючы прапанаваныя заданні.

А. Прачытайце тэкст клятвы, якую давалі 18-гадовыя юнакі, калі рабіліся паўнапраўнымі афінскімі грамадзянамі. Назавіце асноўныя каштоўнасці афінян.

*«Я не знясслаўлю свяшчэннай зброі і не пакіну таварыша ў бітве; буду абараняць і адзін, і з многімі ўсё святое і запаветнае; не паменшу моцы і славы айчыны, але павялічу іх; буду разумна падпарадкоўвацца існуючаму ўраду і законам, якія ўсталяваны і маюць быць прынятыя, а калі хто будзе намагацца знішчыць законы або не падпарадкоўвацца ім, я не дапушчу і буду змагацца супраць яго і адзін, і з усімі; буду таксама шанаваць айчынныя святыні. У гэтым няхай будуць мне сведкамі багі».*

Б. У старажытнарымскай абшчыне існавала цесная сувязь паміж паняццямі «грамадзянін», «ваяр» і «землеўласнік». Растлумачце, у чым яна заключалася.

В. Што для вас значыць «быць грамадзянінам»? Сфармулюйце сучаснае азначэнне паняцця «грамадзянін». Якія каштоўнасці з клятвы афінян актуальныя і сёння?

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**3.** Разгледзьце картасхему «Палеалітычныя стаянкі на тэрыторыі Беларусі» і растлумачце прычыну такога іх размяшчэння. На падставе прапанаваных крыніц інфармацыі (картасхема, макет, інфармацыя пра Бердыжскую стаянку) апішыце адзін дзень з жыцця насельніка падобнай стаянкі.






*Палеалітычныя стаянкі на тэрыторыі Беларусі*

**Пра Бердыжскую стаянку**

*Бердыжская стаянка — археалагічны помнік эпохі палеаліту, знаходзіцца ў Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці. Знайшоў стаянку ў 1926 г. вядомы беларускі археолаг К. М. Палікарповіч. Паводле легенды, у працэсе разведак у даліне Сожа ён спыніўся на беразе ручая каля вёскі Падлужжа і разгаварыўся з пастухом, які сядзеў на велізарным валуне.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Вучоны заўважыў, што гэта не камень, а чэрап дарослага мамантa, які быў аблеплены зямлёй і страціў форму пасля доўгага знаходжання на паверхні. Хуткі агляд схілу паказаў, што гэта не выпадковая знаходка.*

*Раскопкі Бердыжскай стаянкі праводзіліся з 1926 да 1973 г., у выніку была ачышчана плошча амаль 500 м$^2$. Знойдзена больш за 1000 крэменяў са слядамі апрацоўкі (наканечнікі дзід, скрабкі, прымітыўныя разцы, нажападобныя пласціны і інш.) і каля 2000 цэлых і разбітых костак розных жывёл, галоўным чынам маманта.*

*Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь і Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Помнік занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.*

**4.** Азнаёмцеся з апісаннем паселішча бронзавага веку.

*У бронзавым веку на тэрыторыі Беларусі жылі ў невялікіх умацаваных паселішчах, якія месціліся ў далінах рэк. Жыллём служылі невялікія прамавугольныя напаўзямлянкі каркасна-слупавой канструкцыі, з адным або двума памяшканнямі, накрытыя двухсхільным дахам. Амаль каля кожнага жытла знаходзіліся наземныя гаспадарчыя пабудовы, якія прызначаліся для захоўвання збожжа, саломы, сена. У вялікіх паселішчах узводзіліся культавыя збудаванні, якія размяшчаліся воддаль ад жылля, далей ад людскога шуму.*

Разгледзьце фотаздымкі музейнай экспазіцыі і вызначце месца размяшчэння наступных аб'ектаў: жыллё бронзавага веку, гаспадарчыя пабудовы, культавае збудаванне. Аргументуйце свой выбар.




Археалагічны музей пад адкрытым небам у Белавежскай пушчы.
Паселішча бронзавага веку

## Аналізуем, тлумачым і разважаем

**5.** Выявіце прычыну і вынік у наступных парах падзей:

| | |
|---|---|
| жыццё радавымі абшчынамі | працаёмкасць здабывання ежы |
| узнікненне рэлігійных уяўленняў | пахаванні суродзічаў |
| удасканаленне каменных прылад працы насельніцтвам Беларусі ў эпоху бронзы | невялікая колькасць бронзавых вырабаў на тэрыторыі Беларусі |
| пашырэнне на тэрыторыі Беларусі земляробства | з'яўленне шахтаў па здабычы крэменю на захадзе Беларусі |
| з'яўленне сацыяльнай няроўнасці | выкарыстанне металаў для вырабу прылад працы і зброі |
| узнікненне дзяржаў Старажытнага Усходу | патрэба ў будаўніцтве ірыгацыйных сістэм |
| развіццё гандлю | стварэнне алфавітнай пісьменнасці |
| нізкая прадукцыйнасць працы | выкарыстанне рабскай працы |

**6.** У штодзённым маўленні мы часта выкарыстоўваем фразеалагічныя звароты. Многія з іх сваімі каранямі сыходзяць у антычны час. Напрыклад, *ніткa Арыядны; са шчытом ці на шчыце; перайсці Рубікон; яблык разладу; ахілесава пята; пірава перамога; рассячы гордзіеў вузел; скрыня Пандоры; сізіфава праца; «І ты, Брут»; траянскі конь; тытанічная праца*.

А. Успомніце, якія з прапанаваных фразеалагізмаў вядуць сваё паходжанне з міфаў, а якія з'яўляюцца адгалоскамі гістарычных падзей.

Б. Выберыце найбольш цікавы для вас фразеалагізм, выявіце вытокі яго паходжання, растлумачце сэнс, прывядзіце прыклады ўжывання ў мове.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Параўноўваем

**7.** Параўнайце агульнасусветную археалагічную перыядызацыю з перыядызацыяй першабытнасці на тэрыторыі Беларусі.

| **Археалагічныя перыяды** | | | **Агульнасусветная перыядызацыя** | **Перыядызацыя на тэрыторыі Беларусі** |
|---|---|---|---|---|
| **Каменны век** | *Палеаліт* (старажытны каменны век) | ранні | 2,6 млн гадоў таму — 200 тыс. гадоў таму | |
| | | сярэдні | 200 — 40–35 тыс. гадоў таму | 100–35 тыс. гадоў таму |
| | | позні | 40–35 тыс. гадоў таму — 10-е тыс. да н. э. | 35 тыс. гадоў таму — 10-е тыс. да н. э. |
| | *Мезаліт* (сярэдні каменны век) | | 10–8/7-е тыс. да н. э. | 9–5-е тыс. да н. э. |
| | *Неаліт* (новы каменны век) | | 8/7–4-е тыс. да н. э. | Канец 5-га — канец 3-га тыс. да н. э. |
| **Бронзавы век** | | | 3-е тыс. да н. э. — VIII ст. да н. э. | 2-е тыс. да н. э. — VIII ст. да н. э. |
| **Жалезны век** | | | VIII ст. да н. э. — 476 г. н. э. | VII ст. да н. э. — канец V ст. н. э. |

А. Які перыяд быў самы доўгі ў гісторыі чалавецтва?

Б. Растлумачце прычыны немагчымасці вылучыць адзіныя храналагічныя межы гістарычных перыядаў для розных рэгіёнаў свету.

В. На падставе параўнання перыядызацый зрабіце вывад.

## Сістэматызуем веды

**8.** Пералічыце перавагі бронзавых прылад працы і зброі ў параўнанні з каменнымі і жалезных перад бронзавымі.

**9.** Запоўніце табліцу «Змены ў жыцці старажытных людзей на тэрыторыі Беларусі». Зрабіце вывад.

<table>
<tr><th colspan="2">Археалагічны перыяд</th><th>Тып гаспадаркі / заняткі</th><th>Прылады працы</th><th>Сацыяльныя адносіны</th><th>Духоўная культура</th></tr>
<tr><td rowspan="3">Каменны век</td><td>Палеаліт</td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>Мезаліт</td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>Неаліт</td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td colspan="2">Бронзавы век</td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td colspan="2">Жалезны век</td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
</table>

**10.** Выкарыстоўваючы стужку часу, прапанаваную ў пачатку гэтага раздзела, выканайце заданні.

А. Складзіце расказ пра развіццё беларускіх зямель у старажытнасці.

Б. Якімі падзеямі/з'явамі/працэсамі вы б дапоўнілі наяўную стужку часу? Прапануйце форму для іх абазначэння (карта, карціна, фотаздымак, цытата, фрагмент крыніцы, дата і інш.).

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Наш край у старажытнасці

**1.** Складзіце спіс крыніц, у якіх можна знайсці інфармацыю пра гістарычнае развіццё вашай мясцовасці ў старажытнасці.




Шматтомнае серыйнае выданне «Памяць» — гэта гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён. Асноўнае прызначэнне серыі — пазнаёміць з гісторыяй, культурай, славутасцямі раёнаў, вядомымі людзьмі, ушанаваць памяць воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1985 да 2005 г. было выдадзена больш за 150 кніг, у якіх асвятляецца гісторыя ўсіх 118 раёнаў Беларусі. У выданнях шырока прадстаўленыя дакументальныя і архіўныя матэрыялы, газетныя публікацыі, успаміны непасрэдных удзельнікаў і відавочцаў падзей, фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы.

Невыпадкова кнігі «Памяць» называюць рэгіянальнымі энцыклапедыямі. Яны будуць карысныя ўсім, хто любіць сваю малую радзіму і цікавіцца яе ўнікальнай гісторыяй.

Колькі кніг з серыі «Памяць» выдадзена ў вашай вобласці? Даведайцеся, ці выпушчана гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць», прысвечаная гісторыі вашай мясцовасці.

**2.** Высветліце, як адбывалася засяленне тэрыторыі вашай мясцовасці. Пры адказе ўлічвайце наступныя фактары: ледавіковыя перыяды; час і напрамак адступлення апошняга ледавіка; шляхі міграцыі індаеўрапейцаў (першая, другая хвалі) на тэрыторыі Беларусі. Даведайцеся, якія археалагічныя помнікі пацвярджаюць засяленне тэрыторыі вашага рэгіёна ў старажытнасці. Прывядзіце 1–2 прыклады.

А. Сістэматызуйце атрыманую інфармацыю і адлюструйце яе на стужцы часу.

| | **Каменны век** | **Бронзавы век** | **Жалезны век** |
|---|---|---|---|
| Агульныя звесткі | .................. .................. | .................. .................. | .................. .................. |
| Археалагічныя знаходкі | .................. .................. | .................. .................. | .................. .................. |

Б. Зрабіце вывад пра асаблівасці засялення тэрыторыі вашай мясцовасці ў параўнанні з іншымі тэрыторыямі Беларусі.

**3.** Зайдзіце ў краязнаўчы музей, размешчаны ў вашай мясцовасці, і даведайцеся, ці існуюць артэфакты, якія сведчаць пра сувязь вашага краю з іншымі народамі і рэгіёнамі свету. Да такіх доказаў могуць адносіцца як знойдзеныя вырабы, так і матэрыялы, з якіх яны зроблены (напрыклад, бронза, бурштын і інш.).

**4.** Падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) пра гістарычнае развіццё вашай мясцовасці ў старажытнасці.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# СВЕТ У ЭПОХУ РАННЯГА

## ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАВЫ








862 г.

Рассяленне славян

Утварэнне саюзаў плямёнаў

Вялікае перасяленне народаў

Узнікненне ісламу і арабскія заваёвы

476 г.

622 г.

800 г.

882 г.















# І ВЫСОКАГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА
## НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ







980 г. 1067 г. 1101 г. 1161 г.

Стварэнне дзяржаўнасці

Феадальная раздробленасць

Крыжовыя паходы

988 г. 1054 г. 1204 г. 1215 г.







„Глядзелі двое ў вакно.
Адзін убачыў бруд адно.
Другі — лістоту, і нябёсы,
і птушак цёплаю вясной”.



Правообладатель Издательский центр БГУ

# Раздзел II. СВЕТ У ЭПОХУ РАННЯГА І ВЫСОКАГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА. ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

## § 7. Дзяржавы Ранняга і Высокага сярэднявечча на Захадзе

КАРЛ ВЯЛІКІ
РЫМЛЯНЕ ВІЗАНТЫЯ РЭКАНКІСТА
ФЕАДАЛЬНАЯ РАЗДРОБЛЕНАСЦЬ
ХЛОДВІГ КОДЭКС ЮСТЫНІЯНА
НАРМАНЫ ФРАНКІ
ВАРВАРЫ

Германскія плямёны ў Еўропе

**1. Вялікае перасяленне народаў.** У пачатку Сярэднявечча Заходняя Еўропа была ахоплена актыўнай міграцыяй разнастайных плямёнаў, якая з'яўлялася часткай **Вялікага перасялення народаў.** Да IV ст. н. э. германскія плямёны жылі ў Скандынавіі, а таксама паміж Рэйнам, Віслай і Верхнім Дунаем. Асноўнымі прычынамі іх міграцыі, апроч кліматычных змен, былі наступныя: поспехі ў развіцці эканомікі спрыялі росту насельніцтва і, адпаведна, пошуку новых зямель для жыцця; эліта, якая фарміравалася (ваенныя важакі і іх дружыннікі), імкнулася да захопу новых зямель і абагачэння; назіраліся пастаянныя сутыкненні паміж суседнімі плямёнамі.

**Вялікае перасяленне народаў** — умоўная назва актыўных міграцыйных працэсаў (перамяшчэнняў розных плямёнаў) у Еўропе, Азіі ў IV–VII стст.

З IV ст. варварскія плямёны, найперш германцы, пачалі актыўна пранікаць на тэрыторыю Рымскай імперыі (асабліва ў яе заходнюю частку). Рымская дзяржаўнасць не змагла вытрываць. Гісторыя Заходняй Рымскай імперыі скончылася ў *476 г.* — пасля звяржэння апошняга заходнерымскага імператара Ромула Аўгуста. Тады ж скончылася гісторыя Старажытнага свету і пачалася новая яе старонка — **Сярэднія вякі**.

**Сярэднія вякі** — гістарычны перыяд з канца V да канца XV ст., які прыйшоў на змену Антычнасці і папярэднічаў Новаму часу.




*Рассяленне варварскіх плямёнаў у Еўропе і Паўночнай Афрыцы*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Узвышэнне варварскіх важакоў, захоп імі ўлады з апорай на дружыну прывялі да стварэння новых дзяржаў — так званых *варварскіх каралеўстваў*. Прычыну ваенных поспехаў германцаў гісторыкі бачаць у іх еднасці, большай у параўнанні з рымскімі грамадзянамі. У рымскай арміі ў той час было шмат наймітаў-варвараў, а рымскія рабы ахвотна падтрымлівалі варвараў, таму што бачылі сярод іх сваіх супляменнікаў.

Франкская дзяржава

**2. Сярэдневяковая карта Еўропы.** Новая палітычная карта Еўропы *Ранняга (V–IX стст.)* і *Высокага (X–XIII стст.) сярэднявечча* не была стабільная. Найвялікшая варварская дзяржава ўзнікла ў былой рымскай правінцыі Галія. Яе заснавальнікамі сталі франкі. У канцы V ст. іх кароль *Хлодвіг* паступова падпарадкаваў сабе амаль увесь рэгіён. Зацікаўлены ў спыненні ваенных сутычак і рабаўніцтваў, ён заручыўся падтрымкай хрысціянскай царквы, прайшоў абрад хрышчэння і абярнуў у хрысціянства свой народ.



Хрышчэнне Хлодвіга. Мастак Жан Ало. 1825 г.

«Францыя, старэйшая дачка Царквы…» Гэты папулярны выраз XIX ст. адсылае да таго, што Францыя, а дакладней Франкская дзяржава, стала першай сярэдневяковай дзяржавай, якая прыняла хрысціянства ад Папы Рымскага.

Калектыўнае хрышчэнне караля Хлодвіга разам з 3000 яго ваяроў дало франкам перавагу ў далейшым пашырэнні сваіх межаў.



Надмагільная пліта караля Хлодвіга ў саборы Парыжа. Горад зрабіўся сталіцай дзяржавы



Памятная манета ў гонар 1000-годдзя хрышчэння Францыі

Пры Хлодвігу быў складзены першы сярод усіх варварскіх каралеўстваў зборнік законаў, які атрымаў назву *Салічная праўда*.

Пасля смерці Хлодвіга пачаліся канфлікты паміж яго спадкаемцамі. Толькі праз 200 гадоў адзінства Франкскай дзяржавы было адноўлена каралём *Карлам Вялікім*. Атрымаўшы ў 800 г. імператарскую карону з рук самога Папы Рымскага, ён паставіў мэту стварыць адзіную хрысціянскую імперыю на германскіх і суседніх землях.

Назавіце валадароў, якія таксама атрымалі ў гісторыі мянушку «Вялікі», і іх заслугі.

Менавіта тут, у Франкскай дзяржаве, у VIII–IX стст. былі закладзены асновы сярэдневяковых парадкаў, якія пашырыліся практычна на ўсю Заходнюю Еўропу. Аднак Франкская імперыя неўзабаве распалася. У 843 г. унукі Карла Вялікага афіцыйна падзялілі яе на тры дзяржавы. Прычынай таго сталі не толькі амбіцыі нашчадкаў імператара, але і плошча тэрыторыі, якую было цяжка кантраляваць з адзінага цэнтра. Не апошнюю ролю адыгралі этнічныя адрозненні насельніцтва асобных рэгіёнаў, што скалаліся да таго часу.




*Падзел Франкскай імперыі ў 843 г.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Да IX ст. адбылося зліццё гала-рымлян і франкаў у адзіную французскую народнасць, але яшчэ доўга раманізаваны поўдзень захоўваў свае этнічныя і моўныя асаблівасці, якія адрозніваліся ад паўночных зямель Францыі, што зазналі больш варварскі ўплыў.

Мясцовае насельніцтва Італіі паспяхова асімілявала прышлых германцаў, што таксама паступова прывяло да фарміравання сярэдневяковай італьянскай народнасці, якая абапіралася на рымскую спадчыну і перадусім на латынь, з якой вырасла італьянская мова.

1. *Якую ролю адыграла мова ў фарміраванні еўрапейскіх народнасцей?*
2. *Растлумачце, зыходзячы з дадзенага тэксту, што значыць «раманская група моў». Назавіце вядомыя вам народы, што гавораць на раманскіх мовах.*

### Новая спадкаемца Рыма — Свяшчэнная Рымская імперыя

Ужо праз стагоддзе на ўсходніх землях падзеленай Франкскай дзяржавы была створана новая імперыя. У *962 г.* кароль Отан I, які праводзіў палітыку аб'яднання германскіх зямель, здзейсніў паход на Рым, дзе прыняў імператарскую карону з рук Папы і стаў кіраўніком новай дзяржавы — *Свяшчэннай Рымскай імперыі*. Яна ўключала ў сябе шырокія ўладанні ў Цэнтральнай Еўропе, Паўночную і Сярэднюю Італію. Отан I, як у свой час Карл Вялікі, імкнуўся падкрэсліць пераемнасць паміж сваёй дзяржавай і Рымскай імперыяй.

### Нарманскія дзяржавы

На Скандынаўскім паўвостраве жылі *нарманы*. Беднасць рэсурсаў не дазваляла конунгам (мясцовым князям) утрымліваць дружыннікаў, а тым больш раздаваць ім зямлю. У выніку дружыннікі нападалі на землі еўрапейскіх дзяржаў, дзе займаліся рабаўніцтвам, гандлявалі, наймаліся служыць да мясцовых каралёў. Нарманы стварылі ў Еўропе свае дзяржавы: Нарманскае герцагства ў Паўночнай Францыі, на Брытанскіх астравах (нарманская заваёва Англіі), на в. Сіцылія і ў Паўднёвай Італіі. На землях самога Скандынаўскага паўвострава з'явіліся *Данія, Швецыя* і *Нарвегія*.

У 1066 г., перабраўшыся цераз Ла-Манш, на Брытанскія астравы ўварваліся войскі нарманскага герцага Вільгельма. Яго перамога над мясцовай знаццю пры Гастынгсе ўвайшла ў гісторыю як нарманская заваёва Англіі. Паказаны эпізод бітвы (нарманы атакуюць пешых англасаксаў) з'яўляецца фрагментам габелена з Баё — вышытага ў IX ст. сярэдневяковага абруса памерам 70×0,5 м. Вялізнае маляўнічае палатно «апавядае» пра галоўныя падзеі з гісторыі захопу Англіі Вільгельмам I Заваёўнікам.



*Фрагмент габелена з Баё. Францыя. XI ст.*

На Пірэнейскім паўвостраве пачынаючы з VIII ст. ішла **Рэканкіста**. Раманскія народы намагаліся адваяваць землі, занятыя маўрамі (арабамі-мусульманамі). Ваенныя дзеянні ішлі з пераменным поспехам, у тым ліку з-за феадальных сварак паміж самімі еўрапейцамі: хрысціянскія ўладары змагаліся не толькі супраць агульнага ворага, але яшчэ і адзін з адным, а таксама са сваімі мяцежнымі падданымі. І ўсё ж у 1212 г. дзякуючы аб'яднанаму дзеянню каралеўскіх войскаў Арагона, Кастыліі, Леона, Навары і Партугаліі пры падтрымцы заходнееўрапейскіх рыцараў маўры былі разбітыя. Выгнанне мусульман з Пірэнеяў працягнулася і ў наступныя стагоддзі.

### Рэканкіста

**Рэканкіста** — вызваленчая барацьба хрысціян супраць арабаў-мусульман на Пірэнейскім паўвостраве ў VIII–XV стст.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Папрацуйце з картасхемай «Еўропа ў пачатку XIII ст.», змешчанай на форзацы.

1. *Знайдзіце на картасхеме дзяржавы, пералічаныя ў тэксце параграфа.*
2. *Абапіраючыся на веды, атрыманыя на ўроках геаграфіі, вызначце, у склад якіх сучасных краін уваходзяць тэрыторыі сярэдневяковых еўрапейскіх дзяржаў.*
3. *Ці згодныя вы са сцвярджэннем, што сучасная палітычная карта Еўропы сфарміравалася ў Высокім сярэднявеччы?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**3. Візантыйская імперыя і яе ўплыў на славянскія народы.** Пасля звяржэння апошняга заходнерымскага імператара і адаслання ў Канстанцінопаль знакаў імператарскай годнасці Візантыйская імперыя засталася адзінай спадкаемцай Антычнасці і праіснавала больш за тысячу гадоў.

Чыё імя носіць будынак, бачны на заднім фоне ілюстрацыі? Успомніце, калі і кім было закладзена будаўніцтва храма з такім самым імем на тэрыторыі Беларусі.



*Канстанцінопаль — велічная сталіца Візантыйскай імперыі*

**«Кодэкс Юстыніяна»**

У пачатку Ранняга сярэднявечча Візантыйская імперыя была найбуйнейшай дзяржавай, размешчанай у Еўропе, Азіі, Афрыцы. Візантыйцы лічылі сябе прадаўжальнікамі гісторыі Рыма, называлі сябе рамеямі (рымлянамі) і імкнуліся аднавіць імперыю ў яе былых межах. Імператар Юстыніян, які правіў у VI ст., стварыў на аснове рымскага права «грамадзянскі кодэкс» *(«Кодэкс Юстыніяна»)*, на якім у далейшым будзе грунтавацца заканадаўства заходнееўрапейскіх краін.

Успомніце, у гісторыі якой краіны быў перыяд з такой самай назвай. З чым у гісторыі асацыіруецца такая назва?

Але ўжо ў VII ст. Візантыя зазнала крызіс, у выніку якога краіна аслабла і паменшылася тэрытарыяльна. Пачаліся міжусобіцы, імператараў («васілеўсаў») часта звяргалі. Гэты перыяд у гісторыі імперыі (прыблізна сярэдзіна VII — сярэдзіна IX ст.) візантыйскія гісторыкі называлі «цёмнымі вякамі».

**Экспарт візантыйскай палітычнай мадэлі ў славянскія дзяржавы**

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, Візантыйская імперыя заставалася ўплывовым суседам для іншых дзяржаў, перадусім славянскіх. Балгары, сербы і іншыя славянскія народы шмат у чым запазычылі

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Фрагмент са звода законаў імператара Юстыніяна**

Сярод усіх спраў нельга знайсці нічога настолькі важнага, як улада законаў, якая размяркоўвае ў парадку боскія і чалавечыя справы і выганяе ўсялякую несправядлівасць.

Натуральнае права — гэта тое, якому прырода навучыла ўсё жывое, бо гэтае права ўласцівае не толькі чалавечаму роду, але і ўсім жывёлам, якія нараджаюцца на зямлі і ў моры, і птушкам; сюды ж нараджэнне дзяцей, сюды ж выхаванне.

1. *Што такое натуральнае права і хто ім надзяляе чалавека, згодна з дадзеным дакументам?*
2. *Пазначце на стужцы часу стагоддзе выдання «Кодэкса Юстыніяна»; эпоху Асветніцтва; дату прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Да якіх гістарычных перыядаў адносіцца кожная з пазначаных падзей? Ці можаце вы растлумачыць крытэрый іх аб'яднання ў адзін лагічны шэраг?*
3. *Наколькі сучаснае разуменне натуральных (неадчужальных) правоў чалавека падобнае да іх тлумачэння ў зводзе законаў Юстыніяна?*

візантыйскую схему кіравання, а таксама ўсходнюю (візантыйскую) інтэрпрэтацыю хрысціянства. Запрашаючы рэлігійных асветнікаў з Візантыі, мясцовыя князі спрыялі пашырэнню славянскай пісьменнасці, якая канчаткова сфарміравалася намаганнямі вучняў і паслядоўнікаў Кірыла і Мяфодзія. Візантыйскае тлумачэнне хрысціянства — праваслаўе — было прынята і на землях Старажытнай Русі.

Варта адзначыць, што візантыйскі ўплыў не пашырыўся на Польшчу і Чэхію, дзе складвалася свая дзяржаўнасць. Калі ў эканамічным жыцці чэхаў і палякаў прагляадаліся рысы, уласцівыя ўсім славянам, дык у палітычным развіцці гэтых краін былі асаблівасці, звязаныя з прыняццем каталіцтва.

Да якой галіны славян належаць чэхі і палякі?

**4. Асаблівасці еўрапейскіх дзяржаў Ранняга і Высокага сярэднявечча.** Палітычная будова дзяржаў Заходняй Еўропы ў перыяд Ранняга сярэднявечча толькі фарміравалася. Тыповай формай праўлення ў гэты перыяд была манархія: вярхоўная ўлада належала аднаму спадчыннаму валадару (каралю,

**Асноўная форма праўлення — манархія**

Правообладатель Издательский центр БГУ

імператару, цару). Паўнамоцтвы яго першапачаткова былі абмежаваныя саветам знаці, без якога ён не мог, напрыклад, прымаць законы. У аснове заканадаўства і судовай сістэмы ляжалі пісьмовыя зборнікі звычаёвага права, якія ўзніклі на аснове старадаўніх традыцый і былі вядомыя як «праўды». У якасці намеснікаў валадара ў асобныя вобласці краіны прызначаліся набліжаныя да яго прадстаўнікі знаці. Яны мелі адміністрацыйныя, судовыя і фіскальныя паўнамоцтвы. Паступова пры двары складваўся адміністрацыйны апарат для кіравання дзяржавай. Першапачаткова ён быў прадстаўлены каралеўскімі дружыннікамі. Рост магутнасці вышэйшых службовых асоб пры каралеўскім двары прывёў да таго, што праз некаторы час яны бралі ўладу ў свае рукі, адхіляючы манарха ад фактычнага кіравання краінай.

Высокае сярэднявечча — эпоха раздробленасці

Перыяд Высокага сярэднявечча ў еўрапейскіх дзяржавах характарызаваўся палітычнай нестабільнасцю, слабасцю каралеўскай улады і пастаяннымі міжусобіцамі. Гэта была эпоха феадальнай раздробленасці.

## ФРАНКСКАЯ ДЗЯРЖАВА



- права рыцарства распараджацца землямі;
- камплектаванне войска атрадамі рыцараў;
- збор падаткаў мясцовым землеўласнікам

*Карл Вялікі, франкскі імператар. IX ст.*

## ВІЗАНТЫЯ



- вярхоўнае права манарха на ўсе дзяржаўныя землі;
- вайсковае апалчэнне са свабодных сялян;
- збор падаткаў на карысць цэнтральнага ўрада

*Васіль I Македанянін, візантыйскі імператар. IX ст.*

Прааналізуйце асаблівасці Франкскай і Візантыйскай імперый. Зрабіце вывад, улада якога імператара была мацнейшая. Сваё меркаванне аргументуйце.

*Пасля падзення ў 476 г. Заходняй Рымскай імперыі на яе руінах германскія правадыры стварылі свае варварскія каралеўствы. Найбольш магутным з іх стала Франкская дзяржава, якая атрымала статус імперыі. Візантыя захавалася ў Сярэднія вякі, была носьбітам палітычных, прававых і культурных дасягненняў антычнай эпохі і пашырыла свой уплыў на суседнія славянскія народы і іх дзяржавы. У Раннім сярэднявеччы паступова сфарміраваліся палітычныя інстытуты дзяржаў Заходняй Еўропы. У Высокім сярэднявеччы еўрапейскія дзяржавы зазналі перыяд феадальнай раздробленасці.*

**калі ў свеце...**

962 г. — абвяшчэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі

**на тэрыторыі Беларусі...**

960–970-я гг. — пачатак фарміравання Полацкага княства

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Сфармулюйце тры, на вашу думку, найважнейшыя наступствы Вялікага перасялення народаў для Заходняй Еўропы.
2. Ахарактарызуйце палітычную карту Заходняй Еўропы ў Раннім і Высокім сярэднявеччы.
3. У чым вы бачыце прычыны нестабільнасці палітычнай карты Заходняй Еўропы ў Раннім і Высокім сярэднявеччы?
4. Як вы лічыце, чаму еўрапейскія дзяржавы ў Раннім і Высокім сярэднявеччы імкнуліся абвясціць сябе спадкаемцамі Рымскай імперыі?
5. Складзіце схему «Асаблівасці еўрапейскіх дзяржаў у Раннім сярэднявеччы».

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 8. Еўрапейскае грамадства ў Раннім і Высокім сярэднявеччы

СЕНЬЁР ФЕАДАЛ
ЗАЛЕЖНЫ СЕЛЯНІН ЦЭХ
ГІЛЬДЫЯ ФЕОД ВАСАЛ САСЛОЎЕ
ФЕАДАЛЬНАЯ ЛЕСВІЦА АБРОК
МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА ПАНШЧЫНА
НАТУРАЛЬНАЯ ГАСПАДАРКА

Феод — вынік эвалюцыі сістэмы бенефіцыяў

**1. Сутнасць феадальных адносін у Еўропе.** Грамадства, якое сфарміравалася ў Заходняй Еўропе ў IX–XI стст., гісторыкі называюць **феадальным**. Галоўнай каштоўнасцю ў эпоху Сярэднявечча была зямля. У залежнасці ад таго, колькі яе меў чалавек і на якіх умовах яна яму належала, вызначалася яго месца ў грамадстве. Пры феадалізме існавалі дзве асноўныя сацыяльныя групы — феадалы і залежныя сяляне. Феадалы — уласнікі зямлі (уладальнікі феодаў). *Феод* — гэта спадчыннае зямельнае ўладанне, дараванае за службу гаспадаром — *сеньёрам* — свайму падначаленаму — *васалу*. Феод прыйшоў на змену *бенефіцыю* — зямельнаму ўладанню, якое давалася ў пажыццёвае карыстанне пры ўмове нясення службы (ваеннай, адміністрацыйнай, прыдворнай). Сяляне, што жылі на тых землях, паступова з вольных землеўладальнікаў ператвараліся ў залежных землекарыстальнікаў. За карыстанне надзеламі яны павінны былі выконваць разнастайныя павіннасці на карысць уласнікаў зямлі: расплачвацца прадуктамі, вырабленымі ў сялянскай гаспадарцы (аброк), грашыма (чынш) або працай на полі землеўласніка (паншчына).

**Феадалізм** — адносіны пазямельнай і асабістай залежнасці паміж людзьмі, асновай якіх з'яўляецца ўласнасць на зямлю.

Назавіце адрозненні паміж бенефіцыем і феодам.

Шляхі фарміравання феадалізму

Пераход да феадалізму ў розных краінах Еўропы адбываўся па-рознаму і расцягнуўся на некалькі ста-

годдзяў. У краінах Заходняй Еўропы, якія ўтварыліся на тэрыторыі былой Заходняй Рымскай імперыі, феадальныя адносіны сфарміраваліся на аснове сінтэзу антычных і варварскіх парадкаў, якія адбываўся ва ўмовах распаду рымскага рабаўладальніцкага грамадства, з аднаго боку, і разлажэння першабытнага грамадства ў плямёнах заваёўнікаў — з другога.

На тэрыторыі Скандынавіі, Паўночна-Заходняй Германіі, Старажытнай Русі, Польшчы, Чэхіі, дзе не было антычнага ўплыву, феадалізм фарміраваўся *бяссінтэзным шляхам*. Тут феадальныя адносіны ўзнікалі непасрэдна на аснове першабытных адносін, без стадыі рабаўладальніцкага грамадства.

Феадальная лесвіца

**2. Феадальная іерархія.** Адной з прыкмет феадальнага грамадства з'яўлялася феадальная іерархія — «лесвіца супадпарадкавання» феадалаў, у аснову якой былі пакладзены сеньёрыяльна-васальныя адносіны. На вяршыні феадальнай лесвіцы знаходзіўся «сеньёр сеньёраў» — кіраўнік дзяржавы, які раздаваў буйны́я зямельныя ўладанні (феоды) сваім васалам. Атрымаўшы зямельнае ўладанне, васал мог перадаць частку феода іншаму, драбнейшаму землеўласніку і ператварыцца такім чынам у яго сеньёра і гэтак далей, аж да самага дробнага «высакароднага» рыцара. Надзяленне феодам суправаджалася публічным прызнаннем васала сваёй залежнасці ад сеньёра. Апроч асноўнага абавязку — нясення вайсковай службы (30–40 дзён на год) — васал дапамагаў сеньёру фінансава ў цяжкія альбо ўрачыстыя моманты яго жыцця (выкуп з палону, пасвячэнне старэйшага сына ў рыцары, шлюб старэйшай дачкі і г. д.). Сеньёр, у сваю чаргу, гарантаваў васалу абарону і заступніцтва. У большасці краін Заходняй Еўропы, акрамя Англіі і Скандынавіі, адносіны ўнутры феадальнай іерархіі рэгуляваліся правілам: «Васал майго васала — не мой васал».

Правообладатель Издательский центр БГУ

Растлумачце сэнс выразу: «Васал майго васала — не мой васал». Даведайцеся, якое правіла было характэрнае для Англіі і Скандынавіі.




*Феадальная лесвіца*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*Феадальная іерархія* — гэта сістэма супадпарадкавання ўнутры феадальнага саслоўя. У кожнай краіне існавала ўласная «лесвіца» тытулаў.

У назвах асобных літаратурных твораў выкарыстоўваюцца феадальныя тытулы. Напрыклад, Р. Э. Распэ «Прыгоды **барона** Мюнхаўзэна», А. Дзюма «**Віконт** дэ Бражэлон, альбо 10 гадоў пасля», Р. Сабатыні «Суд **герцага**», Д. Марцін «**Рыцар** Сямі каралеўстваў», Ж. Санд «**Маркіз** дэ Вільмэр», А. Гардон «Блазан і **імператар**», М. Твэн «**Прынц** і жабрак», В. Скот «**Граф** Роберт Парыжскі», Р. Грын «Прыгоды **караля** Артура і рыцараў Круглага стала».



1. *Расстаўце прапанаваныя тытулы ў адпаведнасці з феадальнай іерархіяй (ад найвышэйшага да найніжэйшага).*
2. *Прывядзіце прыклады твораў беларускіх аўтараў, у назвах якіх выкарыстоўваюцца розныя тытулы.*

Сеньёрыяльна-васальная сістэма ўзаемаадносін давала гарантыі ўсім пластам феадальнага саслоўя. Але яна аслабляла каралеўскую ўладу, якая трапіла ў залежнасць ад сваіх васалаў. Усталяваўшыся ва ўладаннях, тыя атрымалі права перадачы іх у спадчыну, маглі чыніць на сваіх землях суд і збіраць падаткі і ўжо не жадалі падпарадкоўвацца каралю без дадатковых міласцей. Гэта прывяло да **феадальнай раздробленасці**, якая была ўласцівая большасці краін Заходняй Еўропы ў Высокім сярэднявеччы. Толькі ў Англіі праз асаблівыя адносіны васалітэту раздробленасць праяўлялася менш.

У Візантыі, дзе захоўвалася адносна моцная імператарская ўлада, феадальная іерархія не склалася, тут усе землеўласнікі заставаліся падданымі імператара і служылі яму. Але паступовы рост буйнога землеўладання прывёў да аслаблення цэнтральнай улады, што, як і ў Заходняй Еўропе, выклікала міжусобіцы.

**Прычыны феадальнай раздробленасці**

**Феадальная раздробленасць** — перыяд аслаблення цэнтральнай улады ў дзяржаве, распад яе тэрыторыі на драбнейшыя самастойныя ўладанні.

### 3. Саслоўі феадальнага грамадства.

Феадальнае грамадства было саслоўнае. У Еўропе ў Высокім сярэднявеччы існавалі тры **саслоўі:** духавенства, рыцарства, сяляне і гараджане. Першыя два саслоўі лічыліся прывілеяванымі, у іх абавязкі ўваходзіла маліцца і ваяваць. Трэцяе саслоўе з'яўлялася асноўнай крыніцай існавання і дабрабыту першых двух.

Прыналежнасць чалавека да саслоўя вызначалася пры нараджэнні, перайсці ў іншае саслоўе ён практычна не мог (выключэннем было духавенства).

**«Тыя, хто моліцца», «тыя, хто ваюе», «тыя, хто працуе»**

**Саслоўе** — сацыяльная група, члены якой маюць пэўныя юрыдычна замацаваныя правы і абавязкі, якія перадаюцца ў спадчыну.

IX–X стст. ▶ XIII–XIV стст. ▶ XV–XVI стст.

Заходняя Еўропа ▶ Цэнтральная Еўропа ▶ Усходняя Еўропа

*Фарміраванне прыгоннага права*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Прыгоннае права** — форма феадальнай залежнасці сялян, звязаная з прымацаваннем іх да зямлі і поўным падпарадкаваннем адміністрацыйнай і судовай уладзе феадала.

Правы найбольш шматлікага пласта, сялянства, былі абмежаваны яго залежным становішчам. Паступова адбываўся працэс яго **запрыгоньвання.**

З узнікненнем гарадоў і іх вызваленнем ад улады феадалаў у Высокім сярэднявеччы пачыналася фарміраванне паўнапраўных вольных гараджан.

## САСЛОЎІ ФЕАДАЛЬНАГА ГРАМАДСТВА



*Мініяцюра XIII ст.*

Укажыце, прадстаўнікі якіх саслоўяў паказаны на мініяцюры. Паводле якіх крытэрыяў вы гэта вызначылі?



„Прызначэнне авечак — даваць малако і воўну, быкоў — араць зямлю, сабак — абараняць авечак і быкоў ад ваўкоў. Бог бароніць іх, калі кожны від жывёл выконвае свой абавязак. Гэтак і саслоўі ўчыніў Ён, каб неслі розныя службы ў гэтым свеце".

Эадмер Кентэрберыйскі (пачатак XII ст.)

Э. Кентэрберыйскі пісаў, што ўсе людзі падобныя або да авечак, або да быкоў, або да сабак.

Растлумачце, каго аўтар меў на ўвазе пад кожным відам жывёл, у тым ліку «ваўкамі». Што ляжала ў аснове падзелу сярэдневяковага грамадства на саслоўі?

**Аснова эканомікі — сельская гаспадарка**

**4. Аграрная вытворчасць. Панаванне натуральнай гаспадаркі.** Большасць насельніцтва сярэдневяковай Еўропы жыла ў сельскай мясцовасці, адпаведна асноўным заняткам была сельская гаспадарка. Галоўнымі сельскагаспадарчымі культурамі, якія вырошчвалі і ўжывалі ў ежу еўрапейцы, былі збожжавыя (пшані-

ца, жыта, авёс і інш.). Жывёлагадоўля для большай часткі насельніцтва Еўропы з'яўлялася дадатковым заняткам. Скаціна (валы, аслы, каровы, пазней коні) была неабходная землеўладальнікам як цяглавая сіла для апрацоўкі зямлі, яна таксама забяспечвала людзей мясам, малаком. Важная роля ў жыцці сярэдневяковых еўрапейцаў належала паляванню і рыбалоўству.

Адметныя рысы натуральнай гаспадаркі

У Раннім сярэднявеччы ў Еўропе панавала **натуральная гаспадарка**, характэрнай рысай якой было аб'яднанне сялянскай працы з рамяством. Сяляне выраблялі сельскагаспадарчыя прадукты і рамесныя прадметы, прылады працы і адзенне для ўласных патрэб, а таксама для выплаты павіннасцей феадалу. Аднак стварэнне некаторых прадметаў патрабавала спецыяльных навыкаў і прыстасаванняў. У буйны́х феадальных уладаннях патрэба ў такіх вырабах пакрывалася як за кошт набыцця ў заезджых купцоў, так і арганізацыяй ганчарных, кавальскіх, гарбарных майстэрняў, у якіх працавалі рамеснікі-прафесіяналы з дваровай абслугі. З цягам часу для задавальнення патрэб аднавяскоўцаў і ў вёсках адбыўся частковы падзел працы: з'явіліся кавалі, ганчары, ткачы, гарбары, бондары і да т. п.

**Натуральная гаспадарка** — гаспадарка, у якой прадукты працы выраблялiся для задавальнення ўласных патрэб, а не на продаж.

Узнікненне і развіццё гарадоў

**5. Роля гарадоў у феадальным грамадстве. Асаблівасці рамяства і гандлю.** Эканамічнай асновай узнікнення гарадоў у Сярэднявеччы стала аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі і ператварэнне яго ў асобную галіну вытворчай дзейнасці. Рост гарадоў і гарадскога насельніцтва *(урбанізацыя)* у Заходняй Еўропе пачаўся ў X–XI стст. і актыўна працягваўся да канца XIII ст. Шляхі ўзнікнення гарадоў былі розныя і залежалі ад сацыяльна-эканамічных і геаграфічных фактараў. Найбольш інтэнсіўна яны ствараліся на гандлёвых шляхах і ў густанаселеных месцах. Найбуйнейшымі сталі Фларэнцыя, Мілан, пазней Лондан і Парыж, якія налічвалі каля 100 тысяч жыхароў.

Эканамічная дзейнасць гараджан, асноўнымі заняткамі якіх з'яўляліся рамяства і гандаль, была

Правообладатель Издательский центр БГУ

арганізавана згодна з *карпаратыўным* (прафесійным) прынцыпам, і толькі прыналежнасць да прафесійных аб'яднанняў давала магчымасць працаваць у горадзе.

**Прафесійныя арганізацыі рамеснікаў — цэхі**

Для абароны сваіх інтарэсаў рамеснікі ў XI–XIII стст. аб'ядноўваліся ў прафесійныя групы — цэхі. Кожны цэх уключаў рамеснікаў адной або некалькіх роднасных спецыяльнасцей, меў свой статут, у якім прапісваліся нормы і правілы вытворчасці. За выраб няякаснай прадукцыі прадугледжваліся суровыя пакаранні: штрафы, выстаўленне да ганебнага слупа, канфіскацыя прадукцыі або сыравіны, выключэнне з цэха. Апошняе было найбольш значнае, бо па-за цэхамі ў большасці гарадоў займацца рамёствамі забаранялася. Кожны цэх меў свае сцяг і герб, на гарадскіх святах ішоў асобнай калонай і быў вайсковай арганізацыяй — у гарадскім апалчэнні складаў асобны атрад. Вытворчасць ажыццяўлялася ў майстэрнях, дзе апроч майстра (уладальніка майстэрні) працавалі памочнікі — падмайстры і вучні, колькасць якіх строга рэгламентавалася. Тэрміны вучнёўства былі розныя — ад 2 да 7, часам 10–12 гадоў у залежнасці ад складанасці рамяства.

> Як вы лічыце, чаму ў аснову арганізацыі гарадской эканомікі быў пакладзены карпаратыўны прынцып?

> Найбольш шанаваным заняткам у Сярэднявеччы лічылася ювелірная справа. Менш прэстыжным — выраб тканін з лёну. Растлумачце, з чым гэта звязана.

З назапашваннем вытворчага вопыту пашыраўся асартымент рамесных вырабаў, павышалася іх якасць і, адпаведна, павялічвалася колькасць спецыяльнасцей і цэхаў. Так, напрыклад, цэхі збройнікаў распадаліся на цэхі мечнікаў, лучнікаў, шлемнікаў і г. д.

**Развіццё гандлю**

У Раннім сярэднявеччы сталых гандлёвых сувязей паміж асобнымі рэгіёнамі яшчэ не было. Знешні гандаль развіваўся слаба і задавальняў толькі патрэбы вярхушкі грамадства ў прадметах раскошы, а таксама рамеснікаў у сыравіне, што адсутнічала ў Еўропе. У Высокім сярэднявеччы канцэнтрацыя раменнай вытворчасці ў гарадах запатрабавала з'яўлення пасрэднікаў паміж вытворцамі і спажыўцамі.

Цэнтральнай фігурай гандлю стаў купец. Першапачаткова купцамі рабіліся рамеснікі, якія разбагацелі, забяспечвалі калег сыравінай і арганізоўвалі збыт гатовай прадукцыі. Звычайна яны перадавалі свой статус у спадчыну.




*Развіццё гарадоў і гандлю ў Высокім сярэднявеччы*

Назавіце віды гандлёвых шляхоў. Назавіце перавагі і недахопы кожнага з іх у эпоху Сярэднявечча.
Назавіце найбуйнейшыя гандлёвыя рэгіёны ў Еўропе. Ці ўдзельнічалі беларускія гарады ў еўрапейскім гандлі? Прывядзіце доказы.
Пералічыце еўрапейскія гарады, у назвах якіх ёсць складнік «бург». Што агульнага ў іх паходжанні?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Асноўнымі цэнтрамі знешняга гандлю былі Венецыя і Генуя. У акваторыі Паўночнага і Балтыйскага мораў вядучыя пазіцыі ў гандлі займаў саюз германскіх гарадоў Ганза.

Паралельна з пашырэннем знешняга гандлю фарміраваўся і ўнутраны — першапачаткова паміж горадам і найбліжэйшай сельскай акругай, затым паміж гарадамі і асобнымі рэгіёнамі. У XII–XIII стст. важным цэнтрам гандлю была правінцыя Шампань у Францыі, дзе амаль цэлы год ладзіліся кірмашы.

Успомніце, што такое кірмаш.

Гандаль у сярэдневяковай Еўропе быў справай складанай і небяспечнай. На моры купца чакалі штормы і піраты, на сушы — кепскія дарогі, самадурства феадалаў пры зборы мытаў, разбойнікі. Для ўзаемадапамогі і абароны сваіх інтарэсаў купцы аб'ядноўваліся ў *гільдыі*, якія, у адрозненне ад цэхаў, звычайна ўключалі гандляроў некалькіх гарадоў, а часам і цэлых рэгіёнаў.

Выявіце паходжанне прымаўкі: «Што з воза ўпала, тое прапала». Растлумачце яе сэнс.

### Перадумовы ўзнікнення банкаўскай справы

Развіццё гандлю спрыяла фарміраванню грашова-грашовых адносін. На рынках вялікім попытам карысталіся паслугі грашовых мянял, якія абменьвалі манеты розных дзяржаў, вызначалі іх сапраўднасць. Мянялы збіралі вялікія грашовыя сумы і, пазычаючы іх пад вялікі працэнт, рабіліся ліхвярамі. Пастулова на аснове крам мянял і ліхвяроў з'яўляліся першыя банкі.

### Барацьба гарадоў за самакіраванне

Для многіх гарадоў, залежных ад феадалаў, вызначаныя павіннасці і падаткі былі цяжкімі. Таму ў X–XIII стст. яны пачалі барацьбу за атрыманне права на самакіраванне. Часта гараджане дабіваліся такога права з дапамогай зброі, а часам набывалі яго ў феадалаў за вялікую плату. У тых гарадах, якім удавалася атрымаць самастойнасць, утвараліся незалежныя ад феадала органы кіравання. Звычайна гэта была гарадская рада на чале з мэрам або бурмістрам, якая засядала ў спецыяльным будынку — *ратушы*. Гораду дазвалялася чаканіць манеты, ствараць уласны суд, набіраць апалчэнне,

а гараджанам гарантавалася асабістая свабода ад улады феадалаў.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З гарадскога права, дараванага імператарам Фрыдрыхам II гораду Гослару 10 ліпеня 1219 г.**

Калі ж які-небудзь чужак прыйшоў жыць у названы горад і так заставаўся ў ім год і дзень, прычым ні разу яму не ставілі на від рабскага стану, не выкрылі яго ў гэтым і сам ён у гэтым не прызнаваўся, дык няхай ён карыстаецца агульнаю з іншымі грамадзянамі свабодаю; і па смерці ягонай ніхто хай не пасмее аб'яўляць яго сваім рабом.

1. *Колькі неабходна было пражыць у горадзе залежнаму селяніну, каб атрымаць свабоду? У якой сярэдневяковай прыказцы гэты факт знайшоў адлюстраванне?*
2. *Растлумачце, чаму такую норму ўключалі ў сістэму гарадскога права.*
3. *На тэрыторыі якой сучаснай дзяржавы знаходзіцца Гослар?*



*Імператарскі палац. Г. Гослар. Сучасны выгляд*

У Сярэднявеччы склаліся разнастайныя тыпы і формы гарадскога права. Прычым законы, распрацаваныя ў адных гарадах, часта рабіліся тыповымі і для іншых (напрыклад, магдэбургскае права, любекскае права і інш.).

Правообладатель Издательский центр БГУ

*У Раннім і Высокім сярэднявеччы на еўрапейскім кантыненце адбывалася станаўленне і развіццё феадалізму. Галоўнае багацце — зямля — канцэнтравалася ў руках феадалаў. Сфарміравалася лесвіца панавання-падпарадкавання, заснаваная на пазямельнай і асабістай залежнасці аднаго феадала ад іншага. Сяляне са свабодных землеўладальнікаў ператварыліся ў пазямельна і асабіста залежных ад феадалаў. Эканоміка краін Еўропы мела аграрны характар. У сельскай гаспадарцы ў Раннім сярэднявеччы панавала натуральная гаспадарка, а ў Высокім сярэднявеччы пачалі развівацца таварна-грашовыя адносіны.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
|---|---|
| IX–XI стст. — станаўленне феадалізму ў Еўропе | IX–XI стст. — фарміраванне шматукладнай эканомікі (суіснаванне родаплемяннога, рабаўладальніцкага і пачаткаў феадальнага ўкладаў) |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце шляхі фарміравання феадалізму ў Еўропе.
2. Складзіце параўнаўчую табліцу «Становішча залежнага селяніна і гараджаніна». Крытэрыі для параўнання (не менш за тры) распрацуйце самастойна. Зрабіце вывад.
3. Якую ролю адыгрывалі гарады ў Раннім і Высокім сярэднявеччы?
4. З чым, на вашу думку, было звязана паступовае пашырэнне ўнутранага і знешняга гандлю ў Высокім сярэднявеччы?
5. Прааналізуйце змест параграфа і дапоўніце схему «Характэрныя рысы феадалізму». Раскажыце пра феадальнае грамадства ў Еўропе, канкрэтызаваўшы кожную характэрную рысу прыкладамі (фактамі).



# § 9. Палітычнае і сацыяльнае развіццё дзяржаў Азіі ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча

АРАБСКІ ХАЛІФАТ
ІСЛАМ СЁГУН
ЯПОНІЯ ВАРНА
ІНДЫЯ ХАЛІФ КІТАЙ
КАСТА МАГАМЕТ

**1. Палітычная карта Азіі.** У Раннім і Высокім сярэднявеччы ў Азіі найбольш актыўна развіваліся рэгіёны старых цывілізацыйных цэнтраў: Блізкі Усход, Сярэдняя Азія, Індыя, Кітай. Разам з тым упершыню ў гісторыі ўзвысіліся невядомыя раней народы — арабы, туркі-сельджукі, манголы.

Арабскі халіфат

У VII ст. на арэну сусветнай гісторыі выйшлі арабы, якія здаўна жылі на Аравійскім паўвостраве. Узнікненне новай рэлігіі — ісламу — спрыяла аб'яднанню арабскіх плямёнаў. У VII–VIII стст. арабы на чале з Магаметам, які абвясціў сябе пасланнікам і прарокам адзінага Бога, і яго паслядоўнікамі ў выніку заваявальных паходаў стварылі велізарную імперыю — Арабскі **халіфат**. Новае дзяржаўнае ўтварэнне раскінулася на агромністых тэрыторыях ад Атлантычнага акіяна да межаў Кітая і аб'яднала многія народы.

**Халіфат** — дзяржава мусульман на чале з рэлігійным лідарам — халіфам.

Ваеннаму поспеху арабаў спрыяла ў тым ліку выгадная знешнепалітычная сітуацыя на Блізкім і Сярэднім Усходзе: найбуйнейшыя імперыі таго часу — Візантыйская і Персідская — вялі адна супраць адной працяглыя войны.

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Арабскі халіфат*

Прасачыце па картасхеме рост тэрыторыі Арабскага халіфата. У які час ён дасягнуў найвышэйшага росквіту? Якія еўрапейскія тэрыторыі былі захоплены арабамі? Чаму ім адносна лёгка і хутка ўдалося захапіць велізарныя тэрыторыі?

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Як латынь на Захадзе і грэчаская ў Візантыі, афіцыйнай мовай у Арабскім халіфаце была арабская.

Сёння «арабскі свет» — гэта акрэслены геаграфічны рэгіён, які складаецца з краін паўночнай і ўсходняй часткі Афрыкі, Блізкага Усходу, населеных арабамі. У кожнай з іх арабская мова з'яўляецца афіцыйнай.

1. *Назавіце сучасныя дзяржавы, у якіх арабская мова з'яўляецца дзяржаўнай.*
2. *Пералічыце пяць найбуйнейшых гарадоў арабскага свету. Якія з іх уваходзілі ў склад Арабскага халіфата?*

Створаную арабамі шматнацыянальную дзяржаву аб'ядноўвалі рэлігія (іслам) і арабская мова. Аднак у канцы VIII — пачатку IX ст. гіганцкая дзяржава вычарпала магчымасці бясконца пашыраць свае межы і трымаць пад кантролем завяяваныя тэрыторыі. Паўплывалі неаднародны ўзровень эканамічнага развіцця рэгіёнаў, слабасць гаспадарчых сувязей, палітычная нестабільнасць, выкліканая народнымі паўстаннямі і ўзмацненнем пазіцый кіраўнікоў асобных правінцый. Імперыя аслабла і пачала распадацца на мноства часткова аўтаномных абласцей (эміратаў, султанатаў), дзе часта мяняліся кіраўнікі і межы.

Аслабленнем арабскай дзяржавы скарысталіся суседзі. Уладанні халіфата сталі лёгкай здабычай качэўнікаў — туркаў-сельджукаў (XI ст.) і манголаў (XIII ст.). Арабскі халіфат канчаткова спыніў сваё існаванне ў 1258 г., пасля захопу Багдада манголамі.

### Мусульманскія заваёвы Індыі

У Раннім і Высокім сярэднявеччы мусульмане здолелі заваяваць Паўночную Індыю. У VIII ст. арабы падпарадкавалі тэрыторыю Сінда (сучасны Пакістан). Ад канца X ст. на Паўночную Індыю пачалі нападаць валадары мусульманскіх дзяржаў, якія ўзніклі пасля распаду Арабскага халіфата на тэрыторыі Сярэдняй Азіі і Ірана. У пачатку XIII ст. нашэсці арабаў завяршыліся стварэннем у Паўночнай Індыі самастойнай дзяржавы — *Дэлійскага султаната* (1206–1526 гг.). У канцы XIII — пачатку XIV ст. дэлійскім султанам удалося падпарадкаваць сабе амаль усю Індыю.







Дэлійскі султанат



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Кітай**

Асаблівасцю палітычнага развіцця Кітая ў Раннім і Высокім сярэднявеччы былі спробы цэнтралізацыі ўлады, якія часта змяняліся міжусобнымі войнамі за ўладу, і амаль бесперапынная барацьба з качэўнікамі. Перыяды палітычнай магутнасці Кітая чаргаваліся з перыядамі раздробленасці, заняпаду і падпарадкавання іншаземным захопнікам. У тыя часы ў Кітаі змянілася некалькі кіруючых дынастый.

## КІРУЮЧЫЯ ДЫНАСТЫІ Ў КІТАІ

| Дынастыя Суй | Дынастыя Тан | 5 дынастый і 10 царстваў | Дынастыя Сун | Дынастыя Юань |
|---|---|---|---|---|
| 581–618 гг. | 618–907 гг. | 907–960 гг. | 960–1279 гг. | 1271–1368 гг. |

907–960 гг. — час «пяці дынастый і дзесяці царстваў». Чаму гэты перыяд атрымаў такую назву?

Кітай праводзіў актыўную знешнюю экспансію: ваяваў з паўночнымі і заходнімі суседзямі, умешваўся ва ўнутраныя справы Карэі і краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Ваенныя паходы сягалі далёка на захад, але паражэнне ад арабаў у Таласкай бітве (751 г.) паклала ім канец.

У XIII ст. заваёўваць Кітай пачалі манголы, якія да таго часу аб’ядналіся пад уладай Чынгісхана. Скарэнне Кітая манголамі працягвалася каля 70 гадоў. Заваёўнікі ўключылі яго ў склад сваёй дзяржавы і паставілі тут сваю дынастыю — Юань, заснавальнікам якой стаў унук Чынгісхана Хубілай. Толькі ў другой палове XIV ст. у выніку паўстання манголы былі выгнаны з Кітая.

**Японія**

Першае дзяржаўнае ўтварэнне на Японскіх астравах узнікла прыкладна ў IV ст. на землях народа Ямата. У VII ст. Ямата было перайменавана ў Ніхон — Краіну ўзыходзячага сонца. На працягу Сярэднявечча японскія валадары паступова падпарадкавалі сабе ўсе

тэрыторыі астравоў. Японская дзяржава настолькі ўзмацнілася, што здолела адбіць напады мангольскай арміі.

**2. Дзяржаўны лад у сярэдневяковых цывілізацыях Азіі.** Дзяржава ў сярэдневяковых цывілізацыях Азіі з'яўлялася найважнейшым органам кіравання. Яна ажыццяўляла кантроль над разнастайнымі аспектамі жыцця насельніцтва: зборам падаткаў, падтрыманнем парадку і абаронай межаў. Ва ўсіх азіяцкіх дзяржавах панавала манархічная форма кіравання.

**Манархічная форма праўлення**

Для большасці дзяржаў Азіі характэрная наяўнасць шматлікіх чыноўнікаў, якія дапамагалі ў кіраванні краінай вярхоўнаму валадару. Арабскі халіфат — **тэакратычная дзяржава**, на чале якой стаяў *халіф* — палітычны і духоўны лідар, што засяроджваў у сваіх руках абсалютную ўладу. Найвышэйшай службовай асобай пры халіфе быў *візір*, у падпарадкаванні якога знаходзіўся разгалінаваны чыноўніцкі апарат. Краіна была падзелена на правінцыі, якімі кіравалі ваенныя намеснікі, прызначаныя візірам, — *эміры*, *султаны*. Іх асноўнымі абавязкамі былі збор падаткаў, камандаванне войскамі, кіраванне мясцовай адміністрацыяй.

**Разгалінаваны бюракратычны апарат**

**Тэакратыя** — тып дзяржаўнага ўладкавання, пры якім на чале краіны стаіць рэлігійны лідар.

На чале Кітая стаяў імператар, які лічыўся Сынам Неба — вярхоўнага бажаства, шанаванага кітайцамі. Ён меў непадзельную ўладу над жыццямі і маёмасцю сваіх падданых і ўзначальваў зямную сацыяльную іерархію. Сувязным звяном паміж імператарам і народам былі чыноўнікі, яны забяспечвалі стабільнасць і парадак у грамадстве. Чыноўнікаў у Кітаі выбіралі на падставе ведаў і ўменняў, пацверджаных здачай дзяржаўных экзаменаў, а не сацыяльнага статусу. Ад кандыдатаў патрабаваліся веды, якія ахаплівалі шырокі спектр тэм, у тым ліку гісторыю, літаратуру, філасофію і права. Тыя, хто прэтэндаваў на найвышэйшыя пасады, здавалі экзамен непасрэдна імператару і штогод пераатэстоўваліся. Чыноўнікі займаліся

Правообладатель Издательский центр БГУ

адміністрацыйнымі і юрыдычнымі пытаннямі, кіравалі правінцыямі, збіралі падаткі, кантралявалі адукацыю, удзельнічалі ў дыпламатычных працэсах.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Прааналізуйце вытрымку з дакумента і схему «Сістэма дзяржаўнага кіравання імперыі Тан». Адкажыце на пытанні.

**Фрагмент з Сінь Тан шу**
**«Дзяржаўная арганізацыя імперыі Тан»**

«…У пачатку свайго праўлення Тайцзун праверыў усіх чыноўнікаў, што знаходзіліся ў цэнтры і на перыферыі, зацвердзіў штат 730 чалавек. Ён казаў: „Я лічу цалкам дастатковым гэты штат для прыцягнення ўсіх мудрых і таленавітых у Паднябеснай“. Аднак нават у той час былі створаны пазаштатныя пасады. Пасля яшчэ і яшчэ зацвярджалі пазаштатныя пасады, іх лічылі як асноўныя пасады.

…Тое, што Сын Неба выдаваў указы і асабіста праводзіў адбор, мела мэтай прыцягненне найвышэйшых талентаў і называлася „імператарскі адбор“».

## СІСТЭМА ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ІМПЕРЫІ ТАН (618–907 гг.)




*1. Ахарактарызуйце сістэму чыноўніцкага апарату ў Кітаі.*
*2. Назавіце плюсы і мінусы такога падыходу да кіравання дзяржавай.*

**3. Традыцыйнае грамадства.** Пад тэрмінам **«традыцыйнае грамадства»** разумеюць усякае дакапіталістычнае грамадства. Яго асноўнымі характарыстыкамі з'яўляюцца аграрны характар гаспадаркі, манархічная форма праўлення, рэлігія як адзіная форма ідэалогіі, мускульная сіла чалавека і жывёл, якая рухае прылады працы. Традыцыйнае грамадства таксама характарызуецца наяўнасцю мінімальнай прыватнай уласнасці, жорсткай цэнтралізаванай уладай, панаваннем дзяржавы над грамадскімі і асабістымі адносінамі, каштоўнасцямі і памкненнямі. Асаблівая роля ў такіх грамадствах належыць традыцыям, рытуалам і звычаям.

Характэрныя рысы традыцыйнага грамадства

**Традыцыйнае грамадства** — тып грамадства з аграрным укладам, манархічнай сістэмай кіравання, перавагай рэлігійных каштоўнасцей і светапогляду, асаблівай роляй традыцый.

Традыцыйнае грамадства было характэрнае для ўсіх цывілізацый Сярэднявечча. Але калі Еўропа ў перыяд, які мы вывучаем, паступова станавілася на шлях разбурэння традыцыйнага грамадства, дык ва ўсходніх цывілізацыях яно захоўвалася яшчэ працяглы час.

**4. Асаблівасці сацыяльнай структуры грамадства ў краінах Азіі.** Сацыяльная структура грамадства ў краінах Азіі істотна адрознівалася ад заходнееўрапейскай. Асаблівасці сярэдневяковых азіяцкіх грамадстваў былі абумоўлены вызначальнай роляй рэлігіі ў рэгуляванні адносін паміж людзьмі, шырокімі ўладнымі паўнамоцтвамі кіраўнікоў дзяржаў, існаваннем дзяржаўнай уласнасці на зямлю.

Форма пазямельных адносін

Галоўным уласнікам усіх зямель выступала дзяржава ў асобе вярхоўнага валадара. Таму найбольш пашыранай формай зямельных адносін на Усходзе было *ўмоўнае землеўладанне*. Валадар надзяляў зямлёй сваіх васалаў на пэўных умовах, напрыклад за нясенне службы (адміністрацыйнай, вайсковай, прыдворнай). Фактычна ўладальнікі зямлі не рабіліся ўласнікамі і не маглі перадаць яе ў спадчыну, а толькі мелі права на атрыманне часткі даходаў з насельніцтва замацаванай за імі тэрыторыі.

Асаблівасці сацыяльнай структуры ў мусульманскіх дзяржавах

У мусульманскіх дзяржавах сацыяльную структуру грамадства вызначаў іслам. На чале дзяржавы стаяў халіф, які абапіраўся на прыдворную бюракратыю,

Правообладатель Издательский центр БГУ

Як мусульмане ставіліся да хрысціян і іўдзеяў?

ніжэй знаходзіліся вольныя мусульмане, сярод якіх асаблівае месца займалі арабы. Затым ішлі «людзі кнігі» — хрысціяне і іўдзеі. На самых ніжэйшых прыступках сацыяльнай лесвіцы знаходзіліся «няверныя» (усе, хто не верыў у адзінага Бога) і рабы.

**Сацыяльная іерархія ў Кітаі**

У сярэдневяковым Кітаі сацыяльная структура была больш складаная. Да прывілеяванай часткі грамадства належалі члены імператарскай сям'і, арыстакраты-землеўласнікі і дзяржаўныя чыноўнікі. Крыху асобна стаяла духавенства. Асноўным насельніцтвам былі свабодныя людзі, пераважна сяляне. Яшчэ ніжэй знаходзіліся рамеснікі і гандляры. Самую ніжэйшую ступень займалі слугі, залежныя сяляне і рабы.

Складзіце схему «Іерархічная арганізацыя кітайскага грамадства».

**Каставая сістэма ў Індыі**

У Індыі сацыяльную структуру грамадства вызначала каставая сістэма. У яе аснову леглі чатыры сацыяльна-рэлігійныя групы — варны: брахманы (жрэцтва), кшатрыі (ваяры і чыноўніцтва), вайш'і (сяляне) і шудры (слугі). На самым ніжэйшым узроўні сацыяльнай іерархіі знаходзіліся недакранальныя — людзі, што займаліся «нячыстымі» прафесіямі.



Згодна з легендай, прадстаўнікі варнаў утварыліся з розных частак цела Бога. Успомніце імя Бога і назавіце рэлігію.

У далейшым на аснове варнаў сфарміраваліся касты. Яны былі звязаныя з пэўнымі прафесіямі і маглі ўключаць у сябе людзей розных варнаў. Каставая прыналежнасць вызначала многія аспекты жыцця індывіда, у тым ліку шлюб, стасункі і прафесійныя магчымасці. Нарадзіўшыся ў пэўнай касце, індыец не мог перайсці ў іншую. Індуізм вучыў, што змяніць сваё становішча чалавек можа толькі пасля перараджэння. І чым больш правільна ён жыў, тым лепшае будзе яго жыццё ў наступным увасабленні.

**Сацыяльная структура японскага грамадства**

Унікальная сацыяльная структура грамадства склалася ў Японіі. У яе аснове ляжалі адносіны васалітэту. Верхнюю ступень у сацыяльнай іерархіі займаў імператар, які лічыўся сынам багіні Сонца. Першапачаткова яго ўлада была дастаткова моцная, але з XII ст. яна перайшла да ваеннага правадыра — *сёгуна*, хоць

імператар заставаўся сімвалам адзінства і рэлігійнага аўтарытэту. Ніжэй за сёгуна на сацыяльнай лесвіцы знаходзіліся даймё (уладальнікі зямельных участкаў), якія з'яўляліся яго васаламі.

Самураі складалі наступны пасля даймё пласт грамадства і забяспечвалі ваенную моц даймё і сёгуна. Напачатку яны былі прафесійнымі ваярамі і служылі наймітамі ў мясцовых землеўласнікаў. Але з цягам часу ператварыліся ў замкнёную прывілеяваную сацыяльную групу (ваеннае саслоўе). Самураі прытрымліваліся строгага кодэкса гонару — бусідо («Шлях ваяра»), які загадваў быць адданымі свайму гаспадару, сумленнымі і адважнымі. Ад іх патрабавалася не толькі фізічная падрыхтоўка, але і духоўнае развіццё, таму валоданне мячом і мастацтва бою суправаджаліся заняткамі каліграфіяй і паэзіяй. Самураі адыгрывалі значную ролю ў палітычным жыцці дзяржавы.



*Мінамота Ёрымота, першы сёгун. Роспіс па шоўку. Мастак Фудзівара Таканобу. 1179 г.*

У падмурку феадальнай піраміды ў Японіі знаходзіліся сяляне, рамеснікі і гандляры. Яны абавязаны былі плаціць падаткі сваім феадалам.




*Іерархічная арганізацыя японскага грамадства*



Правообладатель Издательский центр БГУ



### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*Еўрапейскі рыцар і японскі самурай* — саслоўі сярэдневяковага грамадства. Нягледзячы на тое што іх эпоха прамінула, рыцарская этыка і кодэкс гонару самураяў не страцілі сваёй актуальнасці і цяпер.

1. *Даведайцеся паходжанне слоў «рыцар» і «самурай».*
2. *Што аб'ядноўвае прадстаўнікоў дадзеных саслоўяў?*
3. *Назавіце адрозненні ў поглядах рыцараў і самураяў у адносінах да жанчыны, рэлігіі, адукацыі.*
4. *Зрабіце вывад, якія каштоўнасці, уласцівыя для рыцараў і самураяў, не страцілі сваёй актуальнасці.*

### Роля абшчыны

У Раннім і Высокім сярэднявеччы ў Азіі ключавое значэнне ў сацыяльнай структуры грамадства і штодзённым жыцці людзей мела абшчына. У Кітаі вясковыя абшчыны, што складаліся са сваяцкіх кланаў, кіраваліся старэйшынамі клана і адыгрывалі галоўную ролю ў размеркаванні зямлі, урэгуляванні спрэчак і выкананні рэлігійных абрадаў. У арабскім свеце абшчыны былі асновай грамадскай арганізацыі, племянная прыналежнасць вызначала сацыяльны статус, правы і абавязкі чалавека. У Індыі касты забяспечвалі сацыяльную падтрымку і абарону сваім членам, спрыялі захаванню сацыяльнага парадку і эканамічнай стабільнасці. Усе пасады і абавязкі, якія выконваліся абшчыннікамі, перадаваліся ў спадчыну з пакалення ў пакаленне. У Японіі сялянская абшчына адказвала за ўплату падаткаў, магла самастойна вырашаць унутраныя пытанні.

Усе сяляне жылі ў замкнёным свеце вясковай абшчыны, якая выконвала важную ролю ў жыцці грамадства і ажыццяўляла не толькі гаспадарчую і адміністрацыйную, але і рэлігійную функцыю. Абшчыны маглі кіраваць уласнымі справамі і нават весці перамовы з дзяржавай па пытаннях падаткаў і абавязкаў.

*На палітычнай карце Азіі ў Раннім і Высокім сярэднявеччы існавала некалькі буйных цывілізацый, галоўнымі з якіх былі кітайская, індыйская і араба-ісламская. Усе яны характарызаваліся наяўнасцю традыцыйнага грамадства, якое абапіралася на звычаі і традыцыі. У развітых цывілізацыях Азіі склалася своеасаблівая сістэма дзяржаўнага кіравання і грамадская іерархія.*

| **калі ў свеце...** | **на тэрыторыі Беларусі...** |
| --- | --- |
| VII–VIII стст. — утварэнне Арабскага халіфата і арабскія заваёвы | VI–VIII стст. — рассяленне славян |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Вядомы гісторык Р. Ю. Віпер пісаў: «Імя арабаў зрабілася назвай не племені, а веры і культуры». Растлумачце сэнс дадзенага выказвання.
2. Якія фактары, на вашу думку, спрыялі адзінству Арабскага халіфата, а якія — яго распаду?
3. Пералічыце прыкметы традыцыйнага грамадства. Якія агульныя рысы характэрныя для традыцыйных грамадстваў краін Азіі — Індыі, Кітая, Японіі? Пералічыце выяўленыя вамі адрозненні.
4. Назавіце рэгіянальныя асаблівасці сацыяльнай структуры грамадства ў развітых дзяржавах Азіі ў Раннім і Высокім сярэднявеччы.
5. Параўнайце сістэмы дзяржаўнага кіравання ў краінах Азіі і Заходняй Еўропы ў Раннім і Высокім сярэднявеччы. Зрабіце вывад.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 10. Рэлігіі ў жыцці сярэдневяковых грамадстваў

ПАТРЫЯРХ БУДЫЗМ
ХРЫСЦІЯНСТВА КАРАН
ІСЛАМ КРЫЖАК ЦАРКВА
ІНКВІЗІЦЫЯ ДУХАВЕНСТВА
МІТРАПАЛІТ БІБЛІЯ
ПАПА РЫМСКІ

Успомніце, калі з'явілася хрысціянства.

**1. Хрысціянізацыя Еўропы.** Хрысціянства, што ўзнікла ў Рымскай імперыі, было найбольш значным элементам антычнага духоўнага жыцця, які пашырыўся ў сярэдневяковым еўрапейскім грамадстве. Яно прэтэндавала на ролю ўсеагульнага, універсальнага вучэння. Перавагай гэтай рэлігіі было адзінства супольнасці хрысціян, адзіная царква. Вера значнай колькасці людзей у адзінага Бога рабіла іх больш згуртаванымі і арганізаванымі.



Кафедральны сабор Святога Эчміядзіна — адзін з найстаражытнейшых храмаў свету. Пачатак будаўніцтва царквы датуецца IV ст.
З 2000 г. уваходзіць у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

*Эчміядзінскі кафедральны сабор. Арменія. Сучасны выгляд*

Успомніце значэнні паняцця «царква». У якім з іх гэтае слова выкарыстоўваецца ў тэксце параграфа, а ў якім — у подпісе да дадзенай выявы?

«Чалавек царквы»

З'явілася духавенства як асобны сацыяльны пласт, які меў права здзяйсняць культавыя дзеянні, набажэнствы. Сфарміравалася паняцце «чалавек царквы», таму што толькі царква гарантавала вернікам сувязь з Богам і надзею на ўратаванне праз рэгуляванне штодзённага чалавечага жыцця нават у дробязях. Гэта павышала ў вачах вернікаў аўтарытэт духавенства.

Шляхі хрысціянізацыі Еўропы

Хрысціянізацыя Еўропы была доўгатэрміновым і складаным працэсам, які спалучаў місіянерскую дзейнасць царквы з заваяваннем і абарачэннем у новую веру не толькі казанямі, але і сілай зброі. Спробы масавага хрышчэння часта сустракалі супраціўленне значнай часткі насельніцтва, якое заставалася вернае ранейшым багам, не разумела і не прымала новую рэлігію.

Практычныя меркаванні і палітычныя матывы прымушалі варварскіх каралёў прымаць хрышчэнне. Адзіная вера дапамагала згладжваць міжплемянныя адрозненні, умацоўвала вярхоўную ўладу, аб'ядноўвала насельніцтва ў адзін народ. У канцы V ст. хрысціянства прыняў кароль франкаў Хлодвіг. Папа Рымскі і духавенства Галіі падтрымлівалі Хлодвіга ў яго захопніцкай палітыцы, апраўдваючы яе тым, што кароль змагаецца супраць ворагаў царквы.

Чаму саюз франкскіх валадароў з хрысціянскай царквой быў узаемавыгадны?

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Хрышчэнне Хлодвіга ахінута разнастайнымі легендамі. Паводле адной з іх, Хлодвігу падчас бітвы з'явіўся анёл з лілеяй і сказаў, каб той зрабіў гэтую кветку сваім сімвалам і завяшчаў нашчадкам.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, даведайцеся, якія яшчэ існуюць легенды, звязаныя з хрышчэннем Хлодвіга.*
2. *Назавіце аўтара крылатага выразу: «Пакланіся таму, што спальваў, і спалі тое, чаму пакланяўся». Як вы разумееце сэнс дадзенага выказвання?*
3. *Прывядзіце прыклады хрысціянскіх сімвалаў і знакаў, якія захавалі сваё сакральнае значэнне.*



*Хрышчэнне Хлодвіга. Барэльеф. Францыя. Канец IX ст.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Растлумачце, чаму пра поўную перамогу хрысціянства на поўначы і ўсходзе еўрапейскага кантынента можна казаць толькі ў XIII–XIV стст.




*Распаўсюджванне хрысціянства*

Растлумачце сэнс фразы: «Маліся і працуй!», якая пазней стала крылатай.

Асаблівую ролю ў распаўсюджванні хрысціянства ў Еўропе адыгралі манастыры, якія ўзніклі ў III ст. як паселішчы пустэльнікаў. Заходняе манаства са сваім асаблівым статутам зарадзілася ў VI ст. Апроч малітвы манахі павінны былі займацца сельскай гаспадаркай, вывучаць Свяшчэннае Пісанне, перапісваць кнігі, выхоўваць дзяцей, весці місіянерскую дзейнасць.



*Сінайскі манастыр. Егіпет. Сучасны выгляд. Адзін з найстаражытнейшых хрысціянскіх манастыроў, якія дзейнічаюць беспераnынна. Заснаваны ў IV ст.*

## ТЫПЫ МАНАСТЫРОЎ

**Абацтва** — каталіцкі манастыр



**Лаўра** — буйны́ мужчынскі праваслаўны манастыр



**Скіт** — жытло пустэльніка



У XIII–XIV стст. хрысціянства стала пануючай рэлігіяй у Еўропе.

**2. Узаемаадносіны паміж свецкай і царкоўнай уладай.** У IV ст. хрысціянства ў Рымскай імперыі стала **дзяржаўнай рэлігіяй**. На Ватыканскім узгорку ў Рыме месцілася рэзідэнцыя рымскіх біскупаў, якіх пачалі называць пáпамі.

**Дзяржаўная рэлігія** — веравучэнне, замацаванае ў якасці пануючага ў дзяржаве на заканадаўчым узроўні.

У VIII ст. пры ўдзеле французскага караля Піпіна Кароткага была створана Папская дзяржава, у якой папы валодалі не толькі духоўнай, але і свецкай уладай. Ва ўмовах слабасці варварскіх дзяржаў Папа Рымскі паступова ўстаў на чале ўсяго заходнееўрапейскага духавенства. Яго роля забяспечвалася матэрыяльнымі рэсурсамі. Звычай вернікаў прыносіць у царкву дары вёў да росту царкоўнай маёмасці, якая лічылася свяшчэннай і не магла быць адчужана або абкладзена падаткам. З цягам часу царква назапасіла значныя багацці, у тым ліку і зямельныя.

**Павышэнне ролі каталіцкай царквы**

Духоўны і матэрыяльны ўплыў царквы ставіў у залежнасць ад яе многіх валадароў варварскіх каралеўстваў, хоць пры недахопе зямлі такія валадары часам рабілі секулярызацыю — канфіскацыю царкоўных зямель. Карл Вялікі, як больш тонкі палітык, абапіраючыся на саюз з Папам і выкарыстоўваючы хрысціянскую рэлігію як сродак кансалідацыі і ўмацавання цэнтральнай улады, значна пашырыў межы Франкскай дзяржавы. У асобе імператара франкаў Рымская царква атрымала надзейнага абаронцу сваіх зямельных уладанняў ад знешніх замахаў. Імператар узаконіў царкоўную дзесяціну, якая была абавязковая для ўсіх хрысціян Франкскай імперыі. Папа, усклаўшы імператарскую карону на Карла, тым самым падкрэсліў, што свецкая ўлада, якая б магутная яна ні была, набывае законнасць толькі блаславеннем царквы.

У IX–X стст. Рымская царква дзякуючы ўнутранай цэнтралізацыі і падтрымцы імператараў з’ялялася магутным феадалам, а да сярэдзіны XII ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

ператварылася ў маналітную аўтарытэтную і ўплывовую арганізацыю ў Еўропе.

Найбольшай магутнасці Рымская царква дасягнула ў часы папы Інакенція III (1198–1216 гг.). Стаўшы на чале царквы, ён рашуча ўмешваўся ў палітыку еўрапейскіх дзяржаў, узяўшы на сябе ролю арбітра паміж феадальнымі правадырамі. Менавіта Інакенцій III быў натхняльнікам паходаў крыжакоў ва Усходнюю Прыбалтыку.

Хрысціянскі свет у XI ст.

**3. Раскол хрысціянскай царквы.** У XI ст. даўняя спрэчка пра верхавенства ў хрысціянскім свеце прывяла да канфлікту паміж рымскімі папамі і канстанцінопальскімі патрыярхамі. У Візантыі патрыярхі не маглі ўзвысіцца над свецкаю ўладай, бо хрысціянская царква моцна залежала ад магутнай імператарскай улады. Візантыйскія імператары ўжо з V ст. адыгрывалі важную ролю ў царкоўным жыцці, нават права склікання царкоўных сабораў належала імператару.

Тым не менш патрыярхі лічылі сябе найвышэйшымі хрысціянскімі іерархамі, а папы рымскія прэтэндавалі на панаванне ва ўсім хрысціянскім свеце.

Раскол царквы

У выніку ў *1054 г.* кіраўнікі рымскай і канстанцінопальскай цэркваў наклалі адзін на аднаго *анафему* (праклён), адлучылі адзін аднаго ад царквы і часова спынілі зносіны. Хрысціянская царква падзялілася на заходнюю — каталіцкую і ўсходнюю — праваслаўную.

Напачатку хрысціянскі свет абыякава паставіўся да гэтага канфлікту. Але сітуацыя пагоршылася ў *1204 г.*, калі заходнееўрапейскія рыцары захапілі Канстанцінопаль падчас IV крыжовага паходу, часова ліквідаваўшы візантыйскую дзяржаву.

Назавіце літаратурныя творы і кінафільмы, дзе ідзе гаворка пра крыжовыя паходы.

У супрацьстаянні каталіцтва і праваслаўя ўпор рабіўся не на палітычныя прэтэнзіі, а на адрозненні ў дагматах веры, абрадах, арганізацыі кіравання, што існавалі з IX ст. Ва ўмовах аўтаноміі царквы на

Захадзе склалася традыцыя набажэнстваў выключна на латыні. У праваслаўным свеце набажэнствы вяліся на царкоўнаславянскай мове.

**Крыжовыя паходы на Блізкі Усход**

Прэтэнзіі пап на панаванне ў хрысціянскім свеце паспрыялі арганізацыі *крыжовых паходаў* на Блізкі Усход (1096–1270 гг.). Найбольш масавы і паспяховы быў паход 1096–1099 гг., калі крыжакам удалося аднавіць уладу хрысціян над Іерусалімам і стварыць у Палесціне дзяржаву — Іерусалімскае каралеўства. Аднак у далейшым узмацненне мусульманскіх дзяржаў на Блізкім Усходзе і канфлікты паміж самімі крыжакамі прывялі да страты ўсіх блізкаўсходніх уладанняў.

Чаму поспех крыжакоў у 1099 г. не прывёў да еўрапейскай каланізацыі ўсяго Блізкага Усходу?

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

### Статут Тэўтонскага ордэна

Гэта — Статут братоў, што служаць Нямецкаму Брацтву Св. Марыі…

Ёсць тры рэчы, якія складаюць аснову ўсякага рэлігійнага жыцця, і яны прапісаны ў гэтым Правіле. Першая — пажыццёвая цнота, другая — адмова ад уласнай волі, то-бок паслушэнства аж да смерці, трэцяя — прыняцце беднасці, то-бок жыццё без уласнасці пасля ўступлення ў гэты Ордэн…

Братам-рыцарам належыць насіць белыя плашчы, як знак свайго рыцарства, але іншыя іх вопраткі не павінны адрознівацца ад вопратак іншых братоў. Мы пастанаўляем, каб кожны брат насіў чорны Крыж на плашчы, на пакрыццях шлема і брані (нашлемніках і налатніках), каб паказваць вонкава прыналежнасць сваю да гэтага Ордэна…

Усім братам належыць стрыгчы свае валасы на ўзор манахаў і духавенства, каб і спераду і ззаду іх можна было пазнаць як людзей, што належаць да рэлігійнага Ордэна…

1. *Пералічыце зарокі, якія давалі члены Тэўтонскага ордэна.*
2. *Разгледзьце ілюстрацыі. На аснове тэксту дакумента вызначыце, на якой з іх паказаны рыцар Тэўтонскага ордэна. Прадстаўнікі якіх духоўна-рыцарскіх ордэнаў паказаны на дзвюх іншых ілюстрацыях?*

А

Б

В



Правообладатель Издательский центр БГУ

Духоўна-рыцарскія ордэны

У працэсе крыжовых паходаў у Палесціне былі створаны *духоўна-рыцарскія ордэны*, якія спалучалі манаскія паводзіны з узброенай абаронай хрысціянскіх заваёў. Першым сярод іх стаў ордэн тампліераў, затым з'явіліся шпітальеры, а ў 1198 г. у Іерусаліме быў заснаваны Тэўтонскі (Нямецкі) ордэн, куды прымалі толькі нямецкіх рыцараў. Ператварыўшыся ў буйнога феадальнага землеўласніка, ён істотна ўплываў на палітычнае жыццё Еўропы. Цяжкасці ордэн пачаў зазнаваць пасля 1410 г., калі аб'яднаныя войскі ВКЛ і Польшчы нанеслі паражэнне яго арміі ў бітве пад Грунвальдам.

Сярэдневяковыя рэлігіі Усходу

**4. Рэлігіі ў сярэдневяковых цывілізацыях Азіі.** У сярэдневяковых цывілізацыях Азіі ў Раннім і Высокім сярэднявеччы развіваліся і ўмацоўваліся старыя, узнікалі і пашыраліся новыя вераванні. Самымі ўплывовымі рэлігіямі на Усходзе былі іслам, будызм і хрысціянства.

Гэтыя сусветныя рэлігіі звярталіся да ўсіх людзей, незалежна ад іх расы або сацыяльнага становішча. У адрозненне ад язычніцкіх вераванняў яны прапаноўвалі чалавеку новую ідэалогію і маральны кодэкс для пераадолення праблем і несправядлівасцей грамадства.

Іслам

Ісламскае вучэнне ўяўляе сабой складаную сістэму вераванняў і практык, якімі кіруюцца мусульмане ў сваім жыцці. Галоўная крыніца ісламу — Каран — свяшчэнная кніга мусульман, напісаная на арабскай мове. Мусульмане лічаць яе словам Бога (Алаха), падараваным прароку Магамету. Важнай крыніцай ісламу таксама з'яўляюцца паданні або аповеды пра жыццё ісламскага прарока, дзе ўтрымліваюцца словы і выслоўі Магамета, яго наказы сваім паплечнікам і мусульманскай абшчыне, тлумачэнні да Карана. Крыніцы ісламу складаюць аснову ісламскіх вераванняў, закліканых дапамагчы мусульманам дасягнуць канчатковай мэты — падпарадкавання Богу і вечнага ўратавання.

| Рэлігіі, пашыраныя на Усходзе ў перыяд Сярэднявечча | |
|---|---|
| Будызм | • узнік у VI ст. да н. э. у Індыі;<br>• атрымаў распаўсюджанне ў Кітаі, Карэі, Японіі;<br>• вызваленне ад пакут праз прасвятленне і нірвану |
| Хрысціянства | • узнікла ў I ст. у рымскай правінцыі — Іудзеі;<br>• атрымала распаўсюджанне ў Грузіі і Арменіі, у некаторых краінах Блізкага Усходу, Цэнтральнай Азіі, а таксама ў Эфіопіі і Індыі;<br>• вучэнне аб уратаванні праз веру ў Ісуса Хрыста |
| Іслам | • узнік у VII ст. у Заходняй Аравіі;<br>• атрымаў распаўсюджанне падчас арабскіх заваёў;<br>• пакланенне адзінаму Богу — Алаху, шанаванне Магамета як прарока і пасланніка Алаха |
| Сінтаізм | • узнік у перыяд археалагічнай культуры Яёй (III ст. да н. э. — III ст. н. э.) у Японіі;<br>• з VIII ст. японскія імператары з'яўляліся першасвятарамі рэлігіі сінта;<br>• галоўны духоўны прынцып — шанаванне духаў і продкаў, культ чысціні і працавітасці |
| Канфуцыянства | • узнікла на мяжы VI–V стст. да н. э. у Кітаі;<br>• ключавы матыў вучэння — шчырая адданасць сына — бацьку, народа — імператару |
| Індуізм | • узнік у 2–1-м тыс. да н. э. у Індыі;<br>• вера ў перасяленне душ; парадак перараджэння вызначаецца зробленымі пры жыцці ўчынкамі і іх наступствамі |
| Даасізм | • узнік у VI ст. да н. э. у Кітаі;<br>• вучэнне пра «шлях рэчаў» (даа), якім павінна кіравацца ўсё існае (свет і людзі) |

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Нягледзячы на тое, што ўсе рэлігіі і вераванні зарадзіліся ў глыбокай старажытнасці, яны дагэтуль застаюцца запатрабаванымі ў грамадстве.

1. *Паводле якога крытэрыю рэлігіі ў табліцы вылучаны розным колерам?*
2. *Скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі і даведайцеся, у якіх краінах вызнаюць гэтыя рэлігіі на сучасным этапе.*
3. *Як вы лічыце, чаму, паўстаўшы ў далёкай старажытнасці, гэтыя рэлігіі захавалі сваё значэнне і ўплыў да нашых дзён?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Рэлігіі адыгрывалі важную ролю ў жыцці сярэдневяковага грамадства. Яны вызначалі погляды чалавека на свет, фарміравалі мадэлі паводзін людзей і іх звычкі. Менавіта ў гэты перыяд пачалося актыўнае распаўсюджванне хрысціянства, будызму і ісламу. Раскол 1054 г. прывёў да распаду адзінага хрысціянскага свету на дзве галіны — каталіцызм і праваслаўе.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| X ст. — большая частка насельніцтва Еўропы прыняла хрысціянства, а многія краіны Блізкага Усходу — іслам | X в. — распаўсюджванне хрысціянства візантыйскага ўзору |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце шляхі хрысціянізацыі Еўропы. Чаму хрысціянства досыць хутка распаўсюдзілася ў сярэдневяковай Еўропе?
2. Ахарактарызуйце ўзаемаадносіны паміж свецкай і царкоўнай уладай у Раннім і Высокім сярэднявеччы.
3. Што, на ваш погляд, было галоўнай прычынай спаборніцтва заходняй і ўсходняй хрысціянскіх цэркваў? Свой адказ растлумачце.
4. Дайце кароткую характарыстыку асноўным рэлігіям сярэдневяковых цывілізацый Азіі. Якім чынам рэлігіі ўплывалі на светапогляд, жыццёвыя каштоўнасці і штодзённае жыццё людзей?
5. З гісторыяй сярэдневяковай Еўропы звязаны выраз «хадзіць у Каносу». Даведайцеся, што значыць гэты выраз. Прааналізуйце гістарычны факт, звязаны з гэтым выразам, адказаўшы на пытанні: «Калі? Дзе? Хто? Якія прычыны? Якія наступствы?».

# § 11. Развіццё культуры ў Раннім і Высокім сярэднявеччы

МІНАРЭТ МАЗАІКА
ХРАМ СВЯТОЙ САФІІ
ХРОНІКА АНТЫЧНАСЦЬ ІКОНА
МІНІЯЦЮРА УНІВЕРСІТЭТ
ФРЭСКА ПЕРГАМЕНТ
ІНІЦЫЯЛ

**1. Захаванне антычнай спадчыны.** Для эпохі Сярэднявечча характэрнае ўзаемадзеянне элементаў антычнай, хрысціянскай і «варварскай» культур. Так, уздым культуры ў Франкскім каралеўстве ў часы праўлення Карла Вялікага і яго найбліжэйшых пераемнікаў, што атрымаў назву *«Каралінгскага Адраджэння»*, характарызаваўся павышанай цікавасцю да антычнай культуры.

У Візантыі захаванне старажытнай спадчыны насіла сістэмны характар. Візантыйцы не толькі зберaглі немалую колькасць грэчаскіх і рымскіх прац, але і пакінулі да іх свае каментарыі.

Вельмі важную ролю ў пераемнасці антычнай і сярэдневяковай культуры адыграла лацінская мова. Менавіта латынь зрабілася асновай для развіцця еўрапейскіх нацыянальных моў, а пісьменства данесла да жыхароў сярэдневяковай Еўропы дасягненні антычнай навукі і філасофіі.

Латынь — аснова развіцця еўрапейскіх нацыянальных моў

Ва ўмовах варварызацыі Заходняй Еўропы царква ператварылася ў адзіную захавальніцу антычнай спадчыны. Доўгі час самымі адукаванымі людзьмі з'яўляліся святары і манахі. Ім неабходна было чытаць Біблію і праводзіць набажэнствы, вылічваць даты хрысціянскіх свят і будаваць храмы. Менавіта дзякуючы

Царква — захавальніца антычнай спадчыны

Правообладатель Издательский центр БГУ

духавенству лацінская мова стала найважнейшым сувязным звяном паміж антычнай і сярэдневяковай культурамі.

Якія сацыяльныя функцыі выконвалі манастыры?

Часта манастыры заставаліся адзіным месцам захоўвання старажытных рукапісаў. У кожным з іх быў скрыпторый, дзе перапісваліся багаслоўскія працы і богаслужбовыя кнігі, а таксама складаліся хронікі. Манахі капіравалі працы грэчаскіх і рымскіх філосафаў, паэтаў і гісторыкаў. Гэтыя тэксты з'яўляліся асновай адукацыі, складалі важную частку вучэбных праграм.

Так сфарміравалася характэрная для Ранняга еўрапейскага сярэднявечча манаполія хрысціянскіх устаноў на адукацыю.

Чаму пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі адбыўся заняпад культуры і адукацыі?

**2. Сярэдневяковая адукацыя.** Напачатку Сярэднявечча колькасць пісьменных людзей рэзка скарацілася. Непісьменныя былі многія каралі і вярхушка грамадства — знаць і чыноўнікі.

### Царкоўныя школы

Такое становішча намагалася паправіць царква. Адкрываліся школы, першыя з якіх былі заснаваныя манаскімі ордэнамі. Навучанне вялося на лацінскай мове. Метады навучання будаваліся на зубрэнні і развіцці механічнай памяці; настаўнік даваў абстрактныя веды, якія належала абавязкова запамінаць, і не тлумачыў прадмет або з'яву. У школах панавала суровая дысцыпліна, ухваляліся цялесныя пакаранні.

Растлумачце, чаму людзі з добрай памяццю карысталіся вялікай павагай.

Асаблівасцю сярэдневяковай адукацыі была адсутнасць класаў і размеркавання вучняў па ўзросце або здольнасцях.

### Свецкая адукацыя

Інакш была арганізавана свецкая адукацыя. З ростам гарадоў і росквітам цэхаў пачалі ўзнікаць прыватныя школы. Па-свецку было арганізавана і навучанне феадалаў. Яно грунтавалася на «сямі рыцарскіх дабрадзейнасцях»: верхавая язда, плаванне, валоданне дзідай, мячом і шчытом, фехтаванне, паляванне, гульня ў шахматы, уменне складаць і спяваць вершы.

## ЦАРКОЎНЫЯ ШКОЛЫ

| Манастырскія | Кафедральныя | Прыходскія |
| --- | --- | --- |
| арганізоўваліся пры манастырах | адкрываліся пры кафедральных саборах | узнікалі пры царкоўных прыходах |
|  |  |  |

Што такое літара? —
Вартаўнік гісторыі.
Што такое слова? —
Здраднік душы.
Хто нараджае слова? —
Язык.
Што такое язык? —
Біч паветра.
Што такое паветра? —
Захавальнік жыцця.
Што такое жыццё? —
Шчаслівым радасць,
няшчасным гора,
чаканне смерці.

Урывак з падручніка. IX ст.

У сярэдневяковых дакументах можна прачытаць: «За непісьменнага дзеля яго рыцарскага звання распісаўся манах такі і такі…». Растлумачце гэтую фразу.

### З'яўленне вышэйшых навучальных устаноў

У Высокім сярэднявеччы Заходняя Еўропа зазнала нечуваны эканамічны і культурны ўздым. У гэты час асобныя кафедральныя і манастырскія школы ператвараліся ў буйны́я вучэбныя цэнтры, якія пасля зрабіліся першымі ўніверсітэтамі. Яны ўяўлялі сабой сярэдневяковыя карпарацыі — аб'яднанні навучэнцаў і выкладчыкаў. Заняткі ва ўсіх заходнееўрапейскіх універсітэтах вяліся на лацінскай мове. Студэнты з розных краін аб'ядноўваліся ў зямляцтвы, а выкладчыкі гуртаваліся па спецыяльнасцях у факультэты. Разам яны абіралі кіраўніка ўніверсітэта (рэктара). На падрыхтоўчым факультэце адбывалася асваенне «сямі вольных мастацтваў»: граматыкі, рыторыкі, дыялектыкі, арыфметыкі, геаметрыі, астраноміі, музыкі. Пасля авалодання гэтымі дысцыплінамі студэнт мог працягнуць вучобу, абраўшы адзін з трох вышэйшых факультэтаў універсітэта: багаслоўскі,

Правообладатель Издательский центр БГУ

медыцынскі або юрыдычны. Па яго заканчэнні прысуджалася ступень магістра або доктара навук па адпаведным профілі.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Раннія статуты Сарбоны XII–XV стст.**

Жадаю, каб няўхільна выконваўся звычай, зацверджаны ў момант заснавання гэтага дома па парадзе добрых людзей... Таму ніхто, жывучы ў гэтым доме, не павінен есці мяса як напярэдадні Раства Хрыстова, так і па панядзелках ды чацвяргах, у дні Вялікага посту, а таксама ад свята Ушэсця да Сёмухі... Ніхто не можа ўжываць ежу ў сваім пакоі без асаблівай прычыны. Роўным чынам усе павінны насіць закрытую вопратку... Хай ніхто не носіць кідкага адзення і чаравікаў, ад чаго могуць узнікнуць розныя непаразуменні... Таксама ніхто не прымаецца ў дом без клятвы... Таксама кожны член абшчыны мае ўласны знак на адзенні, адзіны ў сваім родзе і адрозны ад іншых. Ніхто не асмельваецца начаваць па-за домам, недзе ў горадзе. На сходах і разборах кожны мае вытрымліваць мір і маўчанне, пакуль яго не спытае прыёр...

1. *Якім чынам рэгламентаваліся паводзіны студэнтаў сярэдневяковых універсітэтаў?*
2. *Чым тлумачыцца строгасць правіл паводзін у сярэдневяковых універсітэтах?*



*Універсітэт Аль-Караўін. Марока. Сучасны выгляд*

Выкладчыкі і студэнты жылі ў спецыяльна ўладкаваных інтэрнатах — калегіях. Тут праводзіліся лекцыі: выкладчык зачытваў урыўкі з кніг вядомых вучоных і багасловаў, а пасля тлумачыў значэнне прачытанага.

Першай вышэйшай навучальнай установай Заходняй Еўропы стаў Балонскі ўніверсітэт у Францыі, заснаваны яшчэ ў XI ст. Аднак арабскія ўніверсітэты ўзніклі значна раней. Найстарэйшы з іх — Аль-Караўін у г. Фес у Марока, які адкрыў свае дзверы ў IX ст.

У заходнееўрапейскіх універсітэтах з'яўляліся вучоныя, дасягненні якіх пераўзыходзілі ўзровень сярэдневяковай навукі. У іх ліку быў англічанін Ро-

джэр Бэкан. Ён увёў у навуку матэматычны і эксперыментальны метады, напісаў працы аб прыродзе святла і колеру, распрацаваў новыя тэорыі аб павелічальным шкле.

Значна пашырыліся геаграфічныя веды еўрапейцаў. Венецыянец Марка Пола здзейсніў шматгадовае падарожжа ў Кітай і Цэнтральную Азію, вынікі якога апісаў у славутай «Кнізе аб разнастайнасці свету».

### Асаблівасці развіцця ў Візантыі

У пачатку Сярэднявечча ў Візантыі, у адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, цэнтрамі развіцця культуры з'яўляліся гарады. У «дзяржаве васілеўсаў» працэнт адукаваных людзей быў значна вышэйшы, чым на Захадзе. Як і ва ўсёй Еўропе, на развіццё адукацыі істотна ўплывала царква. У XI ст. у Канстанцінопалі на базе вышэйшай школы, заснаванай імператарам Феадосіем II яшчэ ў V ст., быў створаны ўніверсітэт. Ён меў два факультэты — юрыдычны і філасофскі (багаслоўскі). Сёння яго часта называюць Канстанцінопальскім універсітэтам, або Магнаўрскай вышэйшай школай. Першы рэктар універсітэта — вядомы вучоны Леў Матэматык. Сярод выкладчыкаў і выпускнікоў універсітэта было шмат вядомых філосафаў і вучоных, напрыклад, Кірыл і яго брат Мяфодзій — стваральнікі славянскага алфавіта.



*Святыя Кірыл і Мяфодзій. Фрэска сабора Святой Сафіі. Македонія. XI ст.*

**3. Развіццё культуры ў Заходняй Еўропе.** З развіццём школ і адукацыі пашыраўся попыт на кнігі. У Раннім сярэднявеччы яны былі прадметам раскошы. Кнігі пісалі на пергаменце. Аркушы сшывалі з дапамогай тонкіх трывалых вяровак і змяшчалі ў вокладку з дошак, абцягнутых скурай, часам упрыгожаных каштоўнымі камянямі. Тэкст ілюстравалі буквіцамі, застаўкамі, а пазней — мініяцюрамі. З XII ст. адкрываюцца гарадскія майстэрні па перапісванні кніг, у якіх працавалі рамеснікі. З'яўляецца іншы матэрыял, менш трывалы, але больш даступны і танны, — папера.



Чаму ў сярэдневяковых бібліятэках кнігі захоўвалі на ланцугу?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Развіццё літаратуры**

Уплыў хрысціянскай ідэалогіі праявіўся ў царкоўнай літаратуры, якая ў той час фарміравалася. Асноўнымі яе жанрамі сталі жыціі святых, духоўныя гімны, літургічная драма. Сярод свецкай літаратуры асабліва вылучаліся творы гераічнага эпасу, якія апавядалі пра вялікіх герояў мінуўшчыны. Самыя вядомыя сярод іх — французская «Песня пра Раланда», іспанская «Песня пра Сіда», нямецкая «Песня пра Нібелунгаў». У гарадской літаратуры пераважалі кароткія ананімныя творы, звычайна жартаўлівага характару.

**Архітэктура**

Самабытнасцю вылучалася сярэдневяковая архітэктура. Раманскі стыль з яго масіўнымі формамі

## АРХІТЭКТУРНЫЯ СТЫЛІ СЯРЭДНЕВЯКОВАЙ ЕЎРОПЫ

### РАМАНСКІ

**XI–XIII стст.**
вобласці, якія мяжуюць з Міжземнамор'ем

- масіўнасць, прастата і яснасць формаў;
- тоўстыя сцены, невялікія вузкія вокны-аркі, цыліндрычныя або крыжовыя каменныя скляпенні;
- асноўны матэрыял для будаўніцтва — камень



*Капэла грэшнікаў, якія каюцца. Францыя*

### ГАТЫЧНЫ

**XII–XIV стст.**
з Францыі па ўсёй Еўропе

- аркі з завостраным верхам;
- вузкія і высокія вежы і калоны;
- багата ўпрыгожаны фасад з разны́мі дэталямі і характэрнай «ружай» у цэнтры;
- шматкаляровыя вітражныя стральчатыя вокны, каваныя шпіцы на даху



*Рэймскі сабор. Францыя*

змяніўся на гатычны. Цяпер будынкі імкнуліся ўгару, да святла і Бога, што выразна відаць на прыкладзе сабора Нотр-Дам у Парыжы.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Кёльнскі сабор



*Прыклад гатычнага шрыфту*



*Касцюмы Сярэднявечча*

1. *Якім чынам рысы гатычнага стылю адбіліся ў прадстаўленым творы сярэдневяковай архітэктуры, касцюмах і шрыфце?*
2. *Як гэта тлумачылася з пункту погляду сярэдневяковага бачання свету?*

**4. Дасягненні ў навуцы і культуры Візантыі.** Візантыя была цэнтрам значных навуковых і культурных дасягненняў Ранняга і Высокага сярэднявечча. Мясцовыя вучоныя захоўвалі сакрэты вырабу шкла, лекавых сродкаў і фарбаў. Сярод навук найбольш паспяхова развіваліся матэматыка, астраномія,

**Візантыя — скарбніца навуковых адкрыццяў і культурных дасягненняў**


Правообладатель Издательский центр БГУ

геаграфія, хімія, медыцына, інжынерная справа. Так, адзін з пачынальнікаў алгебры Леў Матэматык вынайшаў светлавы тэлеграф, што ўяўляў сабой сістэму сігнальных вежаў і дазваляў за адну гадзіну перадаць паведамленне з мяжы з Халіфатам у Канстанцінопаль. Візантыйцы мелі адмысловыя механізмы, якія прыводзілі ў захапленне замежных паслоў: цудоўныя статуі львоў, якія рыкалі, птушак, якія лёталі, і іншыя фігуры, што рухаліся сілаю вады. Візантыйскія купцы, выпраўляючыся ў далёкія падарожжы, складалі геаграфічныя трактаты і карты, якія ў далейшым распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе.



*Яўсевій Кесарыйскі. Графіка*

Выкарыстоўваючы антычную спадчыну, візантыйцы стварылі багатую бібліятэку навуковых і філасофскіх тэкстаў. Атрымалі пашырэнне жанры гістарычных хронік («Хроніка» Яўсевія Кесарыйскага), жыццяпісы вялікіх валадароў і ваеннай гісторыі («Гісторыя войнаў Юстыніяна» Пракопія Кесарыйскага).

Цэнтрам візантыйскага мастацтва па-ранейшаму заставаўся велічны Канстанцінопаль. Сімвалам выдатнай сярэдневяковай архітэктуры Візантыі стаў пабудаваны ў VI ст. славуты Сафійскі сабор.

### «Залаты век» ісламу

**5. Мусульманскі рэнесанс.** Тэрыторыя мусульманскага свету ў Сярэднявеччы працягнулася ад Індыі да Пірэнеяў, а арабская мова стала на гэтай прасторы мовай міжнародных зносін. Перыяд з VIII да XIII ст. прынята называць мусульманскім Адраджэннем, або «Залатым векам ісламу». Менавіта тады старажытныя навуковыя працы, што захаваліся ў Візантыі і Персіі, былі перакладзены на арабскую мову. Гэты масавы перакладчыцкі праект стварыў падмурак для дзейнасці мусульманскіх вучоных, якія пасля пашырылі і развілі атрыманыя веды.

> Чаму арабскую мову называюць «латынню Усходу»?

Арабскія і персідскія вучоныя зрабілі важныя адкрыцці ў розных галінах навукі. Яны перагледзелі і дапоўнілі працы Гіпакрата і Галена, дзякуючы чаму медыцына тысячагадовай даўніны выйшла на даволі высокі ўзровень. Кніга Ібн Сіны (Авіцэны) «Канон ле-

> Якімі вынаходствамі і адкрыццямі, што зрабілі або распаўсюдзілі арабы, чалавецтва карыстаецца да нашых часоў?

карскай навукі» была галоўным падручнікам для медыкаў у Еўропе аж да XVII ст.

Нярэдка ўсходнія вучоныя былі яшчэ і творчымі людзьмі. Напрыклад, матэматык і астраном канца XI ст. Амар Хаям узначаліў абсерваторыю і склаў

## НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ МУСУЛЬМАНСКАГА РЭНЕСАНСУ

### МАТЭМАТЫКА



Еўрапеец і араб вывучаюць геаметрыю

- алгебра і трыганаметрыя;
- словы «алгебра», «алгарытм»

*Аль-Харэзмі*
*Аль-Джазары*

### ХІМІЯ



Дыстыляцыйны апарат. VIII ст.

- метады ачысткі і крышталізацыі;
- класіфікацыя вядомых хімічных рэчываў

*Аль-Разі*
*Ібн Хаян*

### АСТРАНОМІЯ



Фазы Месяца. XI ст.

- працягласць гадавога цыкла;
- абсерваторыі

*Аль-Батані*
*Аль-Біруні*

### ФІЗІКА



- прынцып аптычных лінзаў

Сістэма вадзяной помпы. XIII ст.

### ГЕАГРАФІЯ



Рэканструкцыя арабскай карты. XII ст.

- словы «адмірал», «баржа», «мусон»;
- стварэнне карт;
- вызначэнне даўжыні акружнасці зямнога шара

Правообладатель Издательский центр БГУ

сонечны каляндар, але атрымаў сусветную вядомасць дзякуючы паэтычным творам, напоўненым жыццёвай мудрасцю і любоўю да чалавека.

Разам з навукай у Еўропу пранікала ісламскае мастацтва, вядомае сваімі мудрагелістымі геаметрычнымі ўзорамі і каліграфіяй. Мусульманская архітэктура з яе спічастымі аркамі, купаламі і дэкаратыўным арнаментам натхняла архітэктараў гатычнага стылю. Многія ўзоры ісламскай архітэктуры захаваліся да нашага часу, напрыклад Вялікая мячэць Кордавы.

«Залаты век ісламу» быў перыядам, калі мусульманскі свет знаходзіўся ў авангардзе навукі і культуры, што аказала глыбокі ўплыў на наступныя стагоддзі.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Кордава — адзін з найстаражытнейшых гарадоў Іспаніі, сталіца Кордаўскага халіфата. У X ст. горад дасягнуў свайго росквіту, зрабіўся адным з цэнтраў асветы і навук.

*1. Растлумачце, чаму Кордаву ў Сярэднія вякі называлі «ўпрыгажэннем свету».*
*2 Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, назавіце і апішыце аб'екты сучаснай Кордавы, уключаныя ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.*



*Гістарычны цэнтр Кордавы. Іспанія. Сучасны выгляд*

*Культура Сярэдніх вякоў адлюстроўвала жыццёвыя каштоўнасці людзей таго часу. Калі ў Раннім сярэднявеччы цэнтрамі развіцця культуры былі манастыры і манастырскія школы, дык у XI–XIII стст. гэтая роля перайшла да гарадоў, дзе адкрываліся ўніверсітэты і развівалася архітэктура. Разам з тым дасягненні арабскай навукі, літаратуры і мастацтва спрыялі развіццю культуры многіх народаў не толькі Усходу, але і Еўропы.*

**калі ў свеце...**

X–XIII стст. — панаванне раманскага архітэктурнага стылю

**на тэрыторыі Беларусі...**

XI–XIII стст. — перавага візантыйскага архітэктурнага стылю

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якую ролю ў развіцці сярэдневяковай культуры адыграла царква?
2. Ахарактарызуйце сістэму адукацыі ў сярэдневяковай Еўропе.
3. Параўнайце сярэдневяковы і сучасны ўніверсітэты.
4. Што спрыяла захаванню дасягненняў Антычнасці ў Сярэднявеччы?
5. Назавіце адкрыццё Ранняга і Высокага сярэднявечча, якое, на вашу думку, паўплывала на жыццё вялікай колькасці людзей, кардынальна змяніла яго і захавала значнасць да нашага часу. Абгрунтуйце ваш выбар.
6. Дакажыце, што эпоха Ранняга сярэднявечча стала часам сінтэзу трох найважнейшых элементаў культуры: антычнага, хрысціянскага і варварскага.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## § 12. Вялікая славянская міграцыя і Беларусь

ІНДАЕЎРАПЕЙЦЫ
ДРЫГАВІЧЫ СЛАВЯНЕ
ВЯЛІКАЕ ПЕРАСЯЛЕННЕ НАРОДАЎ
ВЕЧА КРЫВІЧЫ-ПАЛАЧАНЕ
БАЛТЫ РАДЗІМІЧЫ
КНЯЗЬ

Успомніце, да якой групы народаў адносяцца славяне.

**1. Праблема паходжання славян.** У гістарычнай навуцы няма адзінага меркавання наконт паходжання славян. Існуюць розныя пункты погляду на іх прарадзіму, час канчатковага вылучэння ў самастойны этнас, шляхі міграцый і г. д.

Найбольш абгрунтаваным з'яўляецца меркаванне, што славяне як самастойны народ сфарміраваліся ў сярэдзіне 1-га тыс. да н. э.




### ГІПОТЭЗЫ ПРАРАДЗІМЫ СЛАВЯН

1. Вісла-Одэрская (тэрыторыя сучаснай Польшчы).
2. Сярэднедняпроўская (тэрыторыя паўночна-заходняй Украіны, паўднёвай Беларусі і паўднёва-ўсходніх абласцей Польшчы).
3. Дунайская — Сярэдні Дунай (тэрыторыя сучаснай Венгрыі) і інш.

*Прарадзіма славян*

Славяне на старонках гістарычных дакументаў

Упершыню на старонках гістарычных сачыненняў антычных аўтараў славяне, магчыма, сустракаюцца пад назвай «венеды» ў I ст. н. э. (Пліній Старэйшы). У сачыненні гоцкага гісторыка VI ст. Іярдана венеды падзяляюцца ўжо на дзве групы — уласна славяне (склавіны) і анты. Славяне, на думку аўтара, размяшчаліся ад нізоўяў Дуная да Днястра, а на поўначы іх рассяленне абмяжоўвалася Віслай. Анты ж, «самыя магутныя» паводле Іярдана, размяшчаліся ад Днястра да Дняпра.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З сачынення Пракопія Кесарыйскага «Вайна з готамі» (VI ст.)**

«Гэтыя плямёны, славяне і анты, не кіруюцца адным чалавекам, але спрадвеку жывуць у народапраўстве (дэмакратыі), і таму ў іх шчасце і няшчасце ў жыцці лічыцца агульным клопатам. І ва ўсім астатнім у абодвух гэтых варварскіх плямёнаў усё жыццё і законы аднолькавыя…

У тых і іншых адна і тая мова, досыць варварская. І з выгляду яны не адрозніваюцца адны ад другіх. Яны вельмі высокага росту і велізарнай моцы. Колер скуры і валасоў у іх вельмі белы або залацісты і не зусім чорны, але ўсе яны цёмна-чырвоныя».

**З ваеннага трактата «Стратэгікон» імператара Маўрыкія (канец VI ст.)**

«Плямёны славян і антаў падобныя сваім ладам жыцця, сваімі норавамі, сваёй любоўю да свабоды; іх ніякім чынам нельга схіліць да рабства або падпарадкавання ў сваёй краіне. Яны шматлікія, цягавітыя, лёгка зносяць спёку, холад, дождж, галізну, недахоп ежы.

Яны селяцца ў лясах, каля цяжкапраходных рэк, балот і азёр, ладзяць у сваіх жытлах шмат выхадаў з прычыны небяспек, што з імі, натуральна, здараюцца.

Змагацца са сваімі ворагамі яны любяць у мясцінах, парослых густым лесам, у цяснінах, на абрывах; з выгадай для сябе карыстаюцца [засадамі], раптоўнымі атакамі, хітрасцямі, і днём і ноччу вынаходзячы шмат [разнастайных] спосабаў…

Кожны ўзброены дзвюма невялікімі дзідамі; некаторыя маюць шчыты, трывалыя, але цяжкапераносныя [з месца на месца]. Яны карыстаюцца таксама драўлянымі лукамі з невялікімі стрэламі, напоенымі асаблівай для стрэл атрутай…»

*1. Як вы лічыце, ці мелі славяне і анты агульнае паходжанне? Прывядзіце аргументы.*

*2. Якія якасці, на ваш погляд, дапамаглі славянам рассяліцца ў далейшым на велізарных тэрыторыях?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Вялікая славянская міграцыя

**2. Рассяленне славян. Шляхі міграцыі славян ва Усходняй Еўропе.** Адносна стабільнае жыццё славян на іх прарадзіме было парушана каля 400 г. да н. э. шырокай экспансіяй кельтаў. Менавіта ў сувязі з іх націскам частка славянскага насельніцтва Прывіслення адышла на поўнач, другая рушыла да Дняпра. Разам са славянамі ў Падняпроўе пранiклі і заходнія балты, блізкія да іх у моўным сэнсе.

У III ст. н. э. з Прыбалтыкі на тэрыторыю Паўночнага Прычарнамор'я прыйшлі германскія плямёны готаў, якія вельмі хутка ўсталявалі тут сваё панаванне і пачалі ваяваць з Візантыяй. Да другой паловы IV ст. гоцкая дзяржава дасягнула найбольшай магутнасці. У той жа час у Прыазоўі з'явіліся гуны. Разграміўшы готаў, яны выйшлі да Дняпра і пачалі масавае ўварванне ў межы Рымскай імперыі. Прайшоўшы лавінай па Еўропе, гуны «вызвалілі» тэрыторыю для шырокай экспансіі славян. Пачалася Вялікая славянская міграцыя, якая з'яўлялася складнікам Вялікага перасялення народаў.

Успомніце, што такое Вялікае перасяленне народаў. Якія яго прычыны?

Шляхі славянскай міграцыі

Яшчэ адным важным фактарам, які запатрабаваў ад славян шукаць новыя тэрыторыі для рассялення, стала пагаршэнне кліматычных умоў каля IV ст. н. э. Частка славян з тэрыторыі сваёй прарадзімы вымушана была сысці на ўсход, прасунуўшыся да Валдайскага ўзвышша. Славяне пераважна сяліліся ўздоўж вялікіх рэк, якія служылі ў тыя часы ледзь не адзінымі транспартнымі артэрыямі для лясных і лесастэпавых абласцей.

У V ст. славяне пачалі прасоўванне на захад, дзе паступова выціснулі германцаў да р. Эльба. У канцы таго ж стагоддзя пачалася славянская каланізацыя Балкан, падчас якой яны даволі хутка змяшаліся з мясцовым насельніцтвам.

Спрэчным застаецца пытанне пра час з'яўлення славян на поўначы Усходняй Еўропы. Даследчыкі называюць час ад V да IX ст. Адначасова славяне засялялі тэрыторыі вакол азёр Пскоўскага і Ільме-




Рассяленне славян

Вызначце па картасхеме, на якія групы падзяліліся славяне. Успомніце, продкамі якіх сучасных народаў сталі прадстаўнікі кожнай групы.

ня, Полацкага Падзвіння, Смаленскага Падняпроўя і міжрэчча Волгі і Клязьмы. Яны сяліліся сярод мясцовых балцкіх і часткова фіна-ўгорскіх плямёнаў, часам займаючы паселішчы, якія існавалі і да таго.

**Асноўныя шляхі засялення славянамі тэрыторыі Беларусі**

**3. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі.** Гэты працэс не быў адначасовым і працягваўся да канца Ранняга сярэднявечча. Адзін са шляхоў ішоў з поўдня. З тэрыторыі Сярэдняга Падняпроўя славя-


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Гарадзішча Хатомель. Столінскі раён Брэсцкай вобласці. Сучасны выгляд*

Што такое гарадзішча?
З якой мэтай іх узводзілі?



*Рэканструкцыя жытла. Паселішча Хатомель*

Апішыце славянскае жытла.

не рухаліся ўздоўж рэк Дняпро, Прыпяць і іх прытокаў. Археалагічныя сведчанні пражывання славян на поўдні Беларусі, на тэрыторыі Палесся, адносяцца да канца IV ст.

Лепш за ўсё даследаваны вучонымі паселішчы каля г. Петрыкаў на р. Прыпяць у Гомельскай вобласці і каля в. Хатомель на р. Гарынь у Брэсцкай. На ўскраіне Петрыкава беларускія археолагі знайшлі славянскае селішча VI–VII стст. Каля в. Хатомель знойдзены гарадзішча, селішча і магільнік, у якім хавалі памерлых. Славяне жылі тут з VII ст. У добра ўмацаваным валамі і ровам гарадзішчы людзі хаваліся ў выпадку небяспекі. У паўночную і цэнтральную частку Беларусі славяне прыйшлі з поўначы Усходняй Еўропы.

## Узаемаадносіны славян з балтамі

Успомніце, калі балты ўпершыню з'явіліся на беларускіх землях.

Засяленне беларускіх зямель славянамі доўжылася не адно стагоддзе. Ранейшыя жыхары — балты — былі вымушаны пакінуць абжытыя месцы. Тыя ж, хто застаўся, паступова зліваліся са славянамі. Гэтаму спрыяла тое, што славяне, як і балты, былі язычнікамі, мелі падобныя лад жыцця і мову. Аднак славяне занялі пануючае месца, бо знаходзі-

ліся на вышэйшым узроўні грамадскага развіцця. Яны мелі племянных правадыроў, моцнае войска. Славяне пераўзыходзілі балтаў узроўнем земляробства і рамяства. Паступова адбылася **славянізацыя балтаў**.

**Славянізацыя балтаў** — працэс засваення балтамі рыс славянскай культуры, мовы, традыцый; зліццё балтаў са славянамі.

**4. Славянскія саюзы плямёнаў.** На працягу VI–VIII стст. славяне засялілі амаль усю тэрыторыю Беларусі. Толькі на захадзе захаваліся паселішчы балцкіх плямёнаў — літвы і яцвягаў. Славяне хутка асвоілі лясныя прасторы Усходняй Еўропы. Гэтаму паспрыяў комплексны характар гаспадаркі: яны ў роўнай меры былі і земляробамі, і жывёлаводамі. Шырока былі распаўсюджаны і разнастайныя дадатковыя промыслы — паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва. Славяне былі таксама таленавітымі рамеснікамі.

### Ад радавой абшчыны да саюзаў плямёнаў

Падчас рассялення разбураліся ранейшыя радавыя сувязі. На новых месцах у адным паселішчы маглі апынуцца прадстаўнікі розных родаў і плямёнаў. Паступова на змену радавым абшчынам, у якіх жылі і працавалі родзічы, прыйшлі тэрытарыяльныя, або суседскія, абшчыны. Змяшэнне славян з мясцовым насельніцтвам прыводзіла да з'яўлення асаблівасцей у ладзе жыцця, мове. Усё гэта спрыяла падзелу славян на «плямёны».

Згодна з найстаражытнейшым з дайшоўшых да нас летапісаў — «Аповесцю мінулых гадоў», на тэрыторыі Усходняй Еўропы склалася 12 славянскіх «плямёнаў»: паляне, драўляне, дрыгавічы, валыняне, улічы, ціверцы, белыя харваты, северы (севяране), вяцічы, радзімічы, крывічы, славене. Іх назвы ўтварыліся ад асаблівасцей месца пражывання або ад імён іх родапачынальнікаў.

Знайдзіце на картасхеме на с. 137 тэрыторыю рассялення ўсходнеславянскіх «плямёнаў».

У межах тэрыторыі сучаснай Беларусі размясціліся: на поўдні і ў цэнтры — дрыгавічы, на ўсходзе — радзімічы, на поўначы — палачане (частка вялікага саюзу крывічоў); на паўднёвым захадзе, на тэрыторыі сучаснай Брэсцкай вобласці, жылі валыняне.

Успомніце версіі паходжання назваў саюзаў плямёнаў, што рассяліліся на тэрыторыі Беларусі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Крывічанка. Рэканструкцыя*



*Радзімічанка. Рэканструкцыя*

Скроневыя кольцы — самы распаўсюджаны від жаночых упрыгажэнняў. Яны адрозніваюцца сваёй формай, памерам і тэхнікай вырабу. Менавіта гэтыя адрозненні маюць для даследчыкаў велізарны інтарэс, бо дазваляюць вызначыць племянную прыналежнасць уладальніцы, прыкладны арэал яе пражывання.

1. *Чаму гэтым жаночым упрыгажэнням вучоныя далі такую назву?*
2. *Як вы лічыце, якія функцыі выконвалі скроневыя кольцы ў Сярэднявеччы? Прывядзіце не менш за два прыклады.*
3. *Колькасць кольцаў ва ўпрыгажэннях магла вагацца ад аднаго да васьмі. Выкажыце здагадку, з чым гэта звязана.*
4. *У фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь захоўваецца вялізная калекцыя скроневых кольцаў, якія належалі крывічанкам, дрыгавічанкам, радзімічанкам. Выступіце ў ролі эксперта і вызначце, якія плямёны жылі ў даследаваных паселішчах.*

*А. У 1961 г. падчас археалагічнай экспедыцыі каля в. Свішчава (Камянецкі раён Брэсцкай вобласці) у курганным магільніку было знойдзена трохпацеркавае скроневае кольца.*

*Б. У 1965 г. каля в. Баронікі (Віцебскі раён Віцебскай вобласці) археолагі знайшлі бранзалетападобныя скроневыя кольцы з трапецыепадобнымі падвескамі.*

*В. У 1983 г. падчас правядзення будаўнічых работ па пракладцы дарогі каля в. Дубовіцы (Буда-Кашалёўскі раён Гомельскай вобласці) былі знойдзены сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы.*

Названыя славянскія «плямёны» ўяўлялі сабой аб'яднанні некалькіх невялікіх плямёнаў, таму гісторыкі называюць іх саюзамі плямёнаў. Сфарміраваліся яны ў VIII–IX стст.

### Племянныя княжэнні

На аснове саюзаў плямёнаў у сярэдзіне IX ст. утварыліся племянныя княжанні — прамежкавы этап на шляху да дзяржавы. Найважнейшая іх асаблівасць — значная ўлада ваенных правадыроў — князёў. Славян-

скія князі пачалі ўзначальваць племя не толькі ў ваенны, але і ў мірны час. Да іх супляменнікі сталі звяртацца для вырашэння спрэчак, канфліктаў, пакарання злачынцаў. Улада князя зрабілася спадчыннай. Тым не менш найвышэйшым органам улады заставаўся агульны племянны сход — веча, у якім маглі браць удзел усе дарослыя свабодныя мужчыны племені. Судовымі справамі і вырашэннем паўсядзённых пытанняў займалася рада старэйшын.

Згодна з летапісам, ва Усходняй Еўропе племянныя княжанні ўзніклі толькі ў пяці саюзаў плямёнаў. Сярод іх згадваюцца палачане і дрыгавічы. Імёны першых князёў не захаваліся. Толькі наконт другой паловы X ст. вядома пра праўленне меркавана скандынаўскіх князёў Рагвалода ў Полацку і Тура ў Тураве.

Племяннoе княжанне палачан існавала ў першай палове IX ст., затым яно перарасло ў дзяржаву, вядомую як Полацкая зямля.

## На шляху да дзяржавы

Падчас раскопак, што праводзіліся ў Полацку, беларускія археолагі знайшлі дарагія рэчы, сярэбраныя манеты (у асноўным арабскія дырхемы), якімі карысталіся князь і яго атачэнне. Скандынаўскіх прадметаў знойдзена зусім няшмат. Гэта сведчыць пра тое, што скандынаўская дружына Рагвалода ў Полацку была нешматлікая і яго апорай з'яўляліся прадстаўнікі мясцовага славянскага насельніцтва. Такім чынам, дзяржаўнасць на беларускіх землях зарадзілася і развівалася на сваёй уласнай, славянскай аснове, скандынаўскі і іншыя знешнія фактары маглі адыграць толькі другасную ролю.

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Засяленне тэрыторыі Беларусі славянамі не было адначасовым працэсам і працягвалася да канца Ранняга сярэднявечча. У выніку асіміляцыі імі мясцовага насельніцтва ў VIII–IX стст. склаліся саюзы плямёнаў крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў. Патрэба ў моцнай вайсковай арганізацыі прывяла да ўзмацнення ўлады князёў. Так узніклі племянныя княжанні з цэнтрамі ў Полацку і Тураве. Яны сталі асновай для ўтварэння першых на тэрыторыі Беларусі дзяржаў.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| V–VII стст. — Вялікая славянская міграцыя | Канец IV ст. — найранейшыя сляды прысутнасці славян у паўднёвай частцы Беларускага Палесся |

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія пытанні наконт старажытных славян на сённяшні дзень з'яўляюцца дыскусійнымі і чаму?
2. Скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі і высветліце этымалогію слова «славяне». Чаму існуе вялікая колькасць версій? Якая з іх вам бліжэйшая?
3. Пералічыце фактары, якія паўплывалі на славянскую міграцыю.
4. Як ажыццяўлялася засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі? Прывядзіце прыклады славянскіх паселішчаў.
5. Якія саюзы плямёнаў узніклі на беларускіх землях? Калі гэта адбылося? Ці ўсе яны перараслі ў племянныя княжанні? Чаму?

# § 13. Старажытная Русь — дзяржава ўсходніх славян

ВАРАГІ
КНЯЗЬ СТАРАЖЫТНАЯ РУСЬ
КІЕЎ РУРЫК
РАГНЕДА НОЎГАРАД
УЛАДЗІМІР КРАСНАЕ СОНЕЙКА
ХРЫШЧЭННЕ РУСІ ЯРАСЛАЎ МУДРЫ
«РУСКАЯ ПРАЎДА»

**1. Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы.** У канцы IX ст. завяршылася фарміраванне буйнога дзяржаўнага ўтварэння ва Усходняй Еўропе — Старажытнай Русі. У яе склад увайшлі велізарныя тэрыторыі, населеныя перш за ўсё ўсходнеславянскімі, а таксама фіна-ўгорскімі і балцкімі плямёнамі.



Паводле якіх прыкмет можна вызначыць, дзе адлюстраваны славяне, а дзе — варагі? Якія дары ляжаць паміж імі? Хто іх паднёс? Ці можаце вы назваць імя хоць аднаго чалавека, паказанага на карціне?

*Закліканне варагаў. Мастак В. Васняцоў. 1909 г.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Пачатак праўлення Рурыкавічаў**

Асноўнай крыніцай звестак пра пачатковы перыяд гісторыі Старажытнай Русі з'яўляецца «Аповесць мінулых гадоў». Летапіс апавядае пра запрашэнне ў 862 г. на княжанне ў Ноўгарад варажскага князя Рурыка. Пытанне наконт таго, хто ён, адкуль прыйшоў, з якой мэтай, і цяпер застаецца адкрытым. Тым не менш ён стаў пачынальнікам дынастыі Рурыкавічаў, якая правіла больш за сем стагоддзяў.

Датай узнікнення Старажытнарускай дзяржавы традыцыйна называюць 882 г., калі Алег, які прыняў пасля смерці Рурыка вярхоўную ўладу, захапіў Кіеў і зрабіў яго сталіцай.

**2. Беларускія землі ў Старажытнарускай дзяржаве.** Сучасная тэрыторыя Беларусі адыграла пэўную ролю ў працэсе складвання Старажытнарускай дзяржавы ў IX ст. Праз яе ўсходнюю частку праходзіў шлях «з варагаў у грэкі», які з'яўляўся «станавым хрыбтом Старажытнарускай дзяржавы».

Беларускія землі ў перыяд Ранняга сярэднявечча не былі нечым адзіным: тутэйшыя саюзы плямёнаў мелі рознае паходжанне, адрозніваліся ладам жыцця, побытам, узроўнем палітычнага развіцця, таму і адыгралі розную ролю ў станаўленні ўсходнеславянскай дзяржаўнасці. На больш высокім узроўні развіцця знаходзіліся крывічы-палачане.

Розны ўзровень палітычнага развіцця саюзаў плямёнаў на тэрыторыі Беларусі ў Раннім сярэднявеччы паўплываў у далейшым на ступень іх залежнасці ад Кіева. Калі верыць летапісным звесткам, князь Рурык пасадзіў сваіх людзей у Полацку, яго пераемнік князь Алег падпарадкаваў землі радзімічаў і абклаў іх данінай, пазней уладу старажытнарускіх князёў прызналі і дрыгавічы. Нягледзячы на тое што палачане былі падпарадкаваны яшчэ першымі князямі падчас фарміравання Старажытнарускай дзяржавы, ужо ў другой палове X ст. у летапісах паведамлялася пра незалежнае становішча Полацкага княства.




Пакажыце на картасхеме гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі». Якую ролю ён адыграў у фарміраванні Старажытнарускай дзяржавы?

*Русь у IX–X стст.*

**3. Функцыі князёў.** Княжацкая ўлада была звязана з ажыццяўленнем шэрагу функцый, якія стваралі стабільныя ўмовы для жыцця і дзейнасці падуладнага насельніцтва.

Важна разумець, што князь у эпоху Сярэднявечча быў неабходным элементам жыцця грамадства.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Фігура валадара ўяўляла сабой натуральны аб'яднаўчы пачатак, спрыяла ўзаемавыгаднай камунікацыі ўсіх пластоў насельніцтва.

## ФУНКЦЫІ КНЯЗЯ

### ВАЕННАЯ

- фарміруе дружыну і кіруе ёю;
- забяспечвае ўмацаванне і арганізацыю аховы дзяржавы



### ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ

- вызначае асноўныя кірункі знешняй палітыкі дзяржавы;
- усталёўвае і падтрымлівае дыпламатычныя кантакты з іншымі дзяржавамі;
- заключае/скасоўвае міжнародныя дагаворы



### АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ

- кіруе падуладнымі тэрыторыямі;
- прызначае на пасады;
- ажыццяўляе кантроль за зямельным фондам (вярхоўны ўласнік усёй зямлі ў дзяржаве);
- вызначае памеры даніны і арганізуе яе збор;
- рэгулюе знешні гандаль, арганізуе ахову гандлёвых шляхоў



### СУДОВАЯ

- выступае вярхоўным арбітрам у спрэчках і канфліктах



### ЗАКАНАДАЎЧАЯ

- усталёўвае законы для ўсяго падуладнага насельніцтва

Параўнайце функцыі князя ў Старажытнарускай дзяржаве з паўнамоцтвамі заходнееўрапейскіх манархаў і візантыйскіх імператараў. Да каго з іх старажытнарускія князі былі больш падобныя?

**Ваенныя паходы Алега і Ігара**

**4. Палітыка першых усходнеславянскіх князёў.** Першыя кіеўскія князі праводзілі актыўную знешнюю палітыку. Згодна з летапісам, паход на Цар-

град у 907 г. здзейсніў Алег (882–912 гг.). У выніку быў падпісаны выгадны для Русі дагавор з Візантыяй, што дазволіў купцам-русам гандляваць без мыта (платы за дазвол гандляваць).

Пасля смерці Алега кіраўніком Старажытнарускай дзяржавы стаў сын Рурыка *Ігар* (912–945 гг.). Пра яго праўленне вядома няшмат. У 941 г. ён здзейсніў няўдалы паход на Візантыю. Праз тры гады князь зноў сабраў войскі, але грэкі пасяшаліся адкупіцца. Ігару даводзілася ўдзяляць шмат увагі захаванню панавання Кіева над асобнымі ўсходнеславянскімі «плямёнамі». У пачатку свайго праўлення яму ўдалося скарыць драўлян, але менавіта ў сутыкненні з гэтым саюзам плямёнаў ён загінуў у 945 г.

**Рэформы княгіні Вольгі**

Праўленне ўдавы Ігара *Вольгі* (945–964 гг.) пачалося з помсты драўлянам. Затым княгіня ажыццявіла шэраг рэформаў, якія ўпарадкавалі збор даніны з насельніцтва падуладнай Кіеву тэрыторыі. Працэс збору даніны — *палюддзе*, якое патрабавала асабістай прысутнасці вярхоўнага валадара, быў заменены на дастаўку даніны насельніцтвам у спецыяльныя пункты — *пагосты*.

Вольга была хрысціянкай і намагалася павысіць ролю гэтай рэлігіі ў дзяржаве, але сутыкнулася з язычніцкай апазіцыяй. Калі вырас сын Ігара і Вольгі Святаслаў, ён адхіліў сваю маці ад улады, і пытанне наконт прыняцця хрысціянства ў якасці дзяржаўнай рэлігіі было часова адкладзена.

**Барацьба Святаслава са знешнімі ворагамі**

*Святаслаў Ігаравіч* (964–972 гг.) вёў надзвычай актыўную знешнюю палітыку. Ён падпарадкаваў найбольш аддаленае ўсходнеславянскае «племя» вяцічаў, нанёс разбуральнае паражэнне Хазарскаму каганату, разграміў Балгарскае царства, вёў напружаную вайну з Візантыйскай імперыяй на Балканах. Між тым Русь пачалі непакоіць сваімі набегамі качэўнікі-печанегі, ад рук якіх і загінуў князь Святаслаў у 972 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ




## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Разгледзьце кінастужку, складзеную з мініяцюр Радзівілаўскага летапісу XV ст. Даследуйце выявы і выканайце заданні.

*1. Суаднясіце кожную мініяцюру з адпаведным ёй тэкстам летапісу:*

А) уладкаванне Вольгай пагостаў і абкладанне данінай насельніцтва; княжанне Вольгі і Святаслава Ігаравіча ў Кіеве: «В лето 6455. Иде Олга к Новугороду, и устави… погосты и дани.. И изрядивши възратися ко сыну своему к Киеву и пребывше с ним в любви»;

Б) паход Ігара на Царград сіламі 10 тыс. караблёў: «В лето 6449. Иде Игорь на Греки. И послаша болгари весть ко царю, яко идуть русь на Царьград, скедий 10 тысяч»;

В) перадача Рурыкам перад смерцю княжання родзічу Алегу і прызначэнне яго апекуном свайго малалетняга сына Ігара: «В лето 6387. Умершю Рюрикови, предасть княженье свое Олгови, от рода ему суща, вдав ему на руце сын свой Игоря, бе бо мал велми»;

Г) бітва Святаслава Ігаравіча з войскамі хазарскага князя Кагана: «В лето 6473. Иде Святослав на когары. Слышавши же когары, изидоша противу со князем своим Каганом, и ступиша ся бити. И бывши брани, и одоле Святослав когаров»;

Д) чацвёртая помста Вольгі за забойства Ігара: спаленне драўлянскага горада: «Повеле Олга, и яко смерчеся, пустити голуби и воробьи воем своим. И воробьеве же и голуби влетеша во гнезда своа, голуби в голубники, воробьеве же под застрехи. И тако возгарахуся»;

Е) тайнае прыбыццё дружыны Ігара ў Вугорскае пад Кіевам; абвяшчэнне малалетняга Ігара нашчадкам кіеўскага прастола: «И приплу под Угорское… И рече Олег Асколду и Дирови: „Вы неста князя, ни рода княжа“, и вынесоша Игоря: „А се есть сын Рюриков“. И уби Асколда и Дира».

*2. Вылічыце розніцу ў гадах паміж сучасным і старажытнаславянскім леталічэннем. Вызначце даты, якіх не хапае ў кінастужцы.*




*Мініяцюры з Радзівілаўскага летапісу. XV ст.*

**5. Росквіт Старажытнай Русі.** Росквіт Старажытнарускай дзяржавы прыпаў на час праўлення Уладзіміра Святаславіча і яго сына Яраслава Мудрага.

**Умацаванне княжацкай улады Уладзімірам Святаславічам**

*Уладзімір Святаславіч* (980–1015 гг.) ажыццявіў шэраг мерапрыемстваў, якія цалкам справядліва можна назваць рэформамі: адміністрацыйную (замена племянных князёў прадстаўнікамі кіеўскага князя); прававую (пашырэнне на ўсю тэрыторыю, падуладную Кіеву, адзіных прававых нормаў); рэлігійныя (стварэнне адзінага пантэона язычніцкіх багоў, затым прыняцце хрысціянства); умацаванне абараназдольнасці дзяржавы (будаўніцтва памежных гарадоў і новага кіеўскага дзяцінца, узвядзенне памежных «змеевых валоў»). Рэформы Уладзіміра Краснае Сонейка спрыялі ўзмацненню дзяржавы.

Павышэнню аўтарытэту князя спрыяла таксама чаканка манет: залатых (златнікаў) і сярэбраных (срэбранікаў). Велізарнае значэнне мела афіцыйнае *хрышчэнне Русі (988 г.)*.

**Князь Яраслаў, празваны Мудрым**

У час праўлення *Яраслава Уладзіміравіча* (1019–1054 гг.) была ажыццёўлена прававая рэформа, якая заключалася ў складанні пісьмовага зводу законаў «Руская праўда», былі ўпарадкаваны павіннасці насельніцтва. Кіеўскі князь здолеў адбіць напады качэўнікаў, пры ім прынцыпова змяніўся характар знешняй

Правообладатель Издательский центр БГУ

палітыкі: з магутным валадаром Русі былі гатовыя парадніцца манархі найбуйнейшых заходнееўрапейскіх дзяржаў.

Князь Яраслаў удзяляў значную ўвагу будаўніцтву цэркваў і манастыроў, умацаванню і пашырэнню абарончых збудаванняў вакол Кіева. Яго асабістай заслугай стаў зварот да асветніцкай і культурнай дзейнасці, якая з таго часу ператварылася ў яшчэ адну абавязковую функцыю княжацкай улады.

## ПЕРЫЯДЫ РАЗВІЦЦЯ СТАРАЖЫТНАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

IX ст. — X ст. **Стварэнне**

- аб'яднанне разрозненых славянскіх плямёнаў у адзіную дзяржаву з цэнтрам у Кіеве;
- умацаванне на міжнароднай арэне дзякуючы паспяховым ваенным паходам

X ст. — XII ст. **Росквіт**

- прыняцце хрысціянства;
- стварэнне зводу законаў;
- пашырэнне дынастычных сувязей

XII ст. — **Раздробленасць**

- падзел на асобныя княствы;
- міжусобныя войны



*Алег прыбівае шчыт да брамы Царграда. Мастак А. Д. Кіўшэнка. 1874 г.*



*Чытанне народу «Рускай праўды» ў прысутнасці вялікага князя Яраслава. Мастак А. Д. Кіўшэнка. 1880 г.*



*Бітва наўгародцаў і суздальцаў у 1170 г. Фрагмент іконы. XV ст.*

**6. Палітычная раздробленасць Старажытнай Русі.** Палітычная раздробленасць была заканамерным этапам у развіцці сярэдневяковых дзяржаў. Не стала выключэннем і Старажытная Русь.

Прычыны раздробленасці

Важным крокам на шляху да раздробленасці Старажытнарускай дзяржавы стала рашэнне з'езда князёў у Любечы ў 1097 г. Прынятае рашэнне — «кожны няхай валодае спадчынай свайго бацькі» — замацоўвала панаванне ў валасцях Старажытнай Русі сваіх княжацкіх дынастый.

Распад адносна цэласнай дзяржавы на некалькі новых дзяржаў у межах той самай тэрыторыі — гэта бачны бок палітычнай раздробленасці. У больш глыбокім сэнсе яна заключалася ў тым, што валадар стольнага горада траціў магчымасць уплываць на характар і змест унутранай і знешняй палітыкі валадароў іншых гарадоў, што раней яму падпарадкоўваліся.

Перыяд палітычнай раздробленасці Старажытнай Русі настаў пасля смерці кіеўскага князя *Мсціслава Вялікага* (1125–1132 гг.), калі ўсе старажытнарускія княствы выйшлі з падпарадкавання Кіеву.

## ПРЫЧЫНЫ ПАЛІТЫЧНАЙ РАЗДРОБЛЕНАСЦІ

### САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ

- панаванне натуральнай гаспадаркі, адсутнасць трывалых эканамічных сувязей паміж рэгіёнамі;
- прагрэс у земляробстве і рамястве;
- пашырэнне княжацкага і баярскага («асяданне дружыны на зямлю») землеўладання;
- рост і ўмацаванне гарадоў як палітычных і культурных цэнтраў удзельных княстваў

### ПАЛІТЫЧНЫЯ

- павелічэнне колькасці прадстаўнікоў кіруючай дынастыі, падзел тэрыторыі паміж нашчадкамі;
- узмацненне ўлады мясцовых князёў і аслабленне ўлады кіеўскага князя;
- рост палітычнай актыўнасці насельніцтва;
- імкненне «малодшых» князёў да незалежнасці з мэтай пазбегнуць выплат «старэйшаму» князю ($^2/_3$ сабраных падаткаў у княстве накіроўваліся ў Кіеў)

Правообладатель Издательский центр БГУ

Распад Старажытнай Русі быў прадвызначаны зменамі, што адбываліся ў грамадстве як у сацыяльна-эканамічнай, так і ў палітычнай сферы.

**Наступствы раздробленасці**

Палітычную раздробленасць не варта адназначна ацэньваць як рэгрэс, крызіс або заняпад, больш слушна казаць пра далейшую эвалюцыю дзяржаўнага ладу і эканомікі Старажытнай Русі. Відавочныя адмоўныя бакі раздробленасці: міжусобныя войны, бесперапыннае драбленне княжацкіх уладанняў, аслабленне вайсковага патэнцыялу Старажытнай Русі. Усё гэта негатыўна адбілася на становішчы Старажытнарускай дзяржавы падчас мангольскага нашэсця 1237–1241 гг. У той жа час перыяд XII–XIII стст. (да мангольскага нашэсця) вызначаўся бурным ростам гарадоў і росквітам старажытнарускай культуры. У XIII–XIV стст. паступова знікаюць дыялектныя асаблівасці старажытнарускай мовы розных рэгіёнаў, што сведчыць пра захаванне і далейшае развіццё сацыякультурных кантактаў паміж усходнімі славянамі.

## НАСТУПСТВЫ ПАЛІТЫЧНАЙ РАЗДРОБЛЕНАСЦІ

**ПАЗІТЫЎНЫЯ**

- паляпшэнне ўмоў для развіцця рамяства, гандлю, земляробства;
- добраўладкаванне асобных княстваў-земель (брук у гарадах, дарогі, пашырэнне ворных зямель);
- асваенне новых гандлёвых шляхоў;
- росквіт культуры

**НЕГАТЫЎНЫЯ**

- рост княжацкіх міжусобіц;
- драбленне княстваў паміж спадкаемцамі;
- аслабленне ваеннай моцы і абараназдольнасці асобных дзяржаў;
- адмова ад правядзення ўзгодненай знешняй палітыкі старажытнарускіх княстваў

*У канцы IX ст. на палітычнай карце Еўропы пачала фарміравацца новая дзяржава — Старажытная Русь. Кіеўскія князі праводзілі актыўную знешнюю палітыку, пашыралі тэрытарыяльныя межы і міжнародны ўплыў на ўсіх напрамках. Дасягнуўшы найвышэйшага росквіту ў гады праўлення Уладзіміра Святаславіча і Яраслава Мудрага, Старажытная Русь не здолела пазбегнуць палітычнай раздробленасці ў XII ст.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| Канец X — першая палова XI ст. — час росквіту Старажытнай Русі ў гады праўлення Уладзіміра Святаславіча і Яраслава Мудрага | XI ст. — Полацкае княства дасягнула найбольшай магутнасці пры князях Брачыславе Ізяславічы і Усяславе Брачыславічы |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце дзейнасць першых князёў Старажытнай Русі. Прывядзіце найбольш яскравыя прыклады рэалізацыі розных функцый князя ў асобе канкрэтнага валадара.
2. Пералічыце рэформы кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. Дакажыце, што яны паспрыялі пачатку росквіту Старажытнай Русі.
3. Чым, на думку гісторыкаў, была абумоўлена роля тэрыторыі Беларусі ў стварэнні Старажытнарускай дзяржавы?
4. Растлумачце мэту і вынікі наступных падзей: заснаванне Вольгай пагостаў, дынастычныя шлюбы дачок князя Яраслава з кіраўнікамі іншых дзяржаў, Любецкі з'езд.
5. Што б вы адказалі свайму суразмоўцу, які сцвярджае, што Старажытная Русь — унікальная дзяржава, якая магла б пазбегнуць раздробленасці?

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 14–15. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі

РАГВАЛОД
ТУРАЎ ІЗЯСЛАЎ
БРАЧЫСЛАЎ ДРУЖЫНА
УСЯСЛАЎ ВЕЧА
ТУР ПОЛАЦК
ЮРЫЙ ЯРАСЛАВІЧ

У чым адрозненне племяннога княжання ад дзяржавы?

**Заснаванне полацкай княжацкай дынастыі**

**1. Утварэнне Полацкага княства.** Развіццё дзяржаўнасці на беларускіх землях звязана з утварэннем Полацкага княства, якое ўзнікла на аснове племяннога княжання палачан. Першым вядомым полацкім князем быў *Рагвалод*, які атабарыўся ў Полацку меркавана ў 960-х гг. і праводзіў незалежную ад Кіева палітыку. У канцы 970-х гг. заручыцца яго падтрымкай імкнуліся ноўгарадскі князь Уладзімір і яго брат кіеўскі князь Яраполк. Абодва пасваталіся да дачкі Рагвалода — Рагнеды. Атрымаўшы адмову, Уладзімір мячом дабіўся падпарадкавання Полацкага княства: забіў Рагвалода і двух яго сыноў, а Рагнеду гвалтам узяў за жонку. Затым Уладзімір захапіў Кіеў і стаў валадаром усёй Русі.

Рагнеда нарадзіла Уладзіміру дзяцей, сярод якіх самымі вядомымі сталі будучы полацкі князь Ізяслаў і кіеўскі князь Яраслаў. Да 988 г. Полацкае княства знаходзілася пад непасрэднай уладай кіеўскага князя Уладзіміра. Пасля прыняцця хрысціянства ён прызначыў сваіх сыноў наменікамі ў асобныя землі Старажытнарускай дзяржавы. Так у Полацку апынуўся князь *Ізяслаў* (988–1001 гг.), унук Рагвалода па маці. Менавіта за нашчадкамі Ізяслава замацавалася праўленне на Полацкай зямлі.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



Помнік Рагнедзе і Ізяславу.
Скульптар А. Арцімовіч.
1993 г.

Паказаныя на фота помнікі ўстаноўлены ў адным з найстаражытнейшых беларускіх гарадоў, непасрэдна звязаным з імем і лёсам Ізяслава — першага князя полацкай дынастыі.



Помнік князю Ізяславу.
Скульптар А. Прохараў.
2014 г.

1. *Назавіце гэты сучасны беларускі горад.*
2. *Апішыце гістарычныя падзеі, адлюстраваныя ў помніку «Рагнеда і Ізяслаў». Звярніце ўвагу на эмоцыі маленькага Ізяслава. Чым яны былі выкліканы? Як можна ахарактарызаваць будучага князя, зыходзячы з яго ўчынку? Паразважайце: княгіня Рагнеда надзявае або здымае карону? Дакажыце сваё меркаванне фактамі з гісторыі.*
3. *Чаму князь Ізяслаў паказаны з мячом і кнігай у руках? Якую спадчыну ён пакінуў сваім нашчадкам?*
4. *Калі ў Рэспубліцы Беларусь адзначаецца Дзень беларускага пісьменства? Устанавіце, як адкрыццё другога помніка звязана з гэтым святам адзінства друкаванага слова, літаратуры і гісторыі беларускага народа.*

**Умацаванне Полацкага княства ў часы Брачыслава**

**2. Дзейнасць полацкіх князёў па ўмацаванні дзяржавы.** У пачатку XI ст. Полацкае княства знаходзілася пад уладай князя *Брачыслава Ізяславіча* (1003–1044 гг.). Полацкі князь быў цалкам самастойны ва ўнутранай палітыцы. Ёсць ускосныя сведчанні таго, што Полацкае княства ўспрымалася як самастойная дзяржава і на міжнароднай арэне.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У *1021 г.* Брачыслаў здзейсніў *паход на Ноўгарад* і захапіў горад, але на зваротным шляху ў Полацк быў разбіты кіеўскім князем Яраславам Мудрым на рацэ Судаміры. У выніку яны заключылі дагавор, паводле якога да Полацкага княства далучаліся гарады *Віцебск* і *Усвяты*; цераз іх праходзілі важныя ў стратэгічных і эканамічных адносінах валокі на шляху «з варагаў у грэкі». Нечаканую ўступку Кіева гісторыкі тлумачаць імкненнем набыць у асобе полацкага князя саюзніка або, прынамсі, абараніць «тылы». У выніку мяжа Полацкага княства значна пашырылася на ўсход. На паўночна-заходніх землях княства, дзе сутыкаліся інтарэсы палачан і мясцовых балтыйскіх плямёнаў, у гады праўлення Брачыслава з'явілася крэпасць Брачыслаўль (Браслаў).

### Росквіт Полацкай зямлі

У праўленне князя *Усяслава Брачыславіча* (1044–1101 гг.) Полацкая зямля дасягнула найвышэйшай магутнасці. Пасля падпарадкавання аднаго з дрыгавіцкіх плямёнаў на рацэ Свіслач быў пабудаваны Менск. У часы праўлення Усяслава было наладжана рэгулярнае збіранне даніны з балцкіх і фіна-ўгорскіх плямёнаў —ліваў, латгалаў, земгалаў, куршаў. Гэта забяспечвала Полацк неабходнымі дадатковымі рэсурсамі, якія дазволілі ўзмацніць вайсковую арганізацыю, што, у сваю чаргу, давала магчымасць полацкім князям захоўваць незалежнасць сваёй зямлі і выступаць з сур'ёзнымі знешнепалітычнымі ініцыятывамі.

Напачатку свайго праўлення ў Полацку Усяслаў выступаў саюзнікам кіеўскага князя, удзельнічаў у сумесных паходах супраць качэўнікаў. Але пасля паміж князямі адбыўся канфлікт, магчыма, звязаны з размеркаваннем даніны. У 1065 г. Усяслаў спрабаваў захапіць Пскоў, затым праз год захапіў Ноўгарад. Гэта стала пачаткам зацяжнога супрацьстаяння Полацка і Кіева. Аб'яднаўшыся, валадары старажытнарускіх княстваў — сыны Яраслава Мудрага Ізяслаў,



*Полацкі князь Усяслаў Брачыславіч. Мастак Б. Альшанскі. 1997 г.*

Святаслаў і Усевалад — здолелі перамагчы Усяслава ў *бітве на Нямізе* **3 сакавіка 1067 г.**

Які горад упершыню згадваецца ў сувязі з бітвай на Нямізе?

Відавочна, полацкі князь і пасля паражэння меў сілы працягваць барацьбу. Пазбавіцца ад саперніка Яраславічы здолелі хітрасцю, парушыўшы клятву, замацаваную цалаваннем крыжа. Усяслаў быў схоплены і на некаторы час зняволены ў «порубе» ў Кіеве. Ужо ў наступным годзе кіяўляне паўсталі і абвясцілі Усяслава сваім князем. Сем месяцаў ён займаў кіеўскі трон, пасля змог вярнуцца ў Полацкую зямлю. Вайна працягнулася. Усяслаў хадзіў паходамі на Ноўгарад і Смаленск, але не здолеў дабіцца поспеху. Аднак




*Дзяржаўнасць на беларускіх землях у XI ст.*

Выкарыстоўваючы картасхему, назавіце напрамкі пашырэння межаў Полацкага княства.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Полацкае княства захавала сваю самастойнасць і нават пашырыла свае межы (напрыклад, за кошт Менскай воласці).

**Прычыны канфліктаў з кіеўскімі князямі**

Адна з прычын «векавой барацьбы» полацкіх Рагвалодавічаў і кіеўскіх Яраславічаў была звязана з імкненнем кіеўскіх князёў падпарадкаваць сабе Полацкую зямлю. У міжкняжацкай вайне можна пабачыць намер полацкіх князёў злучыць усе часткі крывіцкай зямлі. Але перш за ўсё прычына вайны полацкіх князёў з кіеўскімі заключалася ў тым, што першыя былі пазбаўлены магчымасці атрымоўваць пэўную частку рэсурсаў Старажытнай Русі. Замацаваўшыся ў межах Полацкай зямлі, «Рагвалодавы ўнукі» прэтэндавалі на частку даходаў з Наўгародскай зямлі.

Такім чынам, на працягу XI ст. усе намаганні валадароў Полацкага княства былі накіраваны на пашырэнне і ўмацаванне дзяржаўных межаў, міжнароднага аўтарытэту, нарошчванне эканамічнага патэнцыялу краіны.

**Прыродны фактар развіцця**

**3. Тураўскае княства.** Рассяленне людзей на тэрыторыі Тураўскай зямлі было абумоўлена прыроднымі асаблівасцямі, галоўным чынам нізіннай мясцовасцю, якая ўвесь час затаплялася і была пакрытая велізарнымі балотамі. Агромністыя слабазаселеныя нізіны спалучаліся са шчыльна заселенымі ўзвышшамі. Таму гарадскіх паселішчаў у Тураўскай зямлі было мала і ўзніклі яны пазней, чым у іншых усходнеславянскіх землях.

**У складзе Кіеўскай зямлі**

Першым легендарным князем Турава ў летапісе пад **980 г.** называецца *Тур*. Верагодна, у той час у Тураве — дрыгавіцкім племянным цэнтры — правілі мясцовыя князі. Але з 988 г. тут атабарыліся прадстаўнікі кіеўскай дынастыі Рурыкавічаў. «Аповесць мінулых гадоў» адзначае, што ў 988 г. Уладзімір «посади Вышеслава в Новегороде, а Изяслава в Полотьске, а Святополка — в Турове».

Пасля смерці Уладзіміра Святаполк стаў вялікім князем кіеўскім. Адначасова ён захаваў за сабой Тураўскае княства. З 1054 г. Тураўскім княствам валодалі князь Ізяслаў (сын Яраслава Мудрага) і яго сыны. Нейкі час Тураў належаў нашчадкам Уладзіміра Манамаха. Такім чынам, тураўскія князі ў XI ст. займалі велікакняжацкі прастол у Кіеве, што сведчыць пра цесныя адносіны Турава з Кіевам. Да сярэдзіны XII ст. Тураўскае княства з'яўлялася воласцю Кіеўскай зямлі, і яго лёс вырашаў кіеўскі князь.

Набыццё незалежнасці

Незалежнасць Тураўскае княства набыло ў 1157 г. У тым годзе памёр кіеўскі князь Юрый Даўгарукі, пасля чаго новы князь Ізяслаў Давыдавіч спрабаваў па сваім жаданні размеркаваць старажытнарускія землі. Незадоўга да смерці Юрый Даўгарукі аддаў Тураў князю *Юрыю Яраславічу* (1157–1167 гг.). Новы кіеўскі князь вырашыў зрабіць інакш — пасадзіць на тураўскі прастол свайго саюзніка. Быў арганізаваны вялікі паход кіеўскай, луцкай, галіцкай, смаленскай дружын, удзел у ім узялі і палачане. Але аблога Турава, абаронай якога кіраваў Юрый Яраславіч, поспеху не мела. Пры падтрымцы насельніцтва князь змог адстаяць сваю ўладу, а разам з тым дабіўся незалежнасці Тураўскай зямлі.

**4. Асаблівасці палітычнага развіцця Полацкага і Тураўскага княстваў у XI ст.** Палітычнае развіццё Полацкага і Тураўскага княстваў у канцы X — XI ст. не адрознівалася ад развіцця іншых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Старажытнай Русі. Падобныя дзяржавы ўтварыліся таксама на поўначы Еўропы, што было звязана з адсутнасцю ўплыву старажытнарымскіх традыцый. Рымскае права замацоўвала прыватную ўласнасць на зямлю, але на Русі і ў Паўночнай Еўропе гэтага не было. Таму тут доўга захоўваліся адносіны племянной эпохі, позна былі запісаны законы, а розныя пагадненні заключаліся ў вуснай форме.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Дружынныя дзяржавы**

Агульная рыса палітычнай арганізацыі першых усходнеславянскіх дзяржаў заключалася ў фарміраванні адміністрацыйнага апарату і іншых органаў улады людзьмі са складу княжацкай дружыны. Дружыннікі выконвалі не толькі ваенныя функцыі, яны былі дарадцамі князя, які ад пачатку абапіраўся на іх ва ўсіх пытаннях кіравання. У сувязі з гэтым такі тып дзяржавы гісторыкі прапанавалі называць *ваенным*, або *дружынным*. Яшчэ адной агульнай з'явай была традыцыя народнага самакіравання ў выглядзе *веча*.

Успомніце, што такое веча.

**Унікальнасць унутрыпалітычнага развіцця Полацкай зямлі**

Вельмі важнай асаблівасцю палітычнага развіцця Полацкай зямлі ў XI ст. было працяглае захаванне ўстойлівай вярхоўнай улады. Цэлае стагоддзе ў Полацку правілі ўсяго два князі: Брачыслаў Ізяславіч і Усяслаў Брачыславіч. Нічога не чуваць у гэты час пра полацкае веча. Аднак у пачатку XII ст. тут пачаўся перыяд палітычнай раздробленасці — нават раней, чым у Старажытнай Русі ў цэлым.

**Цесная сувязь Турава з Кіевам**

Апроч агульных рыс палітычнага развіцця княстваў варта вылучыць і іх асаблівасці. Для Тураўскай зямлі была характэрная доўгая цесная сувязь з Кіеўскім княствам. Да сярэдзіны XII ст. тут адсутнічала свая кіруючая дынастыя, тураўскім прастолам паводле свайго меркавання распараджаўся кіеўскі князь. Асаблівасцю дзяржаўнага ладу Тураўскай зямлі з'яўлялася адначасовая прысутнасць у Тураве *пасадніка* і князя, што было не характэрна для старажытнарускіх княстваў (апроч Наўгародскай зямлі). Калі тураўскія князі пераходзілі на кіеўскі прастол, замест сябе яны пакідалі пасаднікаў. Так, у 1146 г. згадваецца пасаднік Жыраслаў.

**Раздробленасць Полацкай зямлі**

**5. Раздробленасць Полацкага і Тураўскага княстваў.** У Полацкай зямлі палітычная раздробленасць пачалася пасля смерці Усяслава Брачыславіча. Князь пакінуў шасцярых сыноў: Барыса (Рагвалода), Глеба, Давыда, Рамана, Святаслава

(Георгія), Расціслава. Усе яны павінны былі атрымаць кіраванне валасцямі (адасобленымі княствамі), але, магчыма, гэта адбылося яшчэ пры жыцці князя.

Старэйшы сын Усяслава Брачыславіча займаў полацкі прастол і непасрэдна валодаў Полацкай воласцю (збіраў з яе даніну). Фармальна полацкі князь заставаўся вярхоўным валадаром усёй Полацкай зямлі і ўзначальваў іерархію князёў гэтага рэгіёна.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Барысавы камяні атрымалі назву ад імя полацкага князя Барыса, старэйшага сына Усяслава. Адзін з чатырох знойдзеных камянёў месціцца на беразе Заходняй Дзвіны каля сцен Сафійскага сабора. На валуне дыяметрам 3 м выбіты крыж і ступеньчатае падножжа, якое сімвалізуе Галгофу. На камені прысутнічае традыцыйны для Барысавых камянёў надпіс: «Госпадзе, памажы рабу свайму Барысу».



*Барысаў камень. Г. Полацк. XII ст.*

**З летапісу «Хроніка Быхаўца» (XVI ст.)**

«І той князь Барыс заснаваў горад у імя сваё на рацэ Бярэзіне і назваў яго Барысаў. І як русін [па веры] быў ён вельмі набожны і пабудаваў у Полацку царкву каменную святое Сафіі. І, валадарачы ў Полацку, быў ласкавы да падданых сваіх, і даў ім вольнасці, і дазволіў веча мець, і ў звон званіць, а потым і самім кіраваць, як у Вялікім Ноўгарадзе і Пскове».

1. *Назавіце прадстаўленыя віды гістарычных крыніц.*
2. *Якія звесткі пра асобу і дзейнасць полацкага князя Барыса дае кожная з іх?*
3. *Гэтыя гістарычныя крыніцы супярэчаць ці ўзаемадапаўняюць адна адну?*

У пачатку XII ст. Полацкая зямля, што складалася з некалькіх княстваў-валасцей, уяўляла сабой буйное незалежнае дзяржаўнае ўтварэнне. Самастойная палітыка полацкіх князёў, якія не падпарадкоўваліся магутнаму кіеўскаму князю Мсціславу Вялікаму,

Правообладатель Издательский центр БГУ

прымусіла апошняга арганізаваць у 1127 г. маштабную акцыю па скарэнні Полацка. Палачане хутка ўзвялі на прастол князя, які мог задаволіць Мсціслава. Але ў 1129 г. кіеўскі князь захапіў Полацкую зямлю і выслаў мясцовых князёў у Візантыю. Полацкія князі здолелі вярнуць свае ўладанні каля 1140 г.



*Высылка полацкіх князёў з жонкамі і дзецьмі ў Царград воляю Мсціслава Уладзіміравіча Вялікага Кіеўскага. Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу. XV ст.*

З канца XII ст. Полацкая зямля не была адзінай. Аслабла ўлада самога полацкага князя, усё большую ролю ў палітычных справах Полацка адыгрывала веча, якое актыўна ўмешвалася ў княжацкія міжусобіцы і выбірала кандыдатаў на полацкі прастол.

На працягу XII — пачатку XIII ст. у Полацкай зямлі апроч Полацкай вылучыліся Віцебская, Менская, Друцкая, Лукомская, Заслаўская, Лагойская, Барысаўская воласці. Таксама можна адзначыць тэндэнцыю да пераўтварэння Менскага княства ў самастойную зямлю з уласнымі валасцямі.

### Раздробленасць Тураўскага княства

Як і ў іншых землях, пасля смерці Юрыя Яраславіча ў складзе Тураўскай зямлі вылучыліся воласці. У канцы XII ст. на першае месца сярод га-

радоў Тураўскай зямлі выйшаў Пінск. Горад знаходзіўся на важным гандлёвым шляху з Кіева ў Польшчу, да таго ж месціўся далей ад Кіева, князі якога жадалі вярнуць сваю ранейшую воласць. З цягам часу Пінск узвысіўся над Туравам. Менавіта гэта дазволіла гісторыкам выкарыстаць паняцце «Турава-Пінская зямля». Тураўскім валадарам даводзілася лавіраваць паміж магутнымі суседзямі, трапляючы пад уплыў часам галіцкіх, а часам чарнігаўскіх князёў.

Княствы Панямоння

**6. Асаблівасці становішча Гарадзенскага княства.** Апроч Полацкага і Тураўскага княстваў у межах сучаснай Рэспублікі Беларусь у старажытнарускі перыяд паўсталі княствы ў Панямонні — Гарадзенскае, Ваўкавыскае, Слонімскае і Новагародскае. Асаблівасцю гэтых дзяржаўных утварэнняў была іх цесная сувязь з Кіевам, таму іх можна разглядаць як воласці Кіеўскай зямлі. У старажытнарускі перыяд гэты рэгіён з'яўляўся далёкай заходняй перыферыяй, фарпостам Кіеўскай зямлі на мяжы з тэрыторыяй рассялення балтаў. Разам з тым гарады Верхняга Панямоння былі багатыя і эканамічна развітыя, што ў далейшым стала адной з прычын іх значнай ролі ва ўтварэнні Вялікага Княства Літоўскага.

Найстаражытнейшым горадам Панямоння была Гародня (цяпер Гродна), упершыню згаданая ў 1127 г. Пра тое, што гэтаму гораду кіеўскі князь Уладзімір Манамах надаваў вялікае значэнне, сведчыць той факт, што сваю дачку ён аддаў замуж за гарадзенскага князя Усеваладка. У 1127 г. Усеваладка з Гародні ўдзельнічаў у паходзе паўднёварускіх князёў супраць Полацка. Падпарадкоўваліся кіеўскім князям і сыны Усеваладка. Да 1183 г. адносіцца адзіная летапісная звестка пра жыццё самога горада: «Того же лета Городен погоре всь и церквы каменая от блистания молнии и шибения грома».

Якую інфармацыю пра Гародню XII ст. можна атрымаць на аснове цытаты з летапісу?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**7. Беларускія землі ў складзе Смаленскай, Чарнігаўскай, Кіеўскай і Валынскай зямель.** Частка сучасных беларускіх зямель у XII — першай палове XIII ст. уваходзіла ў склад Чарнігаўскага, Смаленскага, Уладзіміра-Валынскага (з 1199 г. — Галіцка-Валынскага) і Кіеўскага княстваў. Іх палітычнае развіццё характарызавалася з'явамі, агульнымі для ўсяго старажытнарускага рэгіёна: вылучэннем новых княстваў-валасцей і міжусобнай барацьбой.

**У складзе Чарнігаўскай зямлі**

На тэрыторыі беларускага Пасожжа размяшчаўся горад Гомель (летапісны «Гомій»), упершыню згаданы пад 1142 г. У другой палове XII ст. ён быў сталіцай княства-воласці Чарнігаўскай зямлі. Некаторы час тут правіў чарнігаўскі князь Ігар Святаславіч — галоўны герой унікальнага старажытнарускага твора «Слова пра паход Ігараў».

Да чарнігаўскіх гарадоў на паўднёвым усходзе сучаснай Беларусі адносіліся таксама Рэчыца і Чачэрск. Некаторы час і іншыя землі радзімічаў з гарадамі Мсціслаў, Крычаў і Прапойск (сучасны Слаўгарад) належалі Чарнігаўскаму княству. Але каля 1127 г. яны адышлі да Смаленска.

Да ўладанняў Кіеўскага княства адносіліся сучасныя беларускія гарады Мазыр і Брагін. Мазыр у пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца ў 1155 г., калі Юрый Даўгарукі перадаў яго чарнігаўскаму князю.

**Беларускае Пабужжа**

Асаблівае месца сярод старажытнарускіх гарадоў на тэрыторыі паўднёвай Беларусі належала Бярэсцю (сучасны Брэст). Упершыню горад згадваецца пад 1019 г.: пацярпеўшы паражэнне ў барацьбе з Яраславам, князь Святаполк Акаянны збег на захад менавіта праз Бярэсце. Другі раз пра Бярэсце ў летапісе згадваецца ў сувязі з паходам на горад у 1022 г. Яраслава Мудрага. Лічыцца, што з другой паловы XII ст. на Бярэсце пашырылася ўлада валынскіх князёў. Памежнае становішча горада абумовіла асаблі-

васці арганізацыі кіравання ў ім: тут не зацвердзілася ўлада асобнай княжацкай дынастыі, на чале горада стаяў ваявода.




*Беларускія землі ў часы палітычнай раздробленасці. XII ст.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

*У другой палове X ст. у гісторыі Беларусі адзначалася важная з'ява: сфарміравалася першая ўласная дзяржава — Полацкае княства. Дзякуючы актыўнай знешняй палітыцы полацкіх князёў тэрыторыя княства значна пашырылася. Іншая дзяржава на тэрыторыі Беларусі — Тураўскае княства — атрымала незалежнасць толькі з 1157 г., да таго на тураўскім прастоле сядзелі будучыя кіеўскія князі. У Полацкай зямлі раней, чым у іншых старажытнарускіх княствах, надышла палітычная раздробленасць. Хоць полацкі князь захоўваў вярхоўную ўладу, але яго пазіцыі аслаблі, што праявілася падчас барацьбы з новай небяспекай — нямецкімі рыцарамі.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| V–VIII стст. — фарміраванне «варварскіх каралеўстваў» на тэрыторыі Еўропы | Канец X — XI ст. — фарміраванне першых дзяржаў — Полацкага і Тураўскага княстваў |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Растлумачце, якія геаграфічныя і гістарычныя фактары прывялі да стварэння першых дзяржаў на беларускіх землях з цэнтрамі ў Полацку і Тураве.
2. Намалюйце схему «Дзейнасць полацкіх валадароў па ўмацаванні і пашырэнні Полацкага княства». Якія былі асаблівасці палітычнага развіцця гэтай дзяржавы?
3. Што даказвае залежнае, але высокае становішча Турава ў складзе Кіеўскай зямлі? Як змяніў гэтае становішча тураўскі князь Юрый Яраславіч?
4. Чаму першыя ўсходнеславянскія дзяржавы гісторыкі называюць дружыннымі? Існуе меркаванне, што іх можна ахарактарызаваць як сярэдневяковыя дэмакратычныя дзяржавы. Ці згодныя вы з гэтым? Свой адказ пацвердзіце фактамі.
5. Вылучыце найбольш важную характарыстыку ў ранняй гісторыі наступных беларускіх гарадоў: Гародня, Бярэсце, Пінск, Гомель.
6. Складзіце прычынна-выніковы ланцужок падзей «Беларускія землі ў перыяд раздробленасці».

# § 16. Барацьба супраць знешніх заваёўнікаў

ЯРМО КРЫЖАКІ
ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА
КАЧЭЎНІКІ ВЯЧКА
ЯКАЎ ПАЛАЧАНІН ЗАЛАТАЯ АРДА
ОРДЭН МЕЧАНОСЦАЎ МАНГОЛЫ
УЛАДЗІМІР

Небяспечнае суседства

**1. Барацьба Старажытнай Русі з качавымі плямёнамі.** Старажытная Русь, у склад якой уваходзілі і беларускія землі, знаходзілася небяспечна блізка да Вялікага Стэпу. Прасторы Паўночнага Прычарнамор'я здаўна вабілі народы, галоўным заняткам якіх была качавая жывёлагадоўля. На працягу многіх стагоддзяў тут жылі хазары, венгры, печанегі, торкі, полаўцы. Жыццё качэўнікаў моцна залежала ад умоў надвор'я. Працяглая адсутнасць дажджоў прыводзіла да скарачэння харчовай базы для жывёлы. У пошуках новых пашаў качэўнікі часта чынілі рабаўніцкія набегі на суседзяў.

Барацьба з печанегамі і торкамі

У X ст. прычарнаморскія стэпы занялі печанегі. Амаль паўтара стагоддзя Русь вяла з імі напружаную барацьбу. Толькі ў гады праўлення Яраслава Мудрага печанегаў атрымалася разграміць. Яны сышлі да Дуная і сваімі набегамі непакоілі Візантыйскую імперыю. Следам за печанегамі ў Стэпе з'явіліся торкі, але аб'яднанымі намаганнямі рускіх князёў іх напады былі хутка адбітыя.

Набегі полаўцаў

З сярэдзіны XI ст. істотную небяспеку для Русі ўяўлялі полаўцы, якія амаль штогод чынілі набегі. Яны спусташалі вёскі і гарады, перакрывалі гандлёвыя шляхі. Апроч таго, полаўцы актыўна ўдзельнічалі ў міжусобіцах князёў Русі.

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Полаўцы і Русь у канцы XII — пачатку XIII ст.*

Выкажыце здагадку, чым маглі быць абумоўлены напрамкі набегаў качэўнікаў-полаўцаў.
Чаму ажыццяўляліся сумесныя руска-палавецкія паходы на землі Старажытнай Русі?

У пачатку XII ст. князям удалося аб'яднаць свае сілы ў барацьбе супраць стэпавікоў. Ініцыятарам па-



*Ваяры князя Ігара Святаславіча захопліваюць палавецкія вежы. Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу. XV ст.*

ходаў выступіў кіеўскі князь Уладзімір Манамах. Паходы кааліцый старажытнарускіх князёў у Палавецкі стэп ішлі адзін за адным. Ворагі былі надоўга адкінуты ад межаў Русі, аднак у 70-я гг. XII ст. зноў аднавілі актыўныя набегі.

У 1185 г. няўдачай скончыўся паход на полаўцаў ноўгарад-северскага князя Ігара Святаславіча. Адсутнасць адзінства сярод князёў Русі згубна адбівалася на арганізацыі адпору стэпавым агрэсарам.

**Полацкія князі ў войнах супраць качэўнікаў**

У летапісах сустракаюцца згадкі пра ўдзел у агульных паходах у Стэп князёў з тэрыторыі Беларусі. Так, напрыклад, у 1060 г. полацкі князь Усяслаў Брачыславіч у кааліцыі з сынамі Яраслава Мудрага (Ізяславам, Святаславам і Усеваладам) хадзіў паходам на качэўнікаў-торкаў. Пастаяннымі ўдзельнікамі паходаў супраць полаўцаў былі тураўскія князі.

**2. Мангольскае нашэсце на Усходнюю Еўропу і яго наступствы.** У першай палове XIII ст. дзяржавы Азіі і Еўропы сутыкнуліся з нашэсцем новых качэўнікаў — манголаў, якіх таксама называлі татарамі (паводле назвы аднаго з мангольскіх плямёнаў). Бязлітасныя заваёўнікі, аб'яднаныя Чынгісханам (памёр у 1227 г.), захапілі агромністыя тэрыторыі Усходняй і Сярэдняй Азіі і стварылі магутную дзяржаву. У 1237 г. нападам на

Успомніце, якія тэрыторыі былі заваяваны манголамі на Усходзе.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Разанскае княства пачалося мангольскае нашэсце на Русь.

### Тэрыторыя Беларусі падчас мангольскага нашэсця

Унук Чынгісхана — хан Батый — здолеў на працягу *1237–1241 гг.* захапіць і спустошыць найбуйнейшыя гарады княстваў Старажытнай Русі. Не пацярпелі толькі Наўгародская зямля і землі на захадзе Русі — Полацкае, Тураўскае, Новагародскае княствы і большая частка Смаленскага.

Выкажыце здагадку, якія знаходкі археолагаў маглі сведчыць пра спусташэнне беларускіх гарадоў манголамі.

Доўгі час гісторыкі лічылі, што мангольскае нашэсце амаль не закранула сучасную тэрыторыю Беларусі. Аднак падчас археалагічных даследаванняў былі знойдзены пераканаўчыя доказы спусташэння манголамі Гомеля і Магілёва. У Іпацьеўскім летапісе захаваліся сведчанні пра разрабаванне манголамі Бярэсця. Хутчэй за ўсё, горад быў захоплены, а яго жыхароў вывелі ў поле і забілі. Аднак гэтыя летапісныя сведчанні пакуль не атрымалі археалагічных пацвярджэнняў.




*Мангольскае нашэсце на беларускія тэрыторыі (1239–1241 гг.)*

Якія гарады зазналі напады манголаў? У якім годзе, паводле Іпацьеўскага летапісу, быў спустошаны г. Брэсце?

Існуюць розныя здагадкі наконт таго, чаму большая частка беларускіх зямель не была закранута мангольскім нашэсцем. Традыцыйна гэта тлумачаць тым, што манголы былі аслабленыя папярэднім паходам у Паўночна-Усходнюю Русь. Магчыма, заваёўнікі не жадалі ісці ў беларускія лясы і балоты пасля адкрытых прастораў паўднёвай Русі, але ў той жа час маглі пасылаць на поўнач ад Прыпяці асобныя атрады. Існуе здагадка, што ў цэлым мангольскі паход на Русь задумваўся як дапаможны. Ён павінен быў засцерагчы ад небяспекі правы фланг мангольскага войска перад планаваным наступам на захад, забяспечыць яго дадатковымі вайсковымі злучэннямі з усходніх славян.

Якая з версій, на ваш погляд, заслугоўвае найбольшага даверу? Растлумачце свой выбар.

**Наступствы мангольскага нашэсця**

Наступствы мангольскага нашэсця былі цяжкія для ўсходнеславянскіх зямель. Спустошаныя землі трапілі ў залежнасць ад новай дзяржавы, створанай манголамі ў сярэдзіне XIII ст., — *Залатой Арды*.

Гібель большай часткі князёў і іх дружыннікаў не толькі значна паменшыла магчымасць супрацьстаяння заваёўнікам у першы перыяд зацвярджэння ардынскага ярма, але і істотным чынам дэфармавала развіццё феадальных адносін на Русі.

**Ярмо — сістэма залежнасці ад Арды**

**3. Ардынскае ярмо.** Паўднёвая частка тэрыторыі сучаснай Беларусі падчас мангольскага нашэсця знаходзілася ў складзе Кіеўскага (Мазыр, Брагін) і Чарнігаўскага (Слуцк, Клецк, Рэчыца, Рагачоў, Гомель) княстваў. Паколькі гэтыя землі да ўключэння ў склад Вялікага Княства Літоўскага падпарадкоўваліся Ардзе, на іх тэрыторыю пашырылася *ардынскае ярмо*, якое праяўлялася ў неабходнасці атрымання ярлыкоў на княжанне і выплаты даніны.

Некаторы час у падпарадкаваным становішчы знаходзіліся Смаленская (з беларускімі гарадамі Віцебск, Орша, Копысь, Мсціслаў, Крычаў, Прапойск) і Турава-Пінская землі. Аднак большая частка сучаснай тэрыторыі Беларусі — Полацкая зямля, княствы

Правообладатель Издательский центр БГУ

Панямоння (Гарадзенскае, Навагародскае, Слонімскае, Ваўкавыскае — так званая Чорная Русь) — не трапіла ў залежнасць ад Арды. Звязана гэта было з тым, што пералічаныя землі апынуліся ў сферы ўплыву новай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага і Рускага. Больш за тое, імклівае пашырэнне тэрыторыі ВКЛ за кошт былых зямель Старажытнай Русі тлумачыцца імкненнем пазбавіцца ад цяжкага абавязку выплачваць даніну і знайсці дастаткова моцнага абаронцу ад ардынскіх набегаў.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У народнай памяці захавалася легенда аб жорсткай барацьбе нашых продкаў супраць татарскіх заваёўнікаў у 1249 г. каля Крутагор'я. «Коні ступаюць няпэўна, твары ваяроў заляпаны граззю, ратнікі паныла сунуцца да Крутагор'я насустрач няпрошаным гасцям — войску хана Койдана... і змяшалася славянская і татарская кроў у вадзе ціхай рачулкі, і пакрылася зямля чалавечымі целамі, і хмара з чорнай стала злавесна чырвонай...» — так апісаная вялікая сеча каля Крутагор'я. У гэтай крывавай бітве татары былі ўшчэнт разбітыя. Загінуў і Батыеў улюбёнец Койдан-хан...



*...замак. Н. Орда. 1876 г.*

1. *Даведайцеся, ці знайшлі гэтыя падзеі пацвярджэнне археолагаў.*
2. *Згодна з легендай, населены пункт пасля бітвы быў перайменаваны. Якую назву ён атрымаў? Якія існуюць тлумачэнні паходжання дадзенай назвы?*
3. *Прывядзіце сучасную назву гэтага горада. Калі і ў гонар каго ён быў перайменаваны? Чаму?*

**4. Нямецкая экспансія ва Усходняй Прыбалтыцы. Барацьба з крыжакамі.** У канцы XII — пачатку XIII ст. «націск на Усход» узмацнілі нямецкія рыцары-крыжакі. У імкненні «звярнуць ва ўлонне хрысціянства» язычніцкія плямёны Усходняй Прыбалтыкі былі пабудаваны нямецкія крэпасці Іксюль і Гольм, у вусці Дзвіны заснаваны г. Рыга (1201 г.) і ўтвораны рыцарскі *Ордэн мечаносцаў* (1202 г.).

З'яўленне крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы

Ад Ранняга сярэднявечча залежныя ад Полацка княствы Герцыке і Кукенойс кантралявалі гандаль у нізоўях Дзвіны і спаганялі даніну з прыбалтыйскіх плямёнаў ліваў і латгалаў. Усходнія славяне не ўмешваліся ва ўнутранае жыццё балцкіх плямёнаў. Няма ніводнага прыкладу прымусовага распаўсюджвання хрысціянства візантыйскага ўзору.

Супрацьстаянне нямецкім рыцарам

Замацаванне немцаў у нізоўях Дзвіны пагражала інтарэсам Полацка. Полацкі князь Уладзімір, дружыны князёў Усевалада Герцыкскага і Вячкі (Вячаслава) Кукенойскага ладзілі не вельмі ўдалыя паходы на крэпасць Гольм, гарады Іксюль і Рыгу ў 1203 і 1206 гг.

Экспансія нямецкіх рыцараў у Ніжнім Падзвінні ўзмацнялася. У 1208 г. крыжакі авалодалі Кукенойскім княствам, князь Вячка спаліў свой горад і сышоў на Русь. Таленавіты палкаводзец і адважны ваяр, ён у 1223 г. быў пастаўлены ноўгарадскім князем Яраславам Усеваладавічам на княжанне ў Юр'еў (Дэрпт, Тарту).

У 1209 г. немцы спалілі Герцыке, а князь Усевалад вымушаны быў прызнаць васальную залежнасць ад рыжскага біскупа. Уплыў Полацка ў Ніжнім Падзвінні быў страчаны. У 1216 г. да князя Уладзіміра звярнуліся эсты з просьбай выступіць паходам на Рыгу, абяцаючы ўзняць паўстанне супраць немцаў і блакіраваць рыжскую гавань. Князь сабраў вялікае кааліцыйнае войска, у якое ўваходзілі дружыны Полацка, Менска, Смаленска, Віцебска і Друцка, але раптоўна памёр, і вялікі паход, які меў мэтай

Правообладатель Издательский центр БГУ

вызваліць Ніжняе Падзвінне ад нямецкага ўплыву, так і не адбыўся.

Пагроза з боку крыжакоў была адным з фактараў, якія спрыялі аб'яднанню літоўскіх плямёнаў пад уладаю князя Міндоўга.




*Заваёвы рыцараў-крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы ў першай палове XIII ст.*

**Барацьба супраць шведскіх рыцараў**

Між тым у прыбалтыйскія падзеі ўмяшаліся шведы. У *1240 г.* іх атрад высадзіўся ў вусці Нявы. Дзевятнаццацігадоваму наўгародскаму князю Аляксандру Яраславічу ўдалося разграміць шведаў намаганнямі ўсяго толькі адной дружыны з нешматлікімі ратнікаміі-наўгародцамі. За гэтую бліскучую перамогу ён быў пазней празваны Неўскім. Сярод «мужоў храбрых», што

адзначыліся ў гэтай бітве, быў і прадстаўнік Полацкай зямлі — Якаў Палачанін.

5 красавіка *1242 г.* Аляксандр Неўскі разграміў крыжакоў на лёдзе Чудскога возера. Лядовае пабоішча прыпыніла рух крыжакоў на ўсход.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Полацкае княства першае з беларускіх зямель сутыкнулася з агрэсіяй крыжакоў. На старонках летапісаў сустракаюцца імёны слаўных ваяроў, што змагаліся супраць ворагаў.

*1. Паводле прапанаванага апісання вызначце імёны гістарычных асоб.*



**Князь...**
*Скульптар З. Азгур. «Вялікі кароль Вальдэмар» — так назваў яго ордэнскі храніст Генрых Латвійскі*



**Князь...** *і старэйшына Мээліс, што аддалі свае жыцці падчас абароны Тарту ў 1224 г. Эстонія. Скульптар О. Мяні*



*Мініяцюра з Асабовага летапіснага зводу. Лоўчы ў світе Аляксандра Яраславіча,* **адзін з** *шасці найсмялейшых* **ваяроў** *яго дружыны. «...наеха на полк и мужествовав крепко, и похвали его князь»*

*2. Прааналізуйце ўнёсак адной з прадстаўленых асоб у барацьбу з крыжакамі, выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Землі, заселеныя ўсходнімі славянамі, увесь час падвяргаліся нападам ворагаў з розных напрамкаў. Так знешнепалітычны ціск стаў надзвычай важным фактарам, які аказваў непасрэднае ўздзеянне на развіццё дзяржаўнасці ва Усходняй Еўропе ў цэлым і на тэрыторыі Беларусі ў прыватнасці.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
| --- | --- |
| 1202–1204 гг. — Чацвёрты крыжовы паход | 1203 г. — пачатак супрацьстаяння Полацкага княства з крыжакамі |

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Што прываблівала качэўнікаў на землях Старажытнай Русі? Ахарактарызуйце асноўныя этапы барацьбы з качэўнікамі Паўночнага Прычарнамор'я.
2. Чаму тураўскія і полацкія князі бралі актыўны ўдзел у сумесных з рускімі дружынамі паходах супраць полаўцаў?
3. Назавіце асноўныя наступствы мангольскага нашэсця на беларускія землі.
4. Як складваліся ўзаемаадносіны Полацкага княства з крыжакамі ў канцы XII — пачатку XIII ст.?
5. Ацаніце знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у першай палове XIII ст. Як яно паўплывала на развіццё дзяржаўнасці ў далейшым?

# § 17. Грамадства і эканоміка беларускіх зямель у IX–XIII стст.

НАТУРАЛЬНАЯ ГАСПАДАРКА
ДЗЯЦІНЕЦ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ
ПАСАД ДАНІНА «ВЕРВ»
САБОР КНЯЗЬ ГАНДАЛЬ
ПАЛЮДДЗЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА
ПАГОСТ РАМЯСТВО
ГАНДАЛЬ

**1. Структура грамадства. Роля абшчыны.** У IX–XIII стст. насельніцтва беларускіх зямель дзялілася на свабоднае і залежнае. Сярод свабоднага насельніцтва былі групы людзей, якія адрозніваліся ўзроўнем свайго багацця, характарам дзейнасці.

Асноўныя катэгорыі насельніцтва

Найвышэйшае становішча ў грамадстве займалі князі. Да пануючага пласта грамадства належалі племянная знаць і баяры (пачаткова княжацкія дружыннікі, пазней яны сталі землеўласнікамі). Іншай дастаткова ўплывовай праслойкай грамадства былі купцы і *госці* — тыя, хто займаўся міжнародным гандлем.

Найбольш шырокі пласт насельніцтва складалі свабодныя абшчыннікі — *«людзі»*. Асобнай часткай землеўласнікаў, якія непасрэдна залежалі ад князя, былі *смерды*. Яны валодалі асабістай свабодай, але зямля, на якой працавалі, належала князям. Смерды з'яўляліся асноўнымі падаткаплацельшчыкамі і складалі аснову апалчэння.

Бяспраўнай катэгорыяй насельніцтва былі *халопы (рабы)*, якія з'яўляліся ўласнасцю сваіх гаспадароў. Галоўнай крыніцай іх папаўнення быў палон. Існавалі і іншыя групы асабіста залежных людзей, але іх залежнасць насіла часовы характар. Да гэтай

Правообладатель Издательский центр БГУ

катэгорыі належалі *закупы*, што трапілі ў залежнасць, узяўшы пазыку («купу»), якую павінны былі адпрацоўваць у гаспадарцы пана, пакуль не вернуць.




**Роля абшчыны**

Успомніце, чаму абшчына ва ўсходніх славян атрымала назву «верв».

Асаблівае месца ва ўсходніх славян займала суседская абшчына — *верв*. На беларускіх землях у эпоху Сярэднявечча яна з'яўлялася ніжэйшым звяном сацыяльнай арганізацыі. Для яе былі характэрныя агульная тэрыторыя пражывання, агульнае землекарыстанне, абшчынныя органы кіравання. Абшчына рэгулявала ўзаемаадносіны паміж яе членамі, абараняла іх ад самавольства палітычнай улады, спрыяла падтрыманню маёмаснай роўнасці. У ёй існавала кругавая адказнасць за злачынствы абшчыннікаў, рэалізацыю патрабаванняў дзяржаўнай улады (выкананне павіннасцей, выплату падаткаў, збор апалчэння).

**Зараджэнне феадальных адносін**

Успомніце, як ва ўсходніх славян называўся працэс збору даніны.

**2. Асаблівасці развіцця гаспадаркі.** Напачатку XIII ст. на беларускіх землях адбываўся паступовы пераход ад родаплемянных адносін да феадальных. Найбольшай каштоўнасцю з'яўлялася зямля, вярхоўным яе ўласнікам у дзяржаве лічыўся князь. Свае і дзяржаўныя патрэбы ён задавальняў за кошт падуладнага насельніцтва шляхам збору *даніны*.

**Асноўныя заняткі насельніцтва**

На беларускіх землях панавала *натуральная гаспадарка*. Асновай эканомікі было земляробства. Паступова ўдасканальваліся прылады працы, спосабы апрацоўкі зямлі. На змену падсечна-агнявому зем-

ляробству прыйшло ворнае. Асноўнай прыладай працы земляробаў стала драўлянае рала з жалезным наральнікам. Выкарыстоўвалася папарная сістэма ў выглядзе двухполля, пазней трохполля. Разам з тым на поўдні Беларусі, у Прыпяцкім Палессі, дзе было шмат балот і густыя лясы, працяглы час захоўвалася падсечна-агнявая сістэма земляробства.

Чым адрознівалася ворнае земляробства ад падсечна-агнявога?

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Найбольш пашыранымі збожжавымі культурамі, якія вырошчвалі нашы продкі ў Сярэднявеччы, былі проса, жыта, пшаніца, авёс, ячмень. Іх пасевы і цяпер займаюць значнае месца ў раслінагадоўлі Беларусі, гарантуюць харчовую бяспеку і забяспечваюць экспартны патэнцыял краіны.

Спрадвеку крупы складаюць аснову харчавання чалавека, робяць яго рацыён збалансаваным, сытным і паўнавартасным.

*Вызначце, з якіх збожжавых культур зроблены крупы, што ёсць у рацыёне кожнага беларуса.*



*Манныя крупы* ________



*Аўсяныя крупы* ________



*Груца* ________



*Ячныя крупы* ________



*Проса* ________

Апроч земляробства нашы продкі займаліся садаводствам, вырошчваннем гародніны, гадоўляй розных відаў жывёл (буйной рагатай жывёлы, свіней, коней), а таксама птушкагадоўляй. Значную ролю ў жыцці ўсходніх славян адыгрывалі промыслы (паляванне, бортніцтва, рыбалоўства і інш.). Развіваліся рамёствы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Шматукладнасць эканомікі

У IX–XI стст. на беларускіх землях суіснавалі тры эканамічныя ўклады: аджылы *родаплемянны* (галоўны яго перажытак — абшчына (верв)), *рабаўладальніцкі*, што не атрымаў значнага пашырэння, і *феадальны*, які толькі зараджаўся.

Сельскае рамяство

**3. Развіццё рамёстваў.** Першапачаткова ўсе неабходныя ў побыце рэчы выраблялiся ў кожнай сялянскай сям'і. Напрыклад, амаль усе жанчыны займаліся прадзеннем і ткацтвам. Больш складаныя рэчы выраблялі вясковыя рамеснікі — кавалі, ганчары, бондары і іншыя. Пастунова рамяство аддзялілася ад сельскай гаспадаркі і большая частка рамеснікаў сканцэнтравалася ў гарадах.

Пашырэнне кола рамесніцкіх спецыяльнасцей у гарадах

Гарадское рамяство падзялілася на мноства спецыяльнасцей. Так, кавальствам у XII ст. займаліся збройнікі, шчытнікі, цвікары. Ад кавалёў аддзяліліся домнікі, якія «варылі» жалеза. Сапраўднай віртуознасці дасягнулі ювеліры — «кавалі медзі і срэбру». Масавыя знаходкі прадметаў кавальскага рамяства — нажоў, цвікоў, замкоў, ключоў — сведчаць пра іх выраб на продаж. Найвышэйшага майстэрства дасягнулі збройнікі: выробленыя імі мячы, кальчугі, шчыты і шлемы высока цаніліся ў еўрапейскіх краінах.



Як называліся рамеснікі, якія займаліся вырабам і апрацоўкай шкур?

Багатыя лясныя ўгоддзі, даступнасць драўніны спрыялі развіццю рамёстваў, звязаных з апрацоўкай дрэва. Паўсюдна вялася апрацоўка косці, з якой рабілі прадметы побыту і прылады працы (праколкі, ручкі нажоў, гузікі, шахматы, грабяні).

У IX ст. з'явілася ганчарнае кола, абпальванне посуду рабілася ў спецыяльных горнах. У XII ст. у многіх гарадах, у тым ліку ў Ізяслаўлі, Тураве, Пінску, Мсціславе, пачаўся выраб паліўнай (пакрытай глазурай) керамікі. Апроч посуду ганчары выраблялі і дзіцячыя цацкі, якія разам са сваёй асноўнай функцыяй заклікамістаны былі адганяць злых духаў. Асобную катэгорыю гліняных вырабаў

складалі праслiцы — спецыяльныя грузiкі для верацяна. У канцы X ст. з'явілася шкловытворчае рамяство.

У цэлым рамеснікі дасягнулі ўзроўню майстэрства, максімальна магчымага пры наяўнасці прымітыўных прылад працы і тэхналогій. Майстры маглі прапанаваць свае вырабы для гандлю з суседнімі краінамі.

Што такое «плінфаробства»? Да якога віду рамяства яно адносіцца?

**4. Шляхі ўзнікнення і функцыі старажытных гарадоў Беларусі.** Аддзяленне рамяства і гандлю ад земляробства прывяло да ўзнікнення гарадоў. Шляхі іх фарміравання былі розныя. Пра гарады варта казаць толькі пасля ўзнікнення дзяржавы. Дзяржаўная ўлада выкарыстоўвала ўмацаваныя гарадзішчы для сваіх мэт — яны рабіліся месцамі размяшчэння княжацкага прастола або прадстаўнікоў князёў, збору падаткаў і даніны. Так гарады ператвараліся ў адміністрацыйныя цэнтры. Згаданыя гарадзішчы маглі быць племяннымі цэнтрамі.

### Шляхі фарміравання гарадоў

- з племянных цэнтраў
- з пунктаў збору даніны
- па рашэнні князёў
- з паселішчаў гандляроў і рамеснікаў
- з памежных крэпасцей

*Шляхі ўзнікнення гарадоў*

Яшчэ адзін магчымы шлях звязаны з развіццём месцаў для гандлю. Гэтыя своеасаблівыя гандлёвыя «факторыі» мелі агульныя прыкметы: уладкаванне на найважнейшых гандлёвых шляхах, наяўнасць трывалых умацаванняў, значная плошча паселішча, мабільнасць і поліэтнічнасць насельніцтва. Існавалі і іншыя шляхі ўтварэння гарадоў.

### Асноўныя часткі горада

Пісьмовыя крыніцы фіксуюць існаванне на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XIII ст. звыш 30 гарадоў. Найстаражытнейшым і найбуйнейшым сярод іх быў Полацк (862 г.). Гарады таго часу ў асноўным складаліся з умацаванага *дзяцінца* і рамесна-гандлёвага *пасада*, дзе знаходзіўся *рынак*. Пасля прыняцця хрысціянства ў цэнтры будавалі *сабор* — галоўны гарадскі храм. Насельніцтва гарадоў складалі знатныя людзі (князь, дружыннікі, баяры), іх дамачадцы і слугі, а таксама рамеснікі і гандляры (купцы).

Паводле якога крытэрыю вызначаецца афіцыйная дата заснавання горада? Назавіце гарады Беларусі, якія адзначылі тысячагоддзе.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*Археалагічны музей «Бярэсце»* — унікальны, адзіны ў Еўропе музей сярэдневяковага ўсходнеславянскага горада. Галоўным яго экспанатам з'яўляецца археалагічны раскоп, які займае плошчу 1118 м$^2$. На глыбіні 4 м знаходзіцца частка рамеснага квартала — 28 драўляных жылых і гаспадарчых пабудоў, дзве вулічныя брукаванкі, частакол, рэшткі глінабітных печаў.

Вывучыце інфармацыю на афіцыйным сайце музея і выканайце заданні.



1. *На старонках якога летапісу і калі ўпершыню згадваецца Бярэсце?*
2. *Да якога стагоддзя належыць дадзены архітэктурны раскоп?*
3. *Якая структурная частка горада прадстаўлена ў музеі?*
4. *Прывядзіце 2–3 цікавыя факты з гісторыі гэтага музея.*
5. *Апішыце ўсходнеславянскі сярэдневяковы горад.*

У XI–XIII стст. гарады на тэрыторыі Беларусі з'яўляліся абарончымі пунктамі, адміністрацыйнымі цэнтрамі асобных княстваў і валасцей, а таксама рэлігійнымі, культурнымі, рамеснымі і гандлёвымі цэнтрамі.

**Напрамкі знешняга гандлю**

**5. Характар і змест гандлю.** Археалагічныя знаходкі сведчаць пра высокі ўзровень развіцця рамяства ў гарадах у XII–XIII стст., што, у сваю чаргу, спрыяла развіццю гандлёвых адносін.

Княствы, якія сфарміраваліся на беларускіх землях, падтрымлівалі разнастайныя сувязі з многімі краінамі Усходу і Захаду. Напрыклад, Полацкае княства ўсталявала трывалыя сувязі са скандынаўскімі краінамі. Невыпадкова назва «Полацк» (у форме «Полтэск'ю») трапіла ў скандынаўскія сагі.

У асноўным замежныя тавары траплялі на беларускія землі з поўдня, з гарадоў Паўднёвай Русі, пераважна з Кіева. У сваю чаргу, Кіеў быў звязаны з Паўночным Прычарнамор'ем і Візантыяй. Так, у беларускіх гарадах — Навагародку, Менску, Полацку, Віцебску, Бярэсці — знойдзены прывезеныя з поўдня шкляныя бранзалеты, пацеркі, пярсцёнкі, посуд, у тым ліку амфары з віном і алеем. З каўказскага самшыту на беларускіх землях выраблялі грабяні. Шкляны і фаянсавы посуд, дарагія тканіны (у тым ліку шаўковыя) прывозіліся з усходніх краін і Візантыі. Прыбалтыка і Ноўгарад Вялікі выступалі пасрэднікамі ў гандлі з Заходняй Еўропай.




*Міжнародныя гандлёвыя шляхі*

Што аб'ядноўвала гэтыя гандлёвыя шляхі?
Чаму іх па праве можна назваць міжнароднымі? Якую ролю для насельніцтва беларускіх зямель адыгрываў шлях «з варагаў у грэкі»?

Правообладатель Издательский центр БГУ

У сваю чаргу, з тэрыторыі Беларусі вывозілі футра, мёд, воск, смалу, лён, жалезныя замкі, зброю і жывёлу. Пра добра наладжаны гандаль сведчаць знаходкі шаляў і гірак да іх.

**Міжнародныя гандлёвыя шляхі**

Развіццю гандлю спрыялі міжнародныя гандлёвыя шляхі. Найбольш вядомы гандлёвы шлях Высокага сярэднявечча — «з варагаў у грэкі» — вёў проста да спадкаемніцы Рымскай імперыі — Візантыі. Асноўны рух ішоў ад Балтыйскага мора праз Заходнюю Дзвіну, затым волакам — на Дняпро і далей у Чорнае мора. У сувязі з пастаяннымі набегамі качэўнікаў Паўночнага Прычарнамор'я, а таксама захопам у пачатку XIII ст. крыжакамі Канстанцінопаля шлях страціў сваё значэнне.

**Развіццё грашовага абарачэння**

Актыўны знешні гандаль спрыяў развіццю грашовага абарачэння. Пра выкарыстанне ў старажытнарускі перыяд арабскай манеты — дырхема, а пасля еўрапейскіх дэнарыяў сведчаць знойдзеныя скарбы. Сярод найбуйнейшых — манетны скарб «Казьянка» каля Полацка (больш за 7,5 тыс. манет), які быў схаваны ў сярэдзіне X ст.

## СІСТЭМА ГРАШОВАГА АБАРАЧЭННЯ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У IX–XIII стст.

**Дырхем**
манеты з Арабскага халіфату

**IX–X стст.**



**Дэнарый**
манеты краін Заходняй Еўропы

**канец X — XI ст.**



**Безманетны перыяд**
шкуркі пушных звяркоў, срэбраныя злiткі (грыўны)

**канец XII — XIII ст.**



*На тэрыторыі Беларусі ў станаўленні грамадства і эканомікі адбываліся працэсы, характэрныя і для іншых рэгіёнаў свету. Развіццё рамёстваў, гандлю, наладжванне трывалых сувязей з еўрапейскімі і ўсходнімі краінамі стваралі ўмовы для станаўлення феадальных адносін.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| X–XIII стст. — бурны рост гарадоў і гарадскога насельніцтва ў Заходняй Еўропе | X–XIII стст. — узнікненне першых гарадоў — адміністрацыйных, абарончых і гандлёва-рамесных цэнтраў |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце структуру ўсходнеславянскага грамадства ў IX–XIII стст.
2. Раскрыйце ролю абшчыны ў жыцці ўсходніх славян.
3. Якія віды рамяства найбольш паспяхова развіваліся ў гарадах у X–XIII стст.?
4. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, назавіце пяць гарадоў, што ўзніклі ў IX–XIII стст., даведайцеся даты іх заснавання і шляхі фарміравання. Укажыце версіі паходжання назваў дадзеных населеных пунктаў.
5. Растлумачце ўзаемасувязь паміж развіццём рамяства і пашырэннем гандлёвых адносін. Што характэрна для гандлю ў IX–XIII стст.?

Правообладатель Издательский центр БГУ

## § 18. Пашырэнне хрысціянства на тэрыторыі Беларусі

ХРЫСЦІЯНСТВА ЕПАРХІЯ
МІФ КІРЫЛА ТУРАЎСКІ
ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ
МІТРАПАЛІТ МНАГАБОЖЖА
ІДАЛ РАГНЕДА
ІЗЯСЛАЎ

Фарміраванне сістэмы вераванняў

**1. Асаблівасці язычніцкага светапогляду.** Міфалогія славян сваімі каранямі паглыбляецца ў часы індаеўрапейскага адзінства. У працэсе стварэння этнічных супольнасцей пачалі фарміравацца сістэмы вераванняў, якія ішлі далей за першабытныя ўяўленні і ўключалі, як правіла, цэлы пантэон багоў, адказных за розныя галіны гаспадарчай дзейнасці чалавека або яго сацыяльнай практыкі. Вера ў багоў захоўвалася і пасля распаду індаеўрапейскага адзінства. Але змены ў жыцці народаў (павышэнне ролі земляробства, а значыць, з'яўленне моцнай залежнасці ад надвор'я, вядзенне грабежніцкіх і захопніцкіх войнаў і, як вынік, перавага воінскага культу) вылучалі на першыя ролі больш значных цяпер багоў.

Асноўным заняткам славян было земляробства, адпаведна, у іх вераваннях існавалі многія багі і духі зямлі. На тэрыторыі Беларусі найбольш вядомыя імёны трох багоў — *Пярун* (бог нябеснага агню, грому і маланкі, вайны), *Вялес* (бог дабрабыту, падземнага свету, апякун сямейнага ачагу, ахоўнік багацця) і *Ярыла* (бог сонца, вясновай урадлівасці, кахання).

Славяне ўяўлялі сваіх багоў як людзей з іх чалавечымі якасцямі, звычкамі і паводзінамі. Каб багі былі міласэрныя, людзі стараліся паслужыць ім: пакланяліся, прыносілі ахвяры ў выглядзе пачастункаў. З дрэва, каменю, косці, гліны язычнікі рабілі вялікія фігуры багоў — ідалаў.

Растлумачце, чаму хрысціяне называюць язычніцтва ідалапаклонствам.

## ЯЗЫЧНІЦКІЯ ВЕРАВАННІ

Абагаўленне сіл прыроды і складванне разнастайных культаў



Фарміраванне пантэона багоў





Складванне культу продкаў



Фарміраванне міфічных вобразаў

Месцы пакланення і ахвярапрынашэнняў язычніцкім багам ствараліся на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў часы неаліту. Больш за ўсё іх было ў перыяды бронзавага і жалезнага вякоў, што абумоўлівалася шырокім распаўсюджаннем земляробчага культу Сонца, які звязваюць з урадлівасцю.

**Свяцілішча — месца пакланення язычніцкім багам**

Назвы населеных пунктаў, што захаваліся з тых часоў (Святое возера, Чырвоная гара, Божая горка, Валова гара, Турава гара, Перунова гара, Святы камень, Дажбогаў камень, Змееў камень і інш.), сведчаць пра прысутнасць язычніцкіх свяцілішчаў на тэрыторыі Беларусі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Культ продкаў**

Беларусы здаўна мелі культ пакланення продкам, звязаны з пахавальнымі звычаямі. Лічылася, што душы памерлых ахоўваюць род і ўсяляк спрыяюць яго росквіту.

**Абрады і святы нашых продкаў**

Абрады і святы нашых продкаў былі цесна звязаны з земляробчай дзейнасцю, штодзённым жыццём, грамадскімі адносінамі. У адпаведнасці з порамі года існавалі чатыры асноўныя святы — Каляды, Масленіца, Купалле, Дажынкі. Яны прыблізна накладаліся на астранамічныя перыяды, звязаныя з сонцастаяннем і раўнадзенствам.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Беларускі арнамент — традыцыйны набор сімвалаў і колераў, які выкарыстоўвалі нашы продкі яшчэ з дахрысціянскіх часоў. Кожны ўзор мае свой пэўны сэнс і значэнне: вечнасць, багацце, жыццё, сонца, ураджай і шмат іншага.



1. *Адной з найважнейшых выяў у беларускім арнаменце з'ўляецца ромб. З чым гэта звязана і што ён сімвалізуе?*
2. *Растлумачце, чаму арнамент на адзенні размяшчаецца ў пэўных месцах, напрыклад на каўняры, манжэтах.*
3. *Свае пачуцці маладыя дзяўчаты маглі выказаць праз вышыўку. Былі ўзоры, якія адлюстроўвалі зараджэнне кахання, узаемнае каханне, неўзаемнае каханне (гл. малюнак). Вызначце адпаведнасць паміж узорам і яго сімвалічным значэннем.*

**Перадумовы прыняцця хрысціянства на землях усходніх славян**

**2. Прыняцце і распаўсюджанне хрысціянства на Русі.** Язычніцтва склалася ва ўмовах першабытнасці, калі галоўным клопатам для чалавека была барацьба з прыроднай стыхіяй. Але ў грамадстве, дзе існавала дзяржава, дзе адны людзі падпарадкавалі сабе другіх, чалавека турбавала ўжо іншае. Як жыць у новых умовах, як сябе паводзіць? Адказаць на гэтыя пытанні язычніцтва ўжо не магло.

Да X ст. большая частка насельніцтва Еўропы прыняла хрысціянства, а многія краіны Усходу — іслам.

Гэтыя рэлігіі прызнавалі існаванне аднаго ўсёмагутнага Бога. Хрысціянства і іслам усталёўвалі нормы паводзін людзей у грамадстве, дзе існаваў падзел на багатых і бедных. Тым, хто не парушаў гэтых нормаў, г. зн. не чыніў грахоў, абяцалі пасля смерці шчаслівае жыццё ў раі. Хрысціянства, напрыклад, вучыла, што ўсякая ўлада — ад Бога і ёй належыць падпарадкоўвацца.

### Хрышчэнне Старажытнай Русі

Паводле легенды, кіеўскаму князю Уладзіміру Святаславічу раілі прыняць розныя рэлігіі, у тым ліку і хрысціянства з Рыма, і іслам. Уладзімір спыніў свой выбар на хрысціянстве з праваслаўнай Візантыі. З Візантыяй Русь звязвалі даўнія адносіны. На працягу IX–X стст. ужо шмат русаў хрысцілася ў Канстанцінопалі, сярод іх і княгіня Вольга.

**У 988 г.** Уладзімір хрысціўся сам і заклікаў да гэтага сваіх падданых. Першымі прынялі хрысціянства жыхары Кіева, затым — Ноўгарада. Паступова хрысціянства зацвердзілася і ў іншых землях Старажытнай Русі.

На тэрыторыі Беларусі хрысціянізацыя пачаткова ахапіла насельніцтва гарадоў, але ўжо ў першыя дзесяцігоддзі пасля афіцыйнага прыняцця новай веры яна атрымала шырэйшае распаўсюджанне. У Полацку ў 990-х гг. княжыў першы ў беларускай гісторыі князь-хрысціянін Ізяслаў — сын Уладзіміра і Рагнеды, які ўвайшоў у гісторыю як князь-кніжнік.



*Помнік 1000-годдзю хрысціянства ў Беларусі. Г. Заслаўе. Мінская вобласць*

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ



*Хрышчэнне Уладзіміра. Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу. XV ст.*

### Аповесць мінулых гадоў

І калі Уладзімір прыйшоў у Кіеў, дык загадаў паваліць ідалаў — адных пасячы, а другіх спаліць. Перуна ж загадаў прывязаць да хваста каня і валачы яго з гары па Борычавым узвозе да Ручая і прыставіў 12 мужоў лупцаваць яго кіямі… Затым паслаў Уладзімір па ўсім горадзе сказаць: «Калі не прыйдзе хто заўтра на раку — хай будзе гэта багаты, або бедны, або жабрак, або раб, — будзе мне ворагам». Пачуўшы гэта, з радасцю пайшлі людзі, кажучы: «Калі б не было гэта добрым, не прынялі б гэтага князь наш і баяры»… На наступны ж дзень выйшаў Уладзімір з папамі царыцынскімі і корсунскімі на Дняпро, і сышлося там людзей безліч. Увайшлі ў ваду і стаялі там адны па шыю, другія па грудзі… папы ж, стоячы, спраўлялі малітвы. Людзі ж, хрысціўшыся, разышліся па дамах. Уладзімір жа быў рады, што пазнаў Бога сам і людзі яго… І паставіў царкву ў імя святога Васілія на пагорку, дзе стаяў ідал Перуна і іншыя і дзе спраўлялі ім адправы князь і людзі. І па іншых гарадах пачалі ставіць цэрквы і прызначаць туды папоў і прыводзіць людзей на хрышчэнне ва ўсіх гарадах і вёсках. Пасылаў ён збіраць у найлепшых людзей дзяцей і аддаваць іх у вучэнне кніжнае. Маці ж дзяцей тых плакалі па іх; бо не ўмацаваліся яшчэ яны ў веры і плакалі па іх як па мёртвых.

1. *Растлумачце, чаму Уладзімір учыніў публічную расправу над язычніцкімі ідаламі.*
2. *Якімі метадамі князь прымушаў падданых прымаць хрысціянства?*
3. *Чаму першая з цэркваў была ўзведзена ў славу св. Васілія?*

**3. Фарміраванне царкоўнай арганізацыі.** Разам з прыняццем хрысціянства ў Старажытнай Русі з'яўляецца і царкоўная арганізацыя. На чале Рускай царквы стаяў кіеўскі мітрапаліт, якога прызначалі ў Канстанцінопалі. Мітрапаліту падпарадкоўваліся епіскапы, якія знаходзіліся ў найважнейшых цэнтрах Старажытнай Русі. Да пачатку XI ст. у Кіеўскай мітраполіі было створана пяць епархій, дзве з якіх знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі (Полацкая і Тураўская). Кожная епархія, у сваю чаргу, складалася з царкоўных

прыходаў, манастыроў і іншых духоўных устаноў. Першыя манастыры з'явіліся ў Кіеве ў першай палове XI ст. Найбольш вядомым на беларускіх землях стаў *Спаскі манастыр* у Полацку, заснаваны Ефрасінняй Полацкай у 1120-я гг.

Кіеўская мітраполія падпарадкоўвалася Канстанцінопальскай патрыярхіі, таму мітрапалітамі і епіскапамі на Русі былі ў асноўным грэкі, выхадцы з Візантыйскай імперыі. Да пачатку XIII ст. вядомыя толькі два рускія мітрапаліты — *Іларыён* і *Клімент Смаляціч*.

Полацкая епархія

**4. Полацкая і Тураўская епархіі.** Полацкая епархія была створана ў **992 г.** Яна ўключала даволі значную тэрыторыю, што выходзіла за межы Полацкага княства.




*Пашырэнне хрысціянства*

Чаму афіцыйны адлік гісторыі хрысціянства ў Беларусі пачынаецца з 992 г.?

Першым вядомым полацкім епіскапам быў Міна (пачатак XII ст.), былы манах Кіева-Пячэрскага манастыра. Пазней згадваюцца епіскапы Ілля, Казьма, Мікола.

Тураўская епархія

У зборніку апавяданняў аб заснаванні Кіева-Пячэрскага манастыра ўказана дата стварэння Тураўскай епархіі — **1005 г.** — і імя першага епіскапа — Фама. Тураўская епархія ўключала апроч Турава Пінскую, Новагародскую, Берасцейскую, Слуцкую і Ваўкавыскую землі.

Назавіце асноўныя прычыны пашырэння хрысціянства на тэрыторыі Беларусі.

**5. Суіснаванне язычніцтва і хрысціянства.** Пра поспехі хрысціянізацыі на беларускіх землях сведчыла мноства пабудаваных цэркваў і манастыроў. Толькі каменных цэркваў у Полацку ў XII ст. налічвалася не менш за дзесяць, драўляных было нашмат больш.

Пераканаць нядаўніх язычнікаў адмовіцца ад веры сваіх продкаў было няпроста. Многія людзі працягвалі адзначаць язычніцкія святы і ўпотай маліцца старым багам. Працяглы час валхвы заклікалі насельніцтва вярнуцца да старой рэлігіі. Тым не менш Старажытная Русь хутка зрабілася хрысціянскай дзяржавай. З цягам часу па дапамогу людзі сталі звяртацца да хрысціянскіх святых.

У штодзённым жыцці насельніцтва беларускіх зямель хрысціянства і традыцыйныя вераванні зблыталіся. Гэтае спалучэнне хрысціянства і язычніцтва атрымала назву *дваяверства*. Водгалас старажытных язычніцкіх уяўленняў захаваўся ў народнай абраднасці, традыцыйных строях аж да Навейшага часу.

**6. Рэлігійна-асветніцкая дзейнасць у XII ст.** Пашырэнню хрысціянства на беларускіх землях у XII ст. спрыяла асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.

Ефрасіння Полацкая

*Ефрасіння Полацкая* — адна з найбольш вядомых жанчын беларускай зямлі. Яе дзейнасць у галіне адукацыі, хрысціянскага паслушэнства і служэння Богу

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

1. *Параўнайце помнікі Ефрасінні Полацкай: чым яны адрозніваюцца і чым падобныя?*
2. *Ці магчыма па асобных элементах кампазіцый вызначыць кірункі дзейнасці Ефрасінні?*
3. *Ефрасінню Полацкую прызнаюць святой як праваслаўная, так і каталіцкая царква. Што, на вашу думку, было самае каштоўнае ў яе дзейнасці? Свой адказ абгрунтуйце.*



*Помнік Ефрасінні Полацкай. Г. Мінск. Скульптар І. Голубеў. 2000 г.*



*Помнік Ефрасінні Полацкай. Г. Полацк. Скульптар І. Голубеў. 1999 г.*

стала ўзорам святасці. Прадслава (свецкае імя Ефрасінні) была дачкой князя Святаслава Усяславіча і мела вялікія магчымасці для культурна-асветніцкай дзейнасці.

Дзякуючы намаганням Ефрасінні былі заснаваны два манастыры і пабудаваны дзве царквы. Калі верыць «Жыцію», пры адным манастыры былі адкрытыя школа навучання грамаце, іканапісная і ювелірная майстэрні. У мясцовым скрыпторыі Ефрасіння займалася перапісваннем кніг. Свой зямны шлях яна скончыла паломніцтвам у Іерусалім. Напярэдадні ад'езду Ефрасіння «ўладкавала свае манастыры», відаць, напісаўшы для іх статут.

Кірыла Тураўскі

Яшчэ адным славутым асветнікам быў *Кірыла Тураўскі*. Жыццё Кірылы ў яго біяграфічным «Жыціі» апісваецца ў агульных рысах: «Гэты шчаслівы Кірыла нарадзіўся і вырас у горадзе Тураве. Сын багатых бацькоў, ён не любіў, аднак, багацця і тленнай славы свету гэтага; але перш за ўсё ён імкнуўся зразумець навуку Божых кніг і дасягнуў дасканалага іх пазнання».

З курса беларускай літаратуры ўспомніце, у якіх жанрах пісаў Кірыла Тураўскі. Як яго называлі сучаснікі?



„Калі б казаў я ад сябе, вы рабілі б добра, не прыходзячы ў храм. Але я абвяшчаю вам Слова Госпада, чытаю вам грамату Хрыстову… Я раздаю словы Божыя, лепшыя ад золата і каштоўных камянёў, саладзейшыя за мёд у сотах, і вы пазбаўляецеся іх, не прыходзячы ў царкву… але вас, хто прыходзіць, хвалю і благаслаўляю“.

Кірыла Тураўскі, епіскап Турава, пісьменнік і прапаведнік

Кірыла Тураўскі першы з манахаў здзейсніў подзвіг стоўпніцтва: замкнуўся ў манастырскай келлі, каб цалкам прысвяціць сябе медытацыі і малітве. У гэты час ён напісаў свае першыя творы, што прынеслі яму вядомасць. Нават калі Кірыла стаў епіскапам Тураўскім і займаўся кіраваннем епархіяй, прапаведніцкай і царкоўна-палітычнай дзейнасцю, будаўніцтвам храмаў, ён не прыпыняў сваёй літаратурнай працы. Да нашых дзён захавалася каля 70 твораў прапаведніка — шматлікія ўрачыстыя «Словы», павучанні, малітвы, каноны.

Умацаванне дзяржаўнай улады

**7. Значэнне прыняцця хрысціянства.** Хрысціянства давала больш пераканаўчыя, чым язычніцтва, адказы на пытанні пра сацыяльныя і палітычныя з'явы, пра адносіны паміж грамадствам і ўладай.

Хрысціянская вера ўмацавала аўтарытэт дзяржаўнай (княжацкай) улады, дала разуменне таго, што да яе трэба ставіцца з павагай, бо ўлада даецца ад Бога. Той, хто ёю валодае, нясе вялікую адказнасць перад Богам.

**Змяненне міжнароднага становішча**

Вельмі важным наступствам афіцыйнага прыняцця хрысціянства для Старажытнай Русі стала ўмацаванне яе міжнароднага аўтарытэту, усталяванне трывалых дыпламатычных адносін з еўрапейскімі дзяржавамі. Праз сямейна-шлюбныя саюзы Русь парадніласся з многімі краінамі.

**Развіццё культуры**

Прыняцце хрысціянства на візантыйскі ўзор значна паўплывала і на развіццё культуры ўсходніх славян. Грэчаская царква назапасіла значны фонд богаслужбовай, багаслоўскай, гістарычнай літаратуры і стварыла высокаразвітое мастацтва. Дзякуючы прыняццю хрысціянства пачалося будаўніцтва цэркваў. На тэрыторыі Беларусі з’явіліся каменная кладка, іканапіс, фрэскавы жывапіс. Пры пасрэдніцтве Візантыі ўсходнія славяне змаглі дакрануцца да скарбаў антычнай культуры.

З цягам часу некаторыя судовыя справы, перш за ўсё ў сямейна-шлюбных адносінах, перайшлі ў кампетэнцыю царквы. Царква брала на сябе клопат пра людзей, якія страцілі сувязь са сваёй абшчынай. Велізарная заслуга належала святарам у асвеце насельніцтва.

**Змены ў адносінах паміж людзьмі**

Новая вера паўплывала на адносіны паміж людзьмі. Хрысціяне імкнуліся ўратаваць сваю бессмяротную душу, дзеля чаго мусілі выконваць шэраг запаведзяў: шанаваць бацьку і маці, не забіваць, не красці, не падманваць. Хрысціянскае вучэнне заклікала чалавека жыць паводле прынцыпу «не рабі іншаму таго, чаго не хочаш сабе», цярпліва зносіць пакуты зямнога жыцця, бо гэтыя выпрабаванні даюцца суразмерна магчымасцям чалавека.

*Язычніцкія вераванні знаходзілі адлюстраванне ў міфалогіі, культах, штодзённым жыцці, пакланенні багам і духам. Хрысціянства і традыцыйныя народныя вераванні зблыталіся ў штодзённым жыцці насельніцтва беларускіх зямель. Хрысціянства, безумоўна, дало новы штуршок развіццю культуры ўсходніх славян, істотна пашырыла і ператтварыла яе пачатковы патэнцыял.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
|---|---|
| 1054 г. — раскол хрысціянскай царквы | 992 г. — створана Полацкая епархія |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце язычніцкую рэлігію славян. Назавіце яе асноўныя рысы.
2. Якім чынам адбывалася прыняцце і пашырэнне хрысціянства на Русі? Наколькі «выбар веры» князем Уладзімірам быў заканамерны?
3. Як і калі пашырылася хрысціянства на тэрыторыі Беларусі?
4. Якая роля Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага ў пашырэнні хрысціянства, у развіцці беларускай культуры?
5. Складзіце лагічны ланцужок, у якім адлюструйце прычыны прыняцця хрысціянства на тэрыторыі Беларусі, шляхі яго пашырэння, значэнні і наступствы дадзенага працэсу.

# § 19. Культура Беларусі ў IX–XIII стст.

МІНІЯЦЮРА
ФРЭСКА ЛЕТАПІС
БЕРАСЦЯНАЯ ГРАМАТА
РАГВАЛОДАВЫ І БАРЫСАВЫ КАМЯНІ
АРХІТЭКТУРА
ЖЫЦІЕ

Глаголіца і кірыліца

**1. Пісьменнасць.** Першыя помнікі стараславянскай мовы, што дайшлі да нас, напісаны славянскімі алфавітамі — глаголіцай і кірыліцай. Самыя раннія ва Усходняй Еўропе ўзоры кірылічных тэкстаў адносяцца да першай трэці X ст.

Самыя старажытныя пісьмовыя помнікі стваралі на камені, гліне, дрэве з выкарыстаннем разнастайнай тэхнікі: выразання, выдрапвання. Спачатку абодва алфавіты існавалі адначасова. Але ў далейшым глаголіцу выцесніла кірыліца, якая вытрымала выпрабаванне часам і зрабілася асновай сучасных сістэм славянскай пісьменнасці: рускай, балгарскай, сербскай і інш.

Пашырэнне пісьменства

З канца X ст. з пашырэннем міждзяржаўных адносін атрымалі пашырэнне княжацкія пячаткі. Узорам пісьма ўсходніх славян з'яўляецца знойдзеная ў Ноўгарадзе пячатка полацкага князя Ізяслава (канец X ст.) з выявай трызубца і надпісам кірыліцай: «Ізас/лав/ос». У Полацку на тэрыторыі Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра была знойдзена свінцовая пячатка Ефрасінні Полацкай.



*Пячатка Ефрасінні Полацкай. XII ст.*

Цікавыя надпісы на сценах цэркваў або на надмагільных і межавых камянях. Яны дазваляюць зрабіць вывад пра пашырэнне пісьменства не толькі

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

1. *Растлумачце паходжанне слоў «азбука», «алфавіт». Назавіце аўтараў славянскай азбукі.*
2. *Параўнайце літары дзвюх азбук. Растлумачце, чаму менавіта кірыліца легла ў аснову сучаснага беларускага алфавіта. Дзе цяпер выкарыстоўваецца глаголіца?*
3. *У кірыліцы кожная літара мела назву і абрыс, а большасць з іх — і лікавае значэнне. Так, літара «А» называлася «аз», што значыць «Я»; літара «Б» — «букі», што значыць «літара» або «кніга», «пісьмо»; літара «В» называлася «ведзі», г. зн. «ведаю». Якое выказванне можна скласці з назваў першых літар?*

| Кірыліца | | | Літары глаголіцы | Кірыліца | | | Літары глаголіцы |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Літары кірыліцы X–XI стст.** | **Назвы літар** | **Гукавое спалучэнне** | | **Літары кірыліцы X–XI стст.** | **Назвы літар** | **Гукавое спалучэнне** | |
| А | Аз | [а] | Ⰰ | Ф | Ферт | [ф] | Ⱇ |
| Б | Букі | [б] | Ⰱ | Х | Хер | [х] | Ⱈ |
| В | Ведзі | [в] | Ⰲ | Ѡ | От (амега) | [о] | Ⱉ |
| Г | Глаголі | [г] | Ⰳ | Ц | Цы | [ц'] | Ⱌ |
| Д | Дабро | [д] | Ⰴ | Ч | Чэрв | [ч'] | Ⱍ |



*Фрагмент графіці. Спаса-Праабражэнская царква. Г. Полацк*

сярод князёў, святароў і манахаў, але і сярод простага народу. Так, каля сабора Святой Сафіі ў Полацку знаходзіцца адзін з так званых Барысавых камянёў, на якім высечаны зварот да Бога. А на вялікім плоскім камені ў падмурку будынка надрапаны імёны людзей, якія будавалі сабор.

Пра распаўсюджанасць пісьменнасці сярод насельніцтва ў XI–XIII стст. сведчыць бытавое пісьменства на васковых таблічках і бяросце. Археолагі знайшлі больш за 50 пісалаў па воску, якія спярша вырабляліся з косці, а пазней з жалеза, пакрытага цынкам або меддзю. Перавагай васковых таблічак была іх шматразовасць: напісанае на дошцы загладжвалі лапаткай, пасля вострым канцом пісала рабілі новы запіс. Падобны від пісьма існаваў да з'яўлення паперы.

Бяроста захавалася горш, але на тэрыторыі Беларусі былі знойдзены тры берасцяныя граматы: дзве ў Мсціславе і адна ў Віцебску. Яны ўяўляюць асаблівую цікавасць як крыніцы, у якіх адлюстравана штодзённае жыццё людзей. Захавалася некалькі надпісаў, зробленых на розных прадметах побыту: на посудзе, драўляных калодках, прасліцах. Яны сведчаць пра прыналежнасць рэчаў канкрэтным асобам.



*Берасцяная грамата. Г. Віцебск. Канец XIII ст.*

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Берасцяныя граматы тых гадоў уяўлялі сабой кароткія, але інфарматыўныя паведамленні. Большая іх частка змяшчала асабістыя пасланні, літаратурныя і фальклорныя творы (замовы, школьныя жарты, загадкі, настаўленні па хатняй гаспадарцы), запісы вучэбнага характару (азбукі, склады, школьныя практыкаванні, дзіцячыя малюнкі і крамзолі).

1. *Растлумачце, чаму берасцяныя граматы называюць «сярэдневяковымі SMS-паведамленнямі».*
2. *Якая інфармацыя і з якой мэтай запісвалася і перадавалася іншым людзям?*
3. *Ці можна будзе даведацца пра штодзённае жыццё сучаснага чалавека з архіва яго перапіскі ў месенджарах і сацсетках?*

**Вусная народная творчасць — каштоўнае духоўнае багацце**

**2. Вусная народная творчасць.** Вусная народная творчасць як першаасноваўсякай літаратуры складае важную частку духоўнага жыцця народа. Гэта культура малітваў, казак, міфаў і магічных заклёнаў. Значэнне слова, і пісьмовага, і асабліва вуснага, у сярэдневяковай культуры было надзвычайным. Малітвы ўспрымаліся як спосаб зносін з Богам і святымі, казані на біблейскія сюжэты — як прыклад для штодзённага жыцця.

Менавіта ў вуснай народнай творчасці на працягу стагоддзяў выпрацоўвалася, шліфавалася і ўдасканальвалася роднае слова, народ выказваў свае запаветныя мары і памкненні. Яно, як каштоўная

духоўная спадчына, клапатліва перадавалася з пакалення ў пакаленне.

Вуснапаэтычная творчасць замацоўвала многія маральна-этычныя нормы, якія рэгулявалі адносіны людзей у грамадстве і сям'і. Дзякуючы гэтым нормам чалавек доўгі час жыў у гармоніі з прыродай, пакланяўся ёй і аберагаў, тым самым баронячы сваё атачэнне.

**Жанры вуснай народнай творчасці**

Вусная народная творчасць на тэрыторыі Беларусі прадстаўлена практычна ўсімі жанрамі: каляндарная і сямейна-абрадавая паэзія, замовы, казкі, паданні і легенды, прыказкі і прымаўкі, загадкі, народны тэатр у розных яго формах, сацыяльна-бытавыя песні. Многія гераічныя падзеі нашай мінуўшчыны дастаткова поўна адлюстраваны ў казках пра асілкаў і волатаў. Глыбокія і каларытныя былі песенныя цыклы, якія выконваліся на вяселлях, пахаваннях, падчас каляндарных свят.



*Тураўскае евангелле. XI ст.*

Растлумачце, як узніклі выразы «чырвоны радок», «літара ў літару».

**3. Рукапісныя кнігі.** Асноўным сродкам фіксавання і пашырэння інфармацыі да вынаходства кнігадрукавання былі рукапісныя кнігі. На тэрыторыі Беларусі яны з'явіліся разам з хрысціянствам і ствараліся пры манастырах і цэрквах, а пазней — пры княжацкіх дварах. Адным з найстаражытнейшых помнікаў славянскага пісьменства з'яўляецца *Тураўскае евангелле*, створанае ў XI ст. Яго тэкст напісаны кірыліцай. Тураўскае евангелле ўпрыгожана застаўкамі — рознакаляровымі вялікімі літарамі. Матэрыялам для гэтай рукапіснай кнігі паслужыў пергамент. Вокладка была зроблена з дзвюх дошак, абцягнутых скурай, а загортвалася кніга з дапамогай спражкі.

**Жыціі святых**

Надзвычай багаты, унікальны матэрыял пра ўмовы жыцця, светапогляд людзей той эпохі ўтрымліваюць *агіяграфічныя* творы (жыццяпісы або жыціі святых). Хрысціянства (а разам з ім і некаторыя культурныя традыцыі) Русь запазычыла з Візантыі. Агіяграфічная літаратура не з'яўляецца выключэн-



*Мініяцюра з выявай св. Лукі.*
*Аршанскае евангелле. XII ст.*

Аршанскае евангелле — рукапісны помнік, створаны, верагодна, у Полацку ў XIII ст. Назву помнік атрымаў ад г. Орша, дзе ў адным з манастыроў быў знойдзены ў 1812 г. сярод рэчаў, раскіданых французамі. Рукапісны помнік мае высокамастацкае афармленне. У евангеллі змешчаны дзве мініяцюры з выявамі евангелістаў Лукі і Мацея. Цікавасць уяўляюць вялікія літары, скампанаваныя з выяў чалавечых і звярыных фігур і стылізаваных раслінных парасткаў. Напрыклад, літара «Д» мае выгляд сілуэта чалавека, які сядзіць на плеценым крэсле. На каленях чалавека ляжаць цымбалы, на якіх ён грае.



Выкажыце здагадку, якая вялікая літара паказана на ілюстрацыі.

нем. Мэтай напісання твораў гэтага жанру было стварэнне «прыкладаў жыцця». На тэрыторыі Беларусі былі распаўсюджаны жыціі князёў-пакутнікаў Барыса і Глеба, ігумена Аўраамія Смаленскага і іншых, ствараліся жыціі Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.

Чаму тэксты рукапісных кніг упрыгожвалі мініяцюрамі, а саму кнігу — каштоўным акладам?

## Летапісанне

Ужо з XI ст. пашыраюцца летапісы. Найкаштоўнейшай крыніцай па дзяржаўнай, хрысціянскай гісторыі ўсіх усходніх славян і беларускіх зямель з'яўляецца «Аповесць мінулых гадоў». Складзена яна ў Кіеве ў пачатку XII ст. на аснове даўнейшых летапісных тэкстаў. Тут знаходзім звесткі пра расяленне славянскіх плямёнаў, раннюю гісторыю Полацкага княства, князя Ізяслава Брачыславіча, а таксама інфармацыю пра гарады на тэрыторыі Беларусі.

Чым было абумоўлена напісанне летапісаў у манастырах?

З пэўнай доляй імавернасці можна казаць пра летапісанне ў Полацку. На думку беларускіх даследчыкаў, летапіс мог пачынацца з падзей княжання Васіля Святаславіча ў Полацку ў 1132 г., а першыя запісы былі зроблены ў манастыры, заснаваным Ефрасінняй Полацкай, сястрой князя Васіля.

Каменнае дойлідства

**4. Характэрныя рысы архітэктуры.** Русь прыняла хрысціянства ад Візантыі, і амаль у гэты ж час у Кіеў прыбылі першыя візантыйскія дойліды, вядомыя ва ўсім хрысціянскім свеце. Да канца X ст. на Русі не было каменнага і цаглянага будаўніцтва, панавалі драўляныя пабудовы. З прыняццем хрысціянства на тэрыторыі Беларусі з'явілася манументальная архітэктура. Помнікам *каменнага дойлідства* з'яўляецца пабудаваны ў сярэдзіне XI ст. у Полацку пры князю Усяславу Брачыславічу *Сафійскі сабор*. Узведзены ён быў пасля падобных будынкаў у Кіеве і Ноўгарадзе, але не саступаў ім ні па памерах, ні па мастацкай выразнасці. Узвядзенне Сафійскага сабора звязана з ростам палітычнай ролі Полацкага княства.

Архітэктурныя школы

Архітэктура на тэрыторыі Беларусі ў XI–XIII стст. знаходзілася пад моцным уплывам візантыйскай тэхнікі будаўніцтва і аздаблення царкоўных і свецкіх будынкаў. Паступова на аснове мясцовых традыцый фарміраваліся новыя падыходы да будаўніцтва і функцыянавання манументальнай архітэктуры. Даследчыкі выдзяляюць дзве архітэктурныя школы: полацкую і гарадзенскую.

Самастойная архітэктурная школа ў Полацку склалася ўжо ў першай палове XII ст. У такой тэхніцы пабудаваны Вялікі сабор Бельчыцкага манастыра, царква ў гонар Параскевы Пятніцы (царква з магільняй), Барысаглебская царква Бельчыцкага манастыра і інш.

Са старадаўніх цэркваў Гародні да нашых дзён захавалася Барысаглебская, або Каложская, царква,

## АРХІТЭКТУРНЫЯ ШКОЛЫ

### ПОЛАЦКАЯ

- прыўзнятасць цэнтральнай часткі храма;
- «паласатая» кладка «са схаваным радам»;
- какошнікі спічастай формы;
- вежападобны, ярусны выгляд храма

### ГАРАДЗЕНСКАЯ

- кладка сцен з раўнамерным чаргаваннем палос плінфы, прыродных валуноў і раствору;
- дэкор фасадаў рознакаляровай пліткай і паліраванымі валунамі;
- выкарыстанне галаснікоў;
- падлогі, пакрытыя глазураванай керамічнай пліткай з геаметрычным арнаментам



*Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку*



*Барысаглебская (Каложская) царква ў Гародні*

у якой адлюстраваліся характэрныя рысы гарадзенскай архітэктурнай школы.

Каменныя царкоўныя пабудовы XII ст. апроч Полацка і Гародні былі яшчэ ў Віцебску, Навагародку, Тураве. Лічыцца, што майстроў у Віцебск запрашалі з Балгарыі або Грэцыі, таму што пры будаўніцтве Благавешчанскай царквы выкарыстоўваўся будаўнічы прыём чаргавання радоў плінфы і каменных блокаў.



*Камянец. Акварэль Напалеона Орды. Канец XIX ст.*

Развівалася і свецкае будаўніцтва. У гарадах пачалі ўзводзіць уязныя брамы. Пазней у выніку заходнееўрапейскага ўплыву з'явіліся абарончыя вежы ў Брэсці, Гародні, Тураве і інш. Але да нашых дзён захавалася толькі Камянецкая. Пры яе будаўніцтве майстры ўпершыню выкарысталі элементы цаглянай готыкі.

Дакажыце, што Камянецкая вежа — помнік раманскага стылю з элементамі готыкі.

**Творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва**

**5. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Чалавек заўсёды меў патрэбу акружаць сябе прыгажосцю. Для аздаблення адзення, дома, прадметаў побыту, інтэр'еру шырока выкарыстоўвалі арнамент. Упрыгажэнні і прадметы рэлігійнага прызначэння былі папулярныя і сярод гараджан, і сярод вясковых жыхароў.

Разам з разьбой па дрэве і косці, вышыўкай і ткацтвам развівалася ювелірнае мастацтва. Археолагі знайшлі мноства сведчанняў існавання ювелірных майстэрняў у Полацку, Віцебску, Тураве, Ваўкавыску. Майстры Сярэднявечча валодалі рознымі тэхнікамі, дзякуючы якім стваралі рэчы неверагоднага хараства.




Чаму на першай беларускай паштовай марцы, выпушчанай у 1992 г., быў адлюстраваны менавіта крыж Ефрасінні?

Пры манастыры, заснаваным Ефрасінняй Полацкай, была майстэрня, дзе рабілі аклады для ікон і іншыя прадметы царкоўнага ўжытку. Полацкая княгіня-ігумення была заказчыкам унікальных фрэсак для Спаса-Праабражэнскай царквы, якія захаваліся практычна цалкам. Таксама па яе замове полацкі майстар *Лазар Богша* ў **1161 г.** вырабіў славуты крыж, які зрабіўся нацыянальнай святыняй Беларусі. На жаль, крыж Ефрасінні Полацкай знік падчас Вялікай Айчыннай вайны. У 1997 г. ён быў узноўлены і цяпер захоўваецца ў саборы Полацкага жаночага Спаса-Ефрасінneўскага манастыра.



*Шахматныя фігуркі, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі. XII ст.*

*Багатая, яскравая і шматгранная культура тэрыторыі Беларусі ў IX–XIII стст. стаяла ў адным шэрагу з самабытнымі культурамі свайго часу. Пры гэтым яна мела свае ўнікальныя рысы: дзве архітэктурныя школы, яскравыя помнікі розных відаў мастацтва.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
| --- | --- |
| X–XII стст. — пашырэнне фрэскавага жывапісу і кніжнай мініяцюры | XII ст. — фрэскавыя роспісы ў Спаса-Праабражэнскай царкве г. Полацка, кніжная мініяцюра ў Тураўскім, Полацкім евангеллях |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Дакажыце на канкрэтных прыкладах, што на тэрыторыі Беларусі ўжо з XI ст. было распаўсюджана пісьменства.
2. Дакажыце, што рукапісныя кнігі з'яўляюцца выбітнай матэрыяльнай і духоўнай каштоўнасцю.
3. Вызначыце адметныя рысы архітэктуры IX–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі.
4. Апішыце крыж Ефрасінні Полацкай як рэлігійную рэліквію і гісторыка-культурную каштоўнасць.
5. Намалюйце постар або стварыце інфаграфіку на тэму «Развіццё культуры на тэрыторыі Беларусі ў IX–XIII стст.».

# Практыкум па раздзеле «Свет у эпоху Ранняга і Высокага сярэднявечча. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі»

## Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

**1.** Знайдзіце на гістарычнай карце месцазнаходжанне горада Полацка.

Ахарактарызуйце.

А. Геаграфічнае становішча.

Б. Уплыў эканамічных фактараў на яго ўзнікненне і развіццё ў IX–X стст.

В. Практычнае значэнне ў X–XI стст.




*Шлях «з варагаў у грэкі»*

Растлумачце, чаму менавіта гэты горад быў не толькі найстаражытнейшым на тэрыторыі Беларусі, але і адным з найбольш высокаразвітых сярод іншых усходнеславянскіх гарадоў у перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча.

Зрабіце вывад наконт таго, былі ўзнікненне Полацка і яго росквіт выпадковымі або заканамернымі.

## Адрозненне факта ад меркавання

**2.** Лес заўсёды займаў велізарнае месца ў жыцці чалавека, і эпоха Сярэднявечча — не выключэнне. Першыя пастановы, накіраваныя на абарону лясоў, з'явіліся ў Еўропе ўжо ў другой палове XIII ст.





*Сярэдневяковыя мініяцюры*

Пазнаёмцеся з вытрымкамі з кнігі Х. Кюстэра «Гісторыя лесу. Погляд з Германіі» і адкажыце на пытанні.

*«Валы і муры вакол горада паглыналі гіганцкія аб'ёмы драўніны, прычым не толькі бачныя воку гарадскія вароты і частаколы, але і схаваныя ад людскога зроку падмуркі. Дамы таксама будавалі з дрэва, часта ўсутыч адзін да аднаго... Вуліцы таксама трэба было ўмацоўваць, на іх клалі насцілы з дошак рознай таўшчыні... З дрэва будавалі масты цераз рэкі... Самі лодкі*

*і караблі, як і вазы для транспарціроўкі тавараў сушаю, таксама былі драўляныя.*

*Патрэбнае было дрэва і шматлікім рамеснікам. Тыя, хто выкарыстоўваў яго „толькі“ ў якасці матэрыялу, напрыклад карэтнікі (калёсных спраў майстры), сталяры, бачары (бондары), пляцельшчыкі кошыкаў, вязальшчыкі мётлаў, токары (разьбяры па дрэве), і тыя, хто меў патрэбу ў драўляных інструментах, напрыклад шаўцы са сваімі калодкамі (з грабу), краўцы (са сваімі аршынамі), ткачы з іх ткацкімі станкамі, былі ўсяго толькі дробнымі спажыўцамі, іх работа не адбівалася на плошчы лясоў.*

*Нашмат больш лесу выкарыстоўвалі мяснікі, рыбакі, пекары, півавары, ганчары і кавалі. І гэта нават без уліку апрацоўчых дошак, качалак і рукаятак нажоў...*

*Гэтым не сканчаецца спіс таго, у ахвяру чаму прыносіліся лясы».*

А. Калі і чаму ў Еўропе пачалі задумвацца пра прыродаахоўныя мерапрыемствы ў дачыненні да лясоў?

Б. У чым аўтар бачыць асноўную прычыну скарачэння лясоў?

В. Чаму, на думку аўтара, значна больш лесу выкарыстоўвалі мяснікі, рыбакі, пекары, півавары, ганчары і кавалі?

Г. Працягніце спіс таго, у ахвяру чаму прыносіліся лясы.

Д. Як вы лічыце, ці былі актуальныя падобныя праблемы скарачэння лясных масіваў для беларускіх зямель у XIII ст.? Сваё меркаванне аргументуйце.

Е. На аснове аналізу гаспадарчай дзейнасці жыхароў Беларусі ў X–XIII стст. прывядзіце канкрэтныя прыклады, якія раскрываюць змест прыказкі: *«Лес поіць, корміць, апранае, укрывае, саграваe»*.

Ж. Лясы з’яўляюцца адным з найважнейшых прыродных рэсурсаў нашай краіны і займаюць 40 % яе тэрыторыі. Сёння Беларусь уваходзіць у першую дзясятку лясных дзяржаў Еўропы. Назавіце найбольш значныя рэспубліканскія акцыі, у рамках якіх кожны можа зрабіць свой унёсак у справу захавання і прымнажэння лясных багаццяў краіны.

## Ажыццяўленне пошуку інфармацыі

**3.** Эпоха Сярэднявечча — час пастаянных бітваў у шматлікіх дробных і буйны́х войнах. Некаторыя бітвы засталіся незаўважаныя, інфармацыя пра іншыя захавалася на старонках летапісаў і хронік. Асобныя з іх апетыя ў творах літаратуры, адлюстраваныя на палотнах мастакоў, «ажываюць» у кадрах мастацкіх фільмаў.

А. Суаднясіце аўтара і твор мастацтва:

1) В. Сяроў «Лядовае пабоішча» (1942 г.);

2) К. Штэйбен «Бітва пры Пуацье 732 года» (паміж 1834 і 1837 г.);

3) М. Філіповіч «Бітва на Нямізе» (пачатак 1920-х гг.);

4) П. Рыжэнка «Калка» (1996 г.);

5) фрагмент бітвы пры Гастынгсе *(Нармандцы атакуюць пешых англасаксаў)*. Габелен з Баё (XI ст.).

А



Б



В





Г



Д

Б. Запоўніце табліцу, размясціўшы прапанаваныя бітвы ў храналагічнай паслядоўнасці.

**Бітвы Ранняга і Высокага сярэднявечча**

| Бітва | Дата | Бакі, якія супрацьстаяць | Вынік і гістарычнае значэнне |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

В. У якіх з прадстаўленых бітваў бралі ўдзел ваяры з тэрыторыі Беларусі?

Г. Часта перамога ў бітве — гэта заслуга палкаводца. Знайдзіце 2–3 цікавыя факты пра аднаго з военачальнікаў эпохі Ранняга і Высокага сярэднявечча (на выбар).

## Аддзяленне галоўнага ад другаснага

**4.** Прачытайце апісанне прычын прыняцця аднабожжа на землях Старажытнай Русі і выканайце прапанаваныя пасля тэксту заданні.

*Вядома, што кіеўскі князь Уладзімір увайшоў у гісторыю не толькі як князь Краснае Сонейка, але таксама і як Святы. З чым гэта было звязана? Ад пачатку князь быў язычнікам. Яго намаганні з дапамогай пантэону розных язычніцкіх багоў стварыць рэлігію, «якая магла б мацней аб'яднаць усю яго дзяржаву», не скончылася поспехам. Аджылае мнагабожжа мела слабую аб'яднаўчую сілу. Верагодна, тады Уладзімір і звярнуў свой погляд на монатэістычныя рэлігіі.*

*Выбар Уладзімірам рэлігіі часта звязваюць з легендарнай гісторыяй, якая носіць назву «выпрабавання вер». Калі кіеўскі князь Уладзімір прыняў рашэнне звярнуць свой народ да адзінага бога, пачулі пра яго намер прапаведнікі розных вер. З «Аповесці мінулых гадоў» вядома, што да яго прыязджалі прадстаўнікі розных рэлігій, у задачы якіх уваходзіла пераканаць кіеўскага князя прыняць веру менавіта ў іх адзінага Бога. Багасловы стараліся штосілы, хвалілі сваіх багоў: дужа карцела ім абярнуць магутнага князя ў сваю веру*

*і атрымаць такім чынам моцнага саюзніка. Уладзімір выслухоўваў усіх.*

*Кіеўскага князя наведалі місіянеры з Візантыі, ісламскія і іўдзейскія багасловы, але ўсе, акрамя першых, атрымалі адмову па розных прычынах. Адны з першых прыбылі ў Кіеў паслы ў белых чалмах. Гэта былі прадстаўнікі мусульманскай веры. Прычынай адмовы Уладзіміра ад ідэі прыняцця ісламу быў той факт, што іслам прадугледжваў вельмі глыбокую перабудову жыцця і побыту Русі на зусім чужы і незразумелы большасці насельніцтва ўзор.*

*Пасланнікі папы рымскага таксама не зрабілі на Уладзіміра належнага ўражання: «Ідзіце, адкуль прыйшлі, бо яшчэ бацькі нашы не прынялі вашай веры». У гэтым выпадку гаворка ішла пра першыя спробы хрышчэння Русі, здзейсненыя княгіняй Вольгай. Пра тое, ці сапраўды здарыўся ў Вольгі канфлікт з запрошаным ёю ж на Русь каталіцкім біскупам Адальбертам, нічога не вядома. Зразумела толькі, што Адальберт самавольна з'ехаў з Русі, заявіўшы, быццам бы яго не прынялі належным чынам або нават выгналі (хутчэй за ўсё, мясцовыя язычнікі на чале з князем Святаславам, а не Вольга).*

*З Візантыі ў Кіеў прыбыў вучоны-філосаф Кір, і яго прыняў князь. Іх гутарка зацягнулася. Як паведамляе крыніца, «грэк гаварыў проста і зразумела, аблічча яго свяцілася спакоем і радасцю». Летапісец звяртае ўвагу, што менавіта з Канстанцінопаля пасланнікі вярнуліся са словамі: «Не ведалі, дзе мы ёсць — на небе або на зямлі», што зрабіла самае моцнае ўражанне на Уладзіміра. Гэта і прадвызначыла выбар веры паводле грэчаскага абраду.*

*Многія гісторыкі, хоць і ставяцца да аповеду пра «выпрабаванне вер» скептычна, надаючы яму кніжны, павучальны характар, усё ж прызнаюць, што ў аснове маглі ляжаць рэальныя падзеі.*

А. Чаму Уладзімір прыняў рашэнне звярнуць свой народ у веру ў адзінага Бога?

Б. Прадстаўнікі якіх рэлігій прыходзілі да Уладзіміра, і якія былі прычыны, што Уладзімір ім адмовіў?

В. Як вы лічыце, ці апісаны ў тэксце сапраўдныя прычыны выбару Уладзіміра на карысць хрысціянства ўсходняга ўзору?

Г. Як вы лічыце, якая была галоўная, а якія другасныя прычыны выбару кіеўскага князя?

## Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

5. Успомніце імёны вядомых людзей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў IX — першай палове XIII ст., выканайце праектнае заданне на выбар.

А. Складзіце топ-5 «Асоба ў гісторыі». Свой выбар аргументуйце.

Б. Зрабіце постар *(ад англ. poster — афіша, аб'ява, плакат)*, прысвечаны пэўнай асобе і яе ролі ў гісторыі. Падрыхтуйце яго прэзентацыю.

В. Стварыце інтэрактыўны даведнік «Скульптурныя кампазіцыі і помнікі гістарычным асобам і дзеячам культуры».

# Абагульненне па раздзеле «Свет у эпоху Ранняга і Высокага сярэднявечча. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі»

## Працуем з паняццямі

**1.** Размяркуйце прадстаўленыя паняцці па групах: палітычнае развіццё, сацыяльна-эканамічнае развіццё, культурнае развіццё.

*Натуральная гаспадарка, саслоўе, князь, фрэска, феадальная раздробленасць, халіфат, феадалізм, хрысціянства, верв, пасаднік, язычніцтва, ардынскае ярмо, летапіс, славянізацыя балтаў, берасцяная грамата.*

Ахарактарызуйце развіццё беларускіх зямель у IX — першай палове XIII ст., выкарыстоўваючы паняцці адной з груп (на выбар).

**2.** Устанавіце пары паміж паняццямі, змешчанымі ў розных слупках, каб паміж імі існавала лагічная сувязь. Растлумачце свой выбар.

| | |
|---|---|
| *феадал, горад, даніна, лес, манголы, епархія, язычніцтва, індаеўрапейцы, Евангелле, Вялікая славянская міграцыя* | *епіскап, славяне, дзяцінец, ідал, хрысціянства, падсечна-агнявое земляробства, ярмо, славянізацыя балтаў, князь, залежны селянін* |

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**3.** Разгледзьце ілюстрацыі, прачытайце кароткія звесткі пра архітэктурныя аб'екты, пабудаваныя ў Раннім і Высокім сярэднявеччы. Складзіце параўнаўчую табліцу, дайце ёй назву. Крытэрыі для параўнання распрацуйце самастойна. У вывадзе да табліцы растлумачце значнасць прадстаўленых храмаў з пазіцыі нашага часу.

1



2



3



*Макеты архітэктурных помнікаў*

**Кароткія звесткі пра архітэктурныя аб'екты**

А. Сімвал «залатога веку» Візантыі, будаваўся на працягу пяці гадоў падчас праўлення Юстыніяна. Больш за тысячу гадоў лічыўся найвялікшым храмам у хрысціянскім свеце — аж да будаўніцтва сабора Святога Пятра ў Рыме. Пасля падзення Канстанцінопаля ў 1453 г. пераўтвораны ў мячэць. У 1985 г. унесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Б. Самы першы каменны храм на тэрыторыі Беларусі, узведзены ў сярэдзіне XI ст. па распараджэнні князя Усяслава Брачыславіча. Ён быў чацвёртым у свеце, выкананым у такой стылістыцы, але меў адметнасці — алтарнае ўзвышэнне і сем купалаў. У сярэдзіне XVIII ст. цалкам перабудаваны ў стылі віленскага барока. Да нашых дзён захаваліся фрагменты кладкі і фрэскавага роспісу канца XI ст., старажытны падмурак. Прадстаўлены ў папярэдні Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

В. Згодна з летапісам, пабудаваны князем Яраславам Мудрым на месцы перамогі над печанегамі ў XI ст. Мае 13 купалаў, якія сімвалізуюць Ісуса Хрыста і 12 апосталаў. Ансамбль мазаік і фрэсак XI ст., што захаваўся ў храме, — самы поўны ў свеце. Сучасны выгляд, у стылі барока, храм набыў на мяжы XVII–XVIII стст. У 1990 г. унесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

## Аналізуем, тлумачым, разважаем

**4.** У чым вы бачыце асноўныя прычыны пазнейшага пачатку развіцця феадальных адносін на тэрыторыі Беларусі ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы?

## Параўноўваем

**5.** Параўнайце гарады на тэрыторыі Заходняй Еўропы і Беларусі ў X–XIII стст. Вызначце падабенствы і адрозненні.

| Пытанні для параўнання | Гарады на тэрыторыі Заходняй Еўропы | Гарады на тэрыторыі Беларусі |
|---|---|---|
| Шляхі ўзнікнення | | |
| Склад насельніцтва | | |
| Асноўныя заняткі гараджан | | |
| Функцыі гарадоў | | |
| Карпаратыўныя аб'яднанні | | |
| Права на самакіраванне | | |
| **Падабенствы** | | |
| **Адрозненні** | | |

**6.** Запоўніце параўнаўчую табліцу «Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі».

| Пытанні для параўнання | Полацкае княства | Тураўскае княства |
|---|---|---|
| Племянное княжанне, на аснове якога склалася дзяржава | | |
| Геаграфічнае становішча | | |
| Час утварэння | | |
| Галоўны горад і дата яго першага згадвання | | |

| Пытанні для параўнання | Полацкае княства | Тураўскае княства |
|---|---|---|
| Першы вядомы князь і гады яго праўлення | | |
| Узаемаадносіны з Кіевам | | |
| Асаблівасці дзяржаўнага ладу | | |
| Самыя вядомыя князі (1–2) і вынікі іх дзейнасці | | |
| Барацьба супраць знешніх захопнікаў | | |
| Дата заснавання хрысціянскай епархіі | | |
| **Вывад** | | |

## Сістэматызуем веды

**7.** Працягніце лагічны рад. Вызначце, што аб'ядноўвае дадзеныя элементы.

1) Крывічы-палачане, дрыгавічы, …
2) Дзяцінец, торг, …
3) «Людзі», смерды, закупы, …
4) Родаплемянны, рабаўладальніцкі, …
5) Мнагабожжа, ідалапаклонства, капішча, …
6) Кавальскае, ювелірнае, ганчарнае, бондарнае, …
7) Рагвалод, Ізяслаў, Брачыслаў, …
8) Сафійскі сабор, Барысаглебская царква, …
9) Берасцяныя граматы, надпісы на Барысавых камянях, грэбень з алфавітам, …
10) Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, …

**8.** Уявіце, што вы — сярэдневяковы купец, які прыехаў у Полацк. Апішыце сваю дарогу (адкуль вы прыехалі, якім шляхам дабіраліся, на чым). Які тавар вы прывезлі ў Полацк? Што плануеце купіць? Якімі грашыма будзеце разлічвацца?

**9.** Канкрэтызуйце гістарычнымі фактамі прапанаваныя тэндэнцыі гістарычнага развіцця, характэрныя для дзяржаў у Раннім і Высокім сярэднявеччы. Дапоўніце пералік тэндэнцый. Запоўніце табліцу.

| Тэндэнцыі гістарычнага развіцця ў Раннім і Высокім сярэднявеччы | Заходняя Еўропа | Тэрыторыя Беларусі |
|---|---|---|
| Стварэнне дзяржаў на аснове племянных саюзаў | | |
| Складванне феадальных адносін | | |
| Феадальная раздробленасць | | |
| Развіццё абарончага дойлідства | | |
| Пашырэнне і ўмацаванне хрысціянскай царквы | | |
| + самастойна выдзеленая тэндэнцыя | | |
| **Вывад** | | |

**10.** Якімі падзеямі / з'явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу ў пачатку гэтага раздзела? Прапануйце форму для іх абазначэння (карта, карціна, фотаздымак, цытата, фрагмент крыніцы, дата і інш.).

## Наш край у Раннім і Высокім сярэднявеччы

**1.** Складзіце спіс крыніц, у якіх можна адшукаць інфармацыю пра гістарычнае развіццё вашай мясцовасці ў Раннім і Высокім сярэднявеччы.

**2.** Карыстаючыся картасхемамі вучэбнага дапаможніка, картамі атласа або насценнымі картамі, вызначце.

А. Плямёны, якія жылі на тэрыторыі вашай мясцовасці ў Раннім сярэднявеччы.

Б. Дзяржаўныя ўтварэнні, у склад якіх уваходзіла наша мясцовасць у Высокім сярэднявеччы.




*Старажытныя беларускія гарады*

**3.** Выпішыце гарады, якія існавалі ў вашай вобласці ў IX — сярэдзіне XIII ст., у парадку іх узнікнення. Выявіце паходжанне іх назваў. Што паспрыяла развіццю гэтых гарадоў?

**4.** Калі ўзнік ваш населены пункт? Ад чаго ўтварылася яго назва? Ці супадае дата першай згадкі пра яго ў пісьмовых крыніцах з археалагічнымі звесткамі?

**5.** Даведайцеся, з якімі знешнімі ворагамі маглі змагацца жыхары вашай мясцовасці ў X — першай палове XIII ст. Ці атрымлівалася ў іх ім супрацьстаяць?

**6.** Якія археалагічныя знаходкі з Ранняга і Высокага сярэднявечча захоўваюцца ў краязнаўчых музеях вашай мясцовасці? Пра што яны сведчаць?

**7.** Падрыхтуйце паведамленне пра прыняцце хрысціянства і развіццё культуры ў вашай мясцовасці ў X — першай палове XIII ст.

# ПАКАЗАЛЬНІК ТЭРМІНАЎ І ПАНЯЦЦЯЎ

## Раздзел I

Антычнасць ... 53
Гістарычная крыніца ... 10
Гістарычная памяць ... 8
Гістарычны факт ... 11
Дзяржава ... 51
Дэспатыя ... 55
Імперыя ... 55
Міфалогія ... 41
Монатэізм ... 64
Неалітычная рэвалюцыя ... 30
Радавая абшчына ... 25
Рэлігія ... 44
Суседская абшчына ... 39
Цывілізацыя ... 12
Язычніцтва ... 44

## Раздзел II

Вялікае перасяленне народаў ... 82
Дзяржаўная рэлігія ... 117
Натуральная гаспадарка ... 97
Прыгоннае права ... 96
Рэканкіста ... 87
Саслоўе ... 95
Славянізацыя балтаў ... 139
Сярэднія вякі ... 83
Традыцыйнае грамадства ... 109
Тэакратыя ... 107
Феадалізм ... 92
Феадальная раздробленасць ... 95
Халіфат ... 103

# ХРАНАЛАГІЧНАЯ ТАБЛІЦА
# па гісторыі Беларусі

## (з найстаражытнейшых часоў да ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага)

| Дата | Падзея |
|---|---|
| 100–35 тыс. гадоў таму | Пранікненне першых людзей (неандэртальцаў) на тэрыторыю Беларусі |
| 100–35 тыс. гадоў таму — канец 3-га тыс. да н. э. | Каменны век на тэрыторыі Беларусі |
| 40–35 тыс. гадоў таму | З'яўленне на тэрыторыі Беларусі чалавека сучаснага тыпу (краманьёнца) |
| 35 тыс. гадоў таму — 10-е тыс. да н. э. | Эпоха позняга палеаліту на тэрыторыі Беларусі |
| 24-е тыс. да н. э. | Найбольш старажытная стаянка першабытнага чалавека на тэрыторыі Беларусі каля в. Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці |
| 22–21 тыс. да н. э. | Старажытная стаянка першабытнага чалавека каля в. Бердыж Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці |
| Каля 12-га тыс. да н. э. | Адступленне апошняга ледавіка з тэрыторыі Беларусі |
| 9–5-е тыс. да н. э. | Эпоха мезаліту на тэрыторыі Беларусі |
| Канец 5-га — канец 3-га тыс. да н. э. | Эпоха неаліту на тэрыторыі Беларусі |
| 3-е тыс. да н. э. | Пераход ад палявання і збіральніцтва да жывёлагадоўлі і земляробства |
| Сярэдзіна 3-га тыс. да н. э. | Пачатак рассялення індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі |
| 2-е тыс. да н. э. — канец VIII ст. да н. э. | Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі |
| VII ст. да н. э. — канец V ст. н. э. | Жалезны век на тэрыторыі Беларусі |
| Канец IV ст. | Знаходжанне славянскіх плямёнаў у паўднёвай частцы Беларускага Палесся |
| VI–VIII стст. | Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі |
| VIII–IX стст. | Утварэнне племянных саюзаў славян на тэрыторыі Беларусі: крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў |
| 862 г. | Першая згадка пра Полацк у пісьмовых крыніцах |
| 960-я гг. — 980 г. | Княжанне Рагвалода ў Полацку |

| Дата | Падзея |
|---|---|
| 980 г. | Першая згадка пра Тураў у пісьмовых крыніцах |
| 980 г. | Паход ноўгарадскага князя Уладзіміра Святаславіча на Полацк |
| 988 г. | Хрышчэнне Старажытнай Русі. Пачатак княжання Святаполка ў Тураве, Ізяслава ў Полацку |
| 992 г. | Заснаванне хрысціянскай епархіі ў Полацку |
| 1003–1044 гг. | Княжанне Брачыслава Ізяславіча ў Полацку |
| 1005 г. | Заснаванне хрысціянскай епархіі ў Тураве |
| XI ст. | Стварэнне «Тураўскага евангелля» — першай рукапіснай царкоўнай кнігі на тэрыторыі Беларусі |
| 1021 г. | Паход полацкага князя Брачыслава Ізяславіча на Ноўгарад |
| 1044–1101 гг. | Княжанне Усяслава Брачыславіча ў Полацку |
| Сярэдзіна XI ст. | Будаўніцтва Сафійскага сабора ў Полацку |
| 3 сакавіка 1067 г. | Бітва на р. Няміга; першая згадка пра Менск (Мінск) у пісьмовых крыніцах |
| Пачатак XII ст. | Пачатак раздробленасці Полацкага княства |
| 1101–1119 гг. | Княжанне ў Менску (Мінску) Глеба Усяславіча |
| 1127 г., 1129 г. | Паходы кіеўскага князя Мсціслава (сына Уладзіміра Манамаха) на Полацкую зямлю |
| XII ст. | Рэлігійна-асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай |
| XII ст. | Рэлігійна-асветніцкая дзейнасць Кірылы Тураўскага |
| Сярэдзіна XII ст. | Будаўніцтва Спаса-Праабражэнскай царквы ў г. Полацк |
| XII ст. | Будаўніцтва Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гародні (Гродна) |
| 1157–1167 гг. | Княжанне ў Тураве Юрыя Яраславіча |
| Другая палова XII ст. | Пачатак раздробленасці Тураўскага княства |
| 1161 г. | Выраб майстрам-ювелірам Лазарам Богшам па замове Ефрасінні Полацкай шасціканцовага напрастольнага крыжа |
| 1203 г. | Пачатак супрацьстаяння Полацкага княства і крыжакоў |
| 1208 г. | Барацьба князя Вячкі (Вячаслава) з крыжакамі, абарона пад яго кіраўніцтвам горада-крэпасці Кукенойс |
| 1240 г. | Удзел ваяра Якава Палачаніна ў складзе дружыны ноўгарадскага князя Аляксандра Яраславіча ў разгроме шведскіх рыцараў на р. Нява |
| 1237–1241 гг. | Мангольскае нашэсце на землі Старажытнай Русі |
| XIII ст. | Стварэнне Аршанскага евангелля |
| XIII ст. | Узвядзенне Камянецкай вежы |

# ПАМЯТКІ

## ЯК ДАВАЦЬ ВЫЗНАЧЭННЕ ПАНЯЦЦЮ

Вызначыць паняцце — значыць адказаць на пытанне «Што гэта такое?».

1. Падбярыце агульнае (радавое) паняцце.
2. Знайдзіце адметную (відавую) прыкмету.
3. Складзіце фармулёўку вызначэння.

Напрыклад, *абсалютная манархія — гэта форма праўлення (радавое паняцце), пры якой улада належыць аднаму чалавеку (відавая прыкмета 1) і перадаецца ў спадчыну (відавая прыкмета 2)*.

## ЯК ХАРАКТАРЫЗАВАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ АСОБУ

1. Вызначце храналагічны перыяд і галіну грамадскага жыцця, да якіх адносіцца дзейнасць гістарычнай асобы.
2. Апішыце гістарычныя ўмовы, у якіх дзейнічала гістарычная асоба.
3. Ахарактарызуйце вынікі дзейнасці гістарычнай асобы, спосабы і сродкі дасягнення гэтых вынікаў.
4. Ацаніце, які ўнёсак гістарычнай асобы ў гісторыю, у развіццё грамадства; якія наступствы яе дзейнасці для перыяду, які вывучаецца, і сучаснасці.

## ЯК ДАВАЦЬ АЦЭНКУ ГІСТАРЫЧНАМУ ФАКТУ

1. Дайце кароткую характарыстыку гістарычнаму факту, які вы ацэньваеце (што, калі і дзе адбылося).
2. Устанавіце прычыны факта і зацікаўленасць у ім тых ці іншых сацыяльных груп.
3. Ахарактарызуйце вынікі, наступствы і значэнне гістарычнага факта для яго ўдзельнікаў і для далейшага гістарычнага развіцця.
4. Вызначце гістарычны характар факта (прагрэсіўны, рэгрэсіўны).
5. Сфармулюйце ўласнае меркаванне пра гістарычны факт. Аргументуйце яго.

## ЯК ВЫЯЎЛЯЦЬ ПРЫЧЫННА-ВЫНІКОВЫЯ СУВЯЗІ ПАМІЖ ГІСТАРЫЧНЫМІ ФАКТАМІ

1. Дайце кароткую характарыстыку гістарычным фактам, паміж якімі выяўляеце прычынна-выніковыя сувязі (што, калі і дзе адбылося).

2. Вызначце, якія з разгляданых фактаў з'яўляецца прычынай, а якія — вынікам.

3. Высветліце храналагічныя, лагічныя сувязі паміж гістарычнымі фактамі.

4. Пабудуйце «ланцужок» разважанняў, якія тлумачаць сувязь паміж гістарычнымі фактамі.

## ЯК ПАРАЎНОЎВАЦЬ ГІСТАРЫЧНЫЯ ФАКТЫ

1. Вызначце пытанні (крытэрыі), паводле якіх будзеце параўноўваць гістарычныя факты (план параўнання).

2. Дайце характарыстыку фактам, якія параўноўваеце, па кожным пытанні.

3. Вылучыце агульныя характарыстыкі фактаў, якія параўноўваеце, і адрозненні. Зафіксуйце іх у выглядзе вывадаў.

4. Параўнанне гістарычных фактаў лепш праводзіць у форме табліцы:

| Пытанні (крытэрыі) для параўнання | Факты, якія параўноўваюцца (падзеі, з'явы, працэсы) | |
|---|---|---|
| | 1-ы факт | 2-і факт |
| | | |
| | | |

## ЯК АРГУМЕНТАВАЦЬ САВАЁ МЕРКАВАННЕ ПА НЕЙКІМ ПЫТАННІ

1. Вызначце, які вывад вы будзеце аргументаваць. Сфармулюйце яго.

2. Назавіце факты, якія пацвярджаюць слушнасць вывада.

3. Аргументуйце, г. зн. растлумачце прычынна-выніковыя сувязі паміж прыведзенымі фактамі і меркаваннем.

## ЯК УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ДЫСКУСІІ (АБМЕРКАВАННІ)

1. Перад тым як выступіць, вызначце сваю пазіцыю. Пераканайцеся ў тым, што вы дакладна разумееце сутнасць праблемы.

2. Уважліва слухайце апанента і толькі потым прадстаўляйце свой пункт погляду.

3. Крытыкуйце не саміх апанентаў, а іх ідэі. Сачыце за тым, каб не скажаць іх думкі і словы.

4. Найлепшы спосаб доказу або абвяржэння — факты. Найлепшы спосаб пераканаць праціўніка — дакладная аргументацыя і логіка. Кажыце коратка, выразна, сваімі словамі і па сутнасці.

5. У працэсе дыскусіі ўдзельнікі могуць змяняць сваю пазіцыю пад уздзеяннем прыведзеных фактаў і аргументаў.

6. Галоўнае ў дыскусіі — не перамога ў спрэчцы, а новыя веды.

(Назва ўстановы адукацыі)

| Вучэбны год | Імя і прозвішча навучэнца | Клас | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |


Вучэбнае выданне

**Каханоўскі** Аляксандр Генадзевіч
**Кошалеў** Уладзімір Сяргеевіч
**Цемушаў** Сцяпан Мікалаевіч і інш.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
## ў кантэксце сусветнай гісторыі

Вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

У дзвюх частках
Частка 1

Адказны за выпуск *Т. Ф. Рослік*
Рэдактар *Н. Б. Кучмель*
Дызайн вокладкі *Н. Ф. Овад*
Картасхемы *С. М. Цемушава*
Падрыхтоўка ілюстрацый і схем *В. М. Крупскай*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *І. П. Грышынай*
Карэктар *А. М. Краўчанка*

Падпісана ў друк 20.09.2024. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 16,38+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 12,63+0,37+8,0 (электрон. дадат.).
Тыраж 7 680 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014. Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.